**ДУ «МІНСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ А. С. ПУШКІНА»**
**АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА**

# *БІБЛІЯТЭКІ МІНШЧЫНЫ Ў 2018 ГОДЗЕ: АГЛЯД ДЗЕЙНАСЦІ*

**МІНСК**
**2019**

# Змест:

**Лазарава І. П.** Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва………………………….. 3

**Філіпчык А. К., Вярхоўская К. Д., Барахоўская М.В.** Змест і арганізацыя работы з чытачамі … 5

**Рудзянок І. С.** Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей …… 111

**Гіль В. М.** Камплектаванне і арганізацыя адзінага фонду ……………………………………….. 131

**Крахмалюк К. І.** Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне ……………………………………… 133

**Мельнічак А. А.** Метадычная дзейнасць …………… 141

# Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва

На 31.12.2018 г. сетку публічных бібліятэк Мінскай вобласці складаюць **448 бібліятэк:** абласная бібліятэка, 22 цэнтральныя раённыя і 1 гарадская, 424 бібліятэк-філіялаў, з іх – 42 гарадскі, 21 гарпасялковы, 361 сельскі.

На працягу 2018 г. сетка **скарацілася на 2 адзінкі.** Сваю дзейнасць спынілі сельская бібліятэка в. Забалацце Барысаўскага раёна і Асіпавіцкая сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна.

Інтэграцыя публічных бібліятэк ажыццяўляецца з улікам сацыякультурнай і дэмаграфічнай сітуацыі ў рэгіёне. На 01.01.2019 года на тэрыторыі Мінскай вобласці дзейнічаюць **157 інтэграваных бібліятэк,** 149 з якіх знаходзяцца ў ведамаснай падпарадкаванасці Міністэрства культуры, 8 – Міністэрства адукацыі. У Вілейскім раёне была зачынена інтэграваная бібліятэка, у Слуцкім і Салігорскім раёнах па адной бібліятэцы страцілі статус інтэграваных.

На 01.01.2019 г. у Мінскай вобласці налічваецца **40 бібліятэк-клубаў.** У 2018 годзе 2 бібліятэкі Барысаўскага раёна былі рэарганізаваны ў бібліятэкі-клубы.

З мэтай поўнага ахопу бібліятэчным абслугоўваннем насельніцтва маланаселеных і аддаленых вёсак пры публічных бібліятэках дзейнічаюць **352 бібліятэчныя пункты,** а таксама **20 біблібусаў,** якія абслугоўваюць 420 аддаленых населеных пунктаў.

У 2018 г. карыстальнікамі бібліятэк вобласці з'яўляліся **441,7 тыс. чытачоў** (з улікам чытачоў абласной бібліятэкі). У бібліятэках вобласці ў цэлым назіраецца тэндэнцыя да павелічэння колькасці чытачоў: у параўнанні з 2017 г. іх колькасць павялічылась на 4,7 тыс. чал. Працэнт ахопу насельніцтва бібліятэчным абслугоўваннем складае 29,1%. **Колькасць наведванняў склала па вобласці 4 182,3 тыс.,** што на 194,7 тыс. больш, чым ў папярэднім годзе і на 16,3% болей у параўнанні з 2015 годам.

Чытальнасць па вобласці склала 18,0; абарачальнасць фонду – 1,2. Кнігавыдача па вобласці склала 7 947,0 тыс. экз. дакументаў (з улікам абласной бібліятэкі), што на 116,6 тыс. экз. менш, чым у 2017 г.

У Мінскай вобласці **камп'ютарызавана 436 бібліятэк – 97,3%** ад агульнай колькасці. Зараз сукупная колькасць камп'ютараў складае 1 094 (з улікам абласной бібліятэкі), з якіх у Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна – 107, у цэнтральных бібліятэках – 501, гарадскіх філіялах – 78, гарпасялковых – 30, сельскіх – 378, у бібліятэках аграгарадкоў – 295. У мінулым годзе ўсе цэнтральныя бібліятэкі цалкам або ў тэставым рэжыме перайшлі на праграмнае забеспячэнне ALISWeb.

Усяго па вобласці **выхад у глабальную сетку і электронную пошту маюць 392 бібліятэкі:** абласная бібліятэка, цэнтральныя бібліятэкі – 23, гарадскія – 41, гарпасялковыя – 21 (у тым ліку ў аграгарадках – 6), сельскія – 306 (у тым ліку ў аграгарадках – 245).

**Уласныя сайты маюць 34 бібліятэкі** Мінскай вобласці: абласная бібліятэка, цэнтральныя – 22, дзіцячыя – 3, гарпасялковыя – 1, сельскія – 7.

У мінулым годзе публічныя бібліятэкі вобласці працягвалі дзейнасць па аказанні дадатковых платных паслуг насельніцтву. У сярэднім па вобласці аказваецца каля 30 відаў паслуг. Самымі запатрабаванымі платнымі паслугамі застаюцца выдача дакументаў з камерцыйнага фонду і чытальнай залы, ксеракапіраванне, раздрукоўка і сканіраванне.

# Змест і арганізацыя работы з чытачамі

## *Сямейнае выхаванне*

У 2018 годзе праца з сем'ямі заставалася адным з прыярытэтных кірункаў бібліятэк Мінскай вобласці. ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» сумесна з раённай арганізацыяй грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз жанчын» распрацавала і прадставіла чытачу дэбютны праект года «Сям’я без бацькі, як хата без страхі». На першым этапе праекта падлеткам бярэзінскіх школ прапанавалі прыняць удзел у гадзіне шчырасці «Жыцця пуцяводная зорка – Бацька». Выкарыстаныя ў час шчырай і задушэўнай размовы прыклады з літаратурных твораў Ніны Рыбік «Пячэнік», Андрэя Сідарэнкі «Слова пра чараўніка», Анатоля Бутэвіча «Татка, прыязджай» дапамаглі паказаць вобраз сапраўднага бацькі – мудрага дарадцы, сябра, суддзі і настаўніка, адказнага за лёс сваіх дзяцей, вартага пераймання ва ўчынках і ўзаемаадносінах з людзьмі, джэнтльмена ў адносінах да жанчыны, узор мужнасці, міласэрнасці, высакароднасці, вернасці слову, падаць яркія замалёўкі пра бацькоўскі аўтарытэт. Заключным этапам праекта стаў цыкл мерапрыемстваў для бацькоў з бенефісам апавядання К. Захарэвіч «Свята татавых чаравікаў». У аграгарадку Брадзец да Сусветнага дня бацькі на базе бібліятэкі-клуба прайшла конкурсная праграма «Мой тата – мой кумір!».

Праект «Бібліятэка для сям’і: выхавацель на гадзіну», распрацаваны на перыяд з 2016 па 2020 гады аддзелам па рабоце з дзецьмі Вілейскай раённай цэнтральнай бібліятэкі, прадугледжвае аказанне паслугі па нагляду за дзецьмі на час адсутнасці іх бацькоў праз арганізацыю пакоя для правядзення дзецьмі (ва ўзросце ад 6 да 10 гадоў) вольнага часу.

Бібліятэкары наладжваюць адпачынак дзяцей. На працягу года ў межах праекта прайшлі: літаратурны

конкурс «Хто хоча стаць казачнікам?», займальныя гульні «Што бывае ў бібліятэцы?» і «Што любіць камп'ютар?», конкурс «Папялушка», конкурс знаўцаў «Хто больш ведае?».

ДУК «Крупская раённая бібліятэка імя Я. Купалы» ў справаздачным годзе працягвала працу па рэалізацыі раённай праграмы сямейнага чытання «Войдём в этот мир вместе». У рамках фестывалю «Кладзезь» і праекта «Общее дело» раённай бібліятэкай было праведзена пасяджэнне «Клуба маладой сям'і» з удзелам манашкі Марыі Літвінавай. А сельскія бібліятэкі правялі наступны цыкл мерапрыемстваў: дыскусію «Сям'я вачыма дзяцей» (Халопеніцкая гарпасялковая бібліятэка), конкурс радаводаў «Геніалагічнае дрэва» і гадзіну адкрытых думак «Усё пачынаецца з сям'і» (Бобрская гарпасялковая бібліятэка), дыялог «Маладая сям'я, якой ёй быць» (Коласаўская сельская бібліятэка), вячоркі «Ля сямейнага самавара» і сямейны вечар «Мір дому твайму» (Абчугская сельская бібліятэка-клуб), круглы стол «Семейное чтение – время доброго общения» (Ухвальская сельская бібліятэка).

У рамках праграмы «Дзеці. Сям'я. Кніга» сельскімі бібліятэкамі Старадарожскага раёна ў 2018 годзе былі праведзены наступныя мерапрыемствы: літаратурна-музычная кампазіцыя «Мы семья, мы вместе» (Горкаўская сельская біблітэка), гадзіна зносін «Всё начинается с семьи» (Навадарожская сельская бібліятэка-музей), вечар-сустрэч «Чытаем з бацькамі» (Падарэская сельская біблітэка), вечар сямейных сустрэч «Мы счастливы, мы вместе» (Палажэвіцкая сельская бібліятэка), дзень сямейнага адпачынку «Всё начинается с семьи» (Сінягоўская сельская біблітэка) і конкурс паштовак «Самой счастливой семье» (Церабуцкая сельская бібліятэка).

ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.К. Каладзеева» сумесна з супрацоўнікамі рэабілітацыйнага цэнтра «Анастасис» пры Свята-успенскім Жыровіцкім манастыры правяла семінар «Алкоголизм и наркомания. Работаем с проблемой». На семінары, у якім прынялі ўдзел

кіраўнік рэабілітацыйнага цэнтра «Анастасис» Турбол С.Н., іераманах Свята-успенскага Жыровіцкага манастыра Агапій (Голуб) і псіхіятр-нарколаг рэабілітацыйнага цэнтра «Анастасис» Небажэнка Г.Г., абмеркавалі праблемы алкагольнай залежнасці бацькоў. Адбылася гарадская міжведамасная канферэнцыя «Семья – опора государства», для якой супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі тэматычную выставу з дзіцячымі малюнкамі.

Да 80-годдзя Мінскай вобласці 15 студзеня стартавала акцыя «У матулі – дачка і сын, у вобласці – новы грамадзянін». Яна была наладжана на базе акушэрскага аддзялення Бярэзінскай раённай бальніцы работнікамі ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» сумесна з раённай арганізацыяй грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз жанчын». У гонар юбілею вобласці аб’ектам ушанавання сталі жанчыны-маці і тыя, якія рыхтуюцца стаць матулямі. Шчаслівым матулям нованароджаных былі ўручаны камплекты з адзеннем і прадметамі гігіены для немаўлят. Тэатр аднаго акцёра Бярэзінскай раённай бібліятэкі правёў для пацыентак і персаналу аддзялення сеанс смехатэрапіі з жартоўнымі мініяцюрамі, а самая вясёлая парадзіха атрымала спецыяльны прыз.

У Баярскай сельскай бібліятэцы-доме вольнага часу пры падтрымцы ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка» правялі акцыю «Чытаем усёй сям’ёй па-беларуску». Карыстальнікам прапанавалі літаратуру на роднай мове. Некаторыя выбралі кнігі сучасных беларускіх аўтараў. А большасць пажадала перачытаць творы класікаў роднай літаратуры.

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі г. Нясвіж да Дня маці запусціла акцыю «Павіншуем маму разам!», аддзел па рабоце з дзецьмі ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы» далучыўся да гэтай акцыі. З 8 па 14 кастрычніка ў бібліятэцы праходзіла акцыя «Мама, я цябе люблю!». Кожны наведвальнік бібліятэкі мог сфатаграфавацца ў святочнай фотазоне і адправіць

фатаграфію самаму дарагому чалавеку, пазнаёміцца з кніжна-ілюстрацыйнай выставай «Святло матчынай душы» і пачытаць кнігу, якая спадабалася, намаляваць партрэт сваёй мамы і размясціць яго на выставе, прыняць удзел у акцыі «Мая мама самая ...». Можна было бясплатна запоўніць віншавальную паштоўку і падарыць яе сваёй маме.

У бібліятэках Мінскай вобласці праводзіліся цікавыя конкурсныя праграммы. Фотаконкурс «Читаем всей семьёй!» адбыўся ў рамках тыдня сямейнага чытання ў ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна». ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» правяла ў маі традыцыйны раённы конкурс «Лепшая чытаючая сям'я – 2018», у якім прынялі ўдзел чытачы Ждановіцкай сельскай бібліятэкі, Сеніцкай сельскай бібліятэкі і Гатаўскай сельскай бібліятэкі-клуба. Сем'і прымалі актыўны ўдзел у конкурсах «Візітная картка», «Назаві аўтара радкоў», «Збяры казку» і «Хатняе заданне». Пераможцаў чакалі дыпломы з каштоўнымі прызамі ад Мінскай раённай арганізацыі РГА «Белая Русь» і прафсаюзнай арганізацыі бібліятэчных работнікаў.

Міжнародны дзень сям'і адзначаецца 15 мая. Да гэтага свята бібліятэкамі Мінскай вобласці рыхтуюцца разнастайныя мерапрыемствы: вечарына добрага настрою «Сям'ёй даражыць – шчаслівым быць» (Любушанская сельская бібліятэка Бярэзінскага раёна); рэтра-выстава «Любімыя цацкі нашых бацькоў» і гадзіна цікавых паведамленняў «Нябесныя ахоўнікі сям'і» (Паплаўская сельская інтэграваная бібліятэка Бярэзінскага раёна); забаўляльная праграма «Нам разам весела» (Шылавіцкая сельская бібліятэка Вілейскага раёна), фальклорныя пасядзелкі «Каб вашаму роду не было пераводу» (Чурлёнская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна); пазнавальная гадзіна для бацькоў «Дарослы. Дзіця. Кніга» (ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка»); выстава-захапленне «Сям'я. Таленавітыя разам» (ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка

імя А. Астрэйкі»). У ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка» для членаў аматарскага аб’яднання «Добрыя сустрэчы» прайшло гульнёвае асарці «Пад сямейным парасонам». Да ўдзелу былі запрошаны наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання ТЦСАН. Удзельнікам мерапрыемства прапанавалі конкурсы прыказак і загадак, віктарыны і займальныя гульні «Шустрый Поварёнок», «Кніжныя сваякі», «Дом сваёй мары», «Самая музычная каманда» і іншыя. Сумаваць на гэтым свяце не прыйшлося нікому. Канкурсанты паказалі свае таленты і ўменні, прыклаўшы яшчэ і долю гумару пры падрыхтоўцы заданняў.

Мядзельскі раён на базе сельскіх бібліятэк падрыхтаваў таксама шэраг мерапрыемстваў для ўсёй сям’і. Так, Нарацкая сельская бібліятэка арганізавала гадзіну даверу «Сямейнае чытанне – дыялог пакаленняў». У Пузыроўскай сельскай бібліятэцы-доме вольнага часу адбыліся сямейныя пасядзелкі «Гартаем сямейны альбом» і літаратурны круіз «Па літаратурным моры ўсёй сям’ёй». Цікава і запамінальна прайшоў дзень сямейнага чытання «Таты! Мамы! Пачытайце разам з намі» ў Крывіцкай пасялковай бібліятэцы. Праграму складалі прагляд навінак літаратуры, віктарына «Ці ведаеш ты беларускую мову?», выстава «Сям’я – прытулак для душы», сустрэча з татамі і матулямі актыўных чытачоў. Да Дня сям'і ў Лук’янавіцкай сельскай бібліятэцы арганізавалі паэтычную хвілінку «Спасибо тебе, родная», на якую запрасілі самых актыўных чытачак featured рознага ўзросту. Ім прапанавалі цікавыя гульні, жартоўную латарэю, музычныя конкурсы. Для запрошаных прагучалі вершы і песні.

Да Дня сям’і ў г. Салігорску на плошчы каля кафедральнага сабора адбыўся канцэрт. ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» арганізавала кніжную экспазіцыю для жыхароў горада «Венец всех ценностей – семья». Падчас выставы была праведзена акцыя-віншаванне «Ромашка добрых пожеланий». На пялёстках папяровага

рамонку кожны жадаючы мог напісаць віншаванне ці пажаданне сваім родным і блізкім. А Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка сумесна з раённай ветэранскай арганізацыяй і Беларускім Таварыствам Чырвонага Крыжа наладзілі святочнае мерапрыемства для бабуль «У імя дабрыні». На свята бабулі прыйшлі з унукамі. Сустрэча праходзіла ў забаўляльна-конкурснай форме «Ану, бабулі», удзельніцам трэба было прэзентаваць «Сямейны партрэт»: генеалагічнае дрэва сям'і, яе традыцыі і рэліквіі.

14 кастрычніка адзначаецца Дзень маці. З гэтай нагоды самыя цікавыя мерапрыемствы адбыліся на Мядзельшчыне. Маналог пра вечнае «Маці – пачатак і бясконцасць» быў праведзены ў Крывіцкай пасялковай бібліятэцы, вечар-сустрэча «Самая прекрасная из женщин – женщина с ребёнком на руках» – у Будслаўскай сельскай інтэграванай бібліятэцы, выстава дзіцячых малюнкаў «Матуля – сонца і вясна» – у Старлыгскай сельскай інтэграванай бібліятэцы. Конкурс малюнкаў «У свеце лепшая за ўсіх матуля» арганізавала Камароўская сельская бібліятэка, літаратурна-паэтычную гадзіну «Мама! Это слово обретает музыку свою» – Буйкаўская сельская бібліятэка. А у ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы» 10 кастрычніка на гадзіну добразычлівасці «Мама слова дарагое» бібліятэкары запрасілі навучэнцаў групы Н-12 УА «Нясвіжскі дзяржаўны каледж імя Я.Коласа». Навучэнцы пазнаёміліся з гісторыяй і традыцыямі святкавання Дня маці ў Беларусі і як адзначаецца свята ў іншых краінах. З вялікай цікавасцю прысутныя паглядзелі відэаролікі, паразважалі пра ролю мамы ў жыцці кожнага чалавека. На мерапрыемстве гучалі прыгожыя мелодыі, вершы пра маці, сцэнарый суправаджаўся электроннай прэзентацыяй.

Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка адзначала свята выставамі-прысвячэннямі: «Великое, святое имя – Мать», «Маці, імя тваё я нясу праз жыццё, як святыню», «Хранима будь судьбою и людьми». Супрацоўнікі сельскіх

бібліятэк падрыхтатавалі самыя розныя мерапрыемствы: музычна-паэтычны вечар «Свет материнской любви» (Праўдзінская гарпасялковая бібліятэка), літаратурна-музычную кампазіцыю «Гэты свет сагрэлі нам матулі» (Дрычынская сельская інтэграваная бібліятэка), літаратурна-музычную гасцёўню «Пад ціхі шолах восеньскай лістоты» (Дубраўская сельская бібліятэка). У Мар'інагорскай гарадской бібліятэцы адбылося тэатралізаванае свята «Такія розныя матулі» з удзелам артыстаў бібліятэчнага тэатра «Усмешка», у ходзе якога юныя чытачы пазнаёміліся з творамі, прысвечанымі маме. А для навучэнцаў РЦВР «Світанак» правялі гульню-віктарыну «Мама, мілая мама». На працягу гульні ўдзельнікі малявалі кветкі для сваіх мам, адгадвалі загадкі, падбіралі добрыя і ласкавыя словы для сваіх матуль, пазнаёміліся з гісторыяй свята. Акрамя таго, удзельнікі тэатра «Усмешка» сумесна з бацькамі ўдзельнічаюць у выставах-конкурсах «Рознакаляровая зямля Беларусі», «Рукі таты, рукі мамы і мае ручонкі» і «Навокал роднае і блізкае».»

З вялікай цікавасцю чытачы наведваюць мерапрыемствы і пасяджэнні, якія праводзяць бібліятэкары ў рамках клубаў пры цэнтральных і сельскіх бібліятэках. Так, пры ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік» працуе жаночы клуб «Алеся», дзе можна не толькі знайсці цікава арганізаваны адпачынак, але і абмеркаваць жыццёвыя пытанні на самыя розныя тэмы: здароўе і прыгажосць, рукаддзелле, сакрэты вядзення дамашняй гаспадаркі, сустрэцца з цікавымі людзьмі. Добры настрой прынеслі вілейчанкам пасяджэнні «Пялёсткі жаночай душы», «Любоў вам бясконцая, нізкі паклон», «Шчасце ў хаце – гэта маці» і «Сувенір для любімай жанчыны».

Пры Мажскай сельскай бібліятэцы Капыльскага раёна працуе жаночы клуб «Сяльчанка». У рамках клуба прайшлі такія пасяджэнні, як дзень карысных парад «Жизнь полной ложкой», «Кораб счастья» і «Душевное чаепитие». Быў праведзены майстар-клас сервіроўкі стала для чаявання,

майстар-клас па макіяжу, прычоскам і аздабленню касцюма. Бібліятэкар Сямкоўскай сельскай бібліятэкі разам з удзельнікамі клуба «Святло сям'і» падрыхтавала Тыдзень маці пад назвай «За счастье жить «спасибо» маме», праграму якога склалі: гадзіна паэзіі «Мама – первое слово, главное слово в каждой судьбе», вернісаж малюнкаў «Все краски жизни для тебя» і літаратурная вечарына «Немеркнущий свет материнской любви». Завяршыўся Тыдзень наведваннем на даму шматдзетных матуль вёскі. Бібліятэкар разам з юнымі чытачамі бібліятэкі падарылі ім «букеты» з цукерак. Выдатна дапаўняла цыкл мерапрыемстваў кніжная выстава «Свет материнства – свет любви». У рамках клуба «Святліца» ва Урэцкай гарпасялковай бібліятэцы-філіяле №1 Любанскага раёна прайшла тэматычная вечарына «Ведь мы – Ведьмы». З даўніх часоў мужчыны называюць жанчын «вядзьмаркамі», таму ўдзельніцам клуба прапанавалі на адзін вечар «ператварыцца» ў гэтых чароўніц. На вечарыне «вядзьмаркі» «варылі» прываротнае зелле паводле рэцэптаў кулінарных кніг, дзяліліся ўласнымі рэцэптамі і нарыхтоўкамі, чыталі любімыя вершы, варажылі па кнізе і нават «лёталі» на мятле.

ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса» ў рамках клуба «Мая сям'я» правяла да Дня жанчын вечар-віншаванне «Праздник весны, цветов и любви». Супрацоўнікі бібліятэкі павіншавалі жанчын са святам, а за кубачкам гарбаты правялі цікавую і змястоўную гутарку аб жыццёвых прынцыпах і сямейных здабытках. Дню сям'і быў прысвечаны круглы стол «Праблемы сям'і: пытанні і адказы», на якім выступіла галоўны спецыяліст РАА Наталля Герман. У дзіцячай бібліятэцы на дні сямейнага адпачынку, якія праводзяцца ў бібліятэчным клубе «Адпачываем усёй сям'ёй» ужо не першы год, запрашаюцца актыўныя чытачы і іх бацькі, а таксама дзеці са шматдзетных, малазабяспечаных і няпоўных сямей. Да Дня жанчын прайшла святочная сустрэча «Число восьмое – не простое». На свяце гучалі лірычныя вершы і песні. Юныя таленты падарылі сваім

мамам тэатралізаваную сцэнку «Мамы и дочки». Дзеці з радасцю ўдзельнічалі ў конкурсах «Спеленай куклу» і «Создай свою прическу». Чытачы паднеслі супрацоўнікам бібліятэкі букет з вясновых кветак.

### *Патрыятычнае выхаванне*

Любоў да Радзімы, веданне гісторыі свайго народа, вернасць слаўным яго традыцыям з'яўляюцца асновай у сістэме выхавання асобы любой грамадзянскай супольнасці, любога дзяржаўнага ладу. Патрыятызм, у канчатковым выніку, становіцца сувязной ніццю розных пакаленняў, а таму бібліятэкі надаюць асаблівае значэнне пытанням патрыятычнага выхавання.

У ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэкі», распрацавалі сумесны з дзіцячай школай мастацтваў праект «Книга. Кисть. Карандаш…» у рамках якога была арганізавана інтэрактыўная патрыятычная выстава-панарама пад адкрытым небам «В книжной памяти мгновения войны» з кнігамі аб Вялікай Айчыннай вайне і ілюстрацыямі да іх, краязнаўчымі дакументамі.

Актыўна вядзецца работа па патрыятычным выхаванні ў Нясвіжскім раёне. Супрацоўнікі бібліятэкі ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы» з 2018 г. рэалізоўваюць праект «Пакаленне», у рамках якога адбыліся тэматычныя выставы, фотасушкі, сустрэчы з воінамі-інтэрнацыяналістамі, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, малалетнімі вязнямі, жыхарамі блакаднага Ленінграда. У выставачна-інфармацыйнай зале бібліятэкі прайшоў круглы стол з удзелам воіна-інтэрнацыяналіста, камандзіра верталёта Прахода М.А. Патрыятычна-асветніцкая акцыя для падрастаючага пакалення «В сердцах и книгах – память о войне» прадугледжвала правядзенне наступных мерапрыемстваў: выстава-панарама «Не померкнет слава тех военных лет», гадзіна мужнасці з элементамі гучных чытанняў «Помним. Славим. Гордимся» для выхаванцаў

ДУА «Яслі-сад №2 г. Нясвіжа», вехі памяці і славы «Там каждый был героем» і выстава-інсталяцыя «И память о войне нам книга оживит».

У Мар'інагорскай гарадской бібліятэцы-філіяле Пухавіцкага раёна працягвалася работа па праграме «Кнігакампанія «Сымон і К@», асноўнай мэтай якой з'яўляецца грамадска-патрыятычнае выхаванне праз папулярызацыю твораў айчынных пісьменнікаў. На пачатку года бібліятэкары распрацавалі праект «Маленькі патрыёт вялікай Радзімы Беларусь», у які увайшоў наступны цыкл мерапрыемстваў: кніжныя выставы «Гэты дзень мы набліжалі як маглі», «Без памяці пра мінулае няма будучыні», «Яны прайшлі дарогамі вайны», «Дзяцінства іх закрэсліла вайна», «Яны прынеслі вам Перамогу»; выстава-фотасушка «Память, которой не будет конца»; бібліяагляд «Была вясна, вясна Перамогі»; краязнаўчая гутарка «Подзвігам славутыя твае землякі» і інш. А з 8 мая 2018 года ў Мар'інагорскай гарадской бібліятэцы-філіяле ўзяў старт літаратурна-гістарычны марафон «Радзіма шчаслівых дзяцей», які здзяйсняўся ў межах праграмы «Маленькі патрыёт вялікай Радзімы Беларусь». На працягу мая ў чытальнай зале прапанавалі юным чытачам стаць удзельнікамі арт-праграмы «У книги будет голос мой». Героем праграмы стала Кніга ўспамінаў беларускіх дзяцей пра падзеі Вялікай Айчынай вайны «Ніколі не забудзем» была адпраўным пунктам мерапрыемства. На першым этапе дзеці здейснілі экскурс у гісторыю стварэння кнігі, на другім бібліятэкар запрасіла ўдзельнікаў да выразнага чытання ўрыўкаў з кнігі, якое запісвалася на электронны носьбіт. Пераможцы гульні агучвалі буктрэйлер, прысвечаны кнізе «Ніколі не забудзем». Заключным этапам стаў конкурс малюнкаў «Самая прыгожая, самая любая – Беларусь мая!»

У многіх бібліятэках вобласці праводзіліся патрыятычныя акцыі. Падчас акцыі «Манументы памяці» для працоўнай моладзі г. Беразіно арганізавалі экскурсію да помнікаў салдацкай славы і ахвяраў гета з тэатралізаваным

дзействам «Памяць, закаваная ў граніт». Да 75-годдзя спальвання фашыстамі Хатыні супрацоўнікамі Бярэзінскай раённай бібліятэкі падрыхтавана акцыя-рэквіем «Дарогамі спаленых вёсак» з вахтай памяці бярэзінскім «Гарыням» – вёскам Баравіно, Краснае і Уцешына зладжаная 20-22 сакавіка пры транспартнай падтрымцы аўтаклуба раённага цэнтра культуры. Першым аб’ектам акцыі стаў аграгарадок Брадзец. У час вайны вёска была спалена нямецка-фашыскімі захопнікамі, на яе месцы устанавілі мемарыял. 20 сакавіка супрацоўнікі Бярэзінскай раённай бібліятэкі прапанавалі вучнёўскай моладзі аграгарадка Брадзец спектакль тэатра-маналога «Я – з вогненнай вёскі» паводле сюжэтаў з мастацка-дакументальных кніг А. Адамовіча, Б. Сачанкі і І. Сачука.

Язненская сельская бііятэка Вілейскага раёна прадставіла акцыю «День белых журавлей». Пугачоўская сельская бібліятэка Валожынскага раёна наладзіла выставу «Пачытаем пра вайну». Супрацоўнікі гэтых бібліятэк правялі серыю майстар-класаў па арыгамі і навучылі ўсіх жадаючых складваць папяровых птушак, якія сімвалізуюць памяць аб загінулых. Прайшоў агляд твораў пра вайну В. Быкава, І.Шамякіна і С.Алексіевіч.

ДУК «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» 22 сакавіка, у дзень 75-годдзя Хатынскай трагедыі, прапанавала чытачам акцыю-рэквіем «Пепел Хатыни стучит нам в сердца». Яна была прысвечана не толькі Хатынскай трагедыі – у жудасным полымі загінулі жыхары дзяржынскіх вёсак Літавец, Садкаўшчына, Глухое Пярхурава, Любожанка, Скірмантава, акцыя – даніна памяці ўсім тым, чыё жыццё абарвала жудасная трагедыя.

На працягу года бібліятэкі Любанскага раёна прымалі ўдзел у акцыях «Чыстыя чацвяргі каля помнікаў», «Ветэран», у дэкадзе ваенна-патрыятычнай кнігі «Часцей, часцей прыпамінай, імёны паўшых смерцю храбрых». ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка» напярэдадні Дня Перамогі разам з бібліятэкарам

Крывіцкай пасялковай бібліятэкі правяла акцыю «Ніколі не забудзем», падчас якой школьнікі добраўпарадкавалі помнік загінулым землякам у в. Задубенне. У рамках акцыі адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя «Детство, опалённое войной».

ДУК «Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка» ў лесапаркавай зоне «Загор'е» правяла акцыю «Напішы пісьмо ветэрану». Кожны жадаючы мог напісаць пісьмо і выказаць удзячнасць ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, якія абаранялі Радзіму. А на працягу года праходзіла акцыя «Ніколі не забудзем», у час якой бібліятэкары наведвалі ветэранаў на даму і прапаноўвалі літаратуру для чытання.

Сёння, праз 77 гадоў пасля Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, засталося ўжо мала ветэранаў, якія маглі б расказаць пра свае подзвігі, пра выпрабаванні на франтах і ў часы акупацыі. Але Памяць павінна жыць. Кожны год да Дня Перамогі бібліятэкі Мінскай вобласці сумесна з мясцовымі Саветамі наладжваюць урачыстыя мітынгі з ускладаннем кветак і вянкоў да помнікаў загінулым салдатам.

ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» правяла на базе літаратурнага клуба «Выток» акцыю «Огни победного салюта». Удзельнікам была прапанавана літаратурна-музычная кампазіцыя «И в огнях победного салюта искорки людских счастливых глаз». Прагучалі пранікнёныя паэтычныя радкі пра вайну і перамогу ў выкананні аўтараў – мясцовых паэтаў.

У ДУ «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» разгарнулі выставу-панараму «Возвращенная миру весна», выставу-напамін «Песни Победы», правялі літаратурна-музычны вечар «Песні Пабеды» (у рамках клуба «Золотая осень»), віртуальны экскурс «Города-герои», урок памяці «Молодежь и война: право на мир». 9 мая бібліятэкары на алеі імя. Д. Сыракват ў Жодзіне арганізавалі святочную інфармацыйную пляцоўку «Полевая почта». Тэатралізаванае прадстаўленне «Крутится-вертится шар голубой» адбылося ў

ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі». У пастаноўцы прымалі ўдзел педагогі і навучэнцы школы, работнікі ААТ «Старыца-Агра», паэтэса літаратурнага аб’яднання «Вясёлка» Я.Г Малевіч. На мерапрыемстве прысутнічаў апошні ветэран з в. Астрэйкі В.П. Гапонаў. Усіх прысутных павіншаваў намеснік старшыні Рэспубліканскага савета ГА «Беларускі саюз афіцэраў», палкоўнік у адстаўцы В.С. Скрыннікаў.

ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка» працягвае работу па зборы матэрыялаў для паўнатэкставай базы дадзеных «Пусть в памяти останутся эти имена». Электронны дакумент змяшчае звесткі пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны Мядзельшчыны.

Ва ўсіх бібліятэках раёна праводзіліся акцыі міласэрнасці і дапамогі ветэранам, віншаванні з днём нараджэння, хатнія наведванні-віншаванні з Днём Перамогі. Выгалавіцкая сельская бібліятэка-клуб Мядзельскага раёна ў рамках «Школы міласэрнасці» правяла тыдзень дапамогі «Ветэран побач з табою», падчас якога дзеці дапамагалі ветэранам у хатніх справах.

У Салігорску, на радзіме Героя Савецкага саюза В. З. Каржа, адбыўся раённы конкурс патрыятычнай песні «Красная гвоздика», у якім прыняла ўдзел Харастоўская сельская экалагічная бібліятэка Салігорскага раёна з інфармацыйным кутоком «Наш зямляк В.З. Корж – гонар Салігоршчыны».

Таксама правялі Цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных Дню Перамогі, праведзены ў сельскіх бібліятэках Старадарожчыны: літаратурна-музычная кампазіцыя «Мы этой памяти верны» (Горкаўская сельская бібліятэка), гадзіна патрыятызму «Как хорошо на свете без войны» (Залужская сельская бібліятэка-клуб), дзень воінскай славы «Меняются цифры, стираются даты, но в памяти вечной шагают солдаты» (Ляўкоўская сельская бібліятэка-клуб), мітынг-рэквіем «Жыві і помні» (Падарэская сельская бібліятэка).

Да дня Перамогі ў Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэцы сумесна з супрацоўнікамі краязнаўчага музея і раённага Савета ветэранаў правялі святочную сустрэчу з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны Козыравым М.Ф і Якаўлевым А. Ц. На мерапрыемства запрасілі вучняў СШ №2 і навучэнцаў прафесійна-будаўнічага ліцэя. Бібліятэкары падрыхтавалі прэзентацыю «Паклонімся вялікім тым гадам», дэманстраваліся кадры ваеннай хронікі, якія суправаждаліся запісамі песень ваеннай пары. У рубрыцы «Фота-памяць» дэманстраваліся здымкі аўтапрабега па месцах баявой славы Чэрвеньскага раёна, які быў арганізаваны раённым Саветам ветэранаў. Удзельнікаў свята зацікавіла выстава-прэзентацыя «Ордэны і медалі часоў Вялікай Айчыннай вайны».

Супрацоўнікі ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» наладзілі прэзентацыю паэмы ганаровага грамадзяніна г. Беразіно, удзельніка партызанскага руху на Бярэзіншчыне М. Ханінава «Званы Хатыні». У ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» ў рамках урока мужнасці «Трагедыя і боль беларускага народа адбылася мультымедыйная прэзентацыя «Хроніка палаючых вёсак Валожыншчыны». Сельскія бібліятэкі Валожыншчыны правялі таксама наступныя мерапрыемствы: відэалекторыі «Огненная деревня» (Чурлёнская сельская інтэграваная бібліятэка), «Гучаць званы памяці» (Ерхаўская сельская бібліятэка), «Хатынь – былая вёска» (Любанская сельская бібліятэка), літаратурную кампазіцыю «Скорбный звон Хатыни» (Іжская сельская інтэграваная бібліятэка і Шылавіцкая сельская бібліятэка). Песачанская сельская бібліятэка Капыльскага раёнаправяла гадзіну памяці «Сёстры Хатыні». У сельскіх бібліятэках Любанскага раёна Хатынскай трагедыі прысвяцілі кніжныя выставы: «Люди добрые, помните!» (Камунараўская сельская бібліятэка), «Колокола Хатыни» (Кузьміцкая сельская бібліятэка). У Крупіцкай інтэграванай сельскай бібліятэцы Мінскага

раёна была аформлена выстава «Мы не забудзем боль Хатыні».

У студзені – сакавіку 2018 года ў бібліятэках ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» праводзілі марафон памяці «Память объединяет всех». Бібліятэкары падрыхтавалі шэраг мерапрыемстваў: гадзіну памяці «Сердце, слушай колокола, помни все, не остынь» (Сяражская сельская інтэграваная бібліятэка-філіял №4), электронны даведнік па мемарыялу «Хатынь» «Помолчим у истории, бронзою ставшей» (Вежская сельская бібліятэка-філіял №6), відэаэкскурсію «И будет вечно жить Хатынь» (Грэская сельская бібліятэка-філіял №14), мультымедыйную вандроўку «Трагічны лёс Хатыні» (Падлеская сельская бібліятэка-філіял №35). У ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» ў рамках тыдня памяці з 16 па 22 сакавіка 2018 года чытачы прымалі ўдзел у мерапрыемстве «Хатынь: трагедия и память». У Лашанскай сельскай бібліятэцы Уздзенскага раёна адбылася гадзіна мужнасці і смутку «Званы Хатыні», а бібліятэкары Запольскай сельскай бібліятэкі Чэрвеньскага раёна правялі для вучняў старэйшых класаў гісторыка-краязнаўчую гадзіну «Хатынь – звонят колокола памяти».

У 2018 годзе адзначалася 100-годдзе з дня заканчэння Першай сусветнай вайны. Бібліятэкарамі праведзена вялікая работа па зборы цікавых матэрыялаў па гісторыі той далёкай вайны, былі выкарыстаны кніжныя дакументы, артыкулы з часопісаў і газет, інтэрнет-рэсурсы. Вельмі цікавыя мерапрыемствы адбыліся ў Вілейскім раёне. Крывасельская сельская бібліятэка арганізавала для сваіх чытачоў экскурсію ў адзіны ў Беларусі мемарыяльны комплекс «Памяці падзей Першай сусветнай вайны» ў вёсцы Заброддзе. Удзельнікі экскурсіі пазнаёміліся з аўтарам праекта мемарыяльнага комплексу – беларускім графікам і іканапісцам, членам Саюза мастакоў СССР, лаўрэатам Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Барысам Барысавічам Цітовічам. Успаміны жывых яшчэ на пачатку 1970-х гадоў

сведкаў Першай сусветнай вайны, захаваныя фатаграфіі і дакументы, архіўныя матэрыялы, рэканструкцыя прыфрантавога шпіталя з могілкамі дазволілі экскурсантам больш даведацца пра тагачасныя падзеі.

Шматлікія мерапрыемствы праводзіліся сельскімі бібліятэкамі для жыхароў старэйшага пакалення і старшакласнікаў: краязнаўчы ўрок «Першая сусветная на Вілейшчыне» (Шылавіцкая сельская бібліятэка), віртуальная экспедыцыя «Першая сусветная», «Што мы ведаем аб гэтай вайне?» (Іжская сельская інтэграваная бібліятэка); эрудыт-гульня «Сто вопросов на засыпку» (Даўгінаўская і Людвіноўская сельскія інтэграваныя бібліятэкі). У Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы была арганізавана выстава-панарама «Великая война. 1914-1918» і фотастушка «Вялікая і забытая».

Ужо сталі традыцыяй мерапрыемствы, прысвечаныя Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. У гэтым годзе ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі» сумесна з ДАСААФ у рамках месячніка абаронна-патрыятычнай і спартыўнай работы арганізавала сустрэчу з воінамі-інтэрнацыяналістамі Г.Чацвярыком і А.Драко «Салдат вайну не выбірае». Да сустрэчы афармілі выставу-агляд «Афганистан как рана кровоточит». Бібліятэкары сеткі публічных бібліятэк Лагойскага раёна правялілі гадзіну-ўспамін «І ў памяці, і ў сэрцы назаўсёды», у час якой быў паказаны дакументальны фільм «Хроніка вайны ў Афганістане 1979-1989 гг.».

Сельскія бібліятэкі Любанскага раёна падрыхтавалі гадзіну патрыятычнай кнігі «Афганістан. Полымя вайны», Урэцкая гарпасялковая бібліятэка-філіял №39 – фільмаграфію «20 лет. Афган. Трафеі», Малагарадзяціцкая сельская бібліятэка – сустрэчу з воінамі-афганцамі «Время выбрало нас», а ў Камунараўскай сельскай бібліятэцы для вучняў 10 класа быў праведзены ўрок мужнасці «Афган. Полымя вайны», на якім вучні пазнаёміліся з гісторыяй афганскай

вайны і даведаліся пра воінаў-інтэрнацыяналістаў сваёй вёскі і раёна. Была аформлена фотавыстава «Старонкі мужнасці».

З вялікай цікаўнасцю чытачы Ждановіцкай сельскай бібліятэкі Мінскага раёна сустрэліся з воінам-інтэрнацыяналістам, палкоўнікам міліцыі ў адстаўцы Быкавым У. Ф. і беларускай пісьменніцай Хадасевіч-Лісавай К.С. Быкаў Уладзімір Фёдаравіч расказваў пра вайсковую службу, пра тое, што вялікае значэнне мае ў арміі паразуменне, надзейнасць і падтрымка адзін аднаго. Паказаў свае ўзнагароды і расказаў, за што быў узнагароджаны, адказаў на пытанні дзяцей.

Традыцыйныя сустрэчы з воінамі-афганцамі адбыліся і ў Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэцы пад назвай «Памяць жыве». Яна была прысвечана 25-годдзю стварэння грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» і 29-годдзю вываду савецкіх войскаў з Афганістана. На сустрэчу з землякамі, удзельнікамі афганскай вайны Віктарам Казачонкам і Уладзімірам Дзядзелам прыйшлі вучні старэйшых класаў СШ №2 і навучэнцы Чэрвеньскага прафесійна-будаўнічага ліцэя.

Да 100-годзя ВЛКСМ у 2018 годзе ў бібліятэках Міншчыны адбыліся сустрэчы з былымі камсамольцамі. А бібліятэкары ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» падрыхтавалі патрыятычную гадзіну «Імгненні памяці» з прадстаўленнем мастацка-дакументальнай выставы «Эпоха юнацтва і перамог» і паказалі фільм «Камсамольскае юнацтва».

ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А.Астрэйкі» прыняла ўдзел у мерапрыемстве Капыльскага раённага цэнтра культуры, на якім прысутнічалі ветэраны камсамольскага руху, актывісты раённай арганізацыі «БРСМ» і моладзь. Супрацоўнікам бібліятэкі была наладжана выстава-інсталяцыя «Камсамол – гісторыя эпохі», дзе былі прадстаўлены кнігі пра гісторыю маладзёжнай арганізацыі, мастацкая літаратура, публіцыстычныя матэрыялы і зборнікі песень.

Сельскімі бібліятэкамі Мінскай вобласці былі падрыхтаваны цікавыя кніжныя выставы – «Летопись комсомольских времен» і выставка-фотосушка «Комсомол: время, события, люди» (Дрычынская сельская інтэграваная бібліятэка Пухавіцкага раёна). Смілавіцкая гарпасялковая бібліятэка Чэрвеньскага раёна сумесна з Домам культуры ў рамках гістарычнай гадзіны «У часу свая памяць» арганізавала для вучняў 9-х класаў СШ №1 тэматычную выставу кніг, але галоўным экспанатам выставы былі сапраўдныя камсамольскія білеты.

У 2018 г. адзначалася 100-годдзе з дня заснавання Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Бібліятэкары Баравікоўскай інтэграванай сельскай бібліятэкі Дзяржынскага раёна разам са старшынёй сельскага Савета Кураком Міхаілам Васільевічам наведалі ветэрана, каб уручыць яму юбілейны медаль «100 год Узброеным Сілам Рэспублікі Беларусь», павіншаваць са святам і ўручыць кнігу «Солдаты Победы».

ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі» правяла ў раённым цэнтры культуры акцыю «Вам, абаронцы Айчыны», у рамках якой была адбылася выстава-інсталяцыя «Ёсць такая прафесія – абараняць Радзіму».

Усе жадаючыя атрымалі рэкламныя буклеты з паэтычным віншаваннем і бібліяграфічным спісам «Кнігі для сапраўдных мужчын».

У справаздачным годзе бібліятэкары ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» арганізавалі шэраг мерапрыемстваў у вайсковай часці №30151, сярод якіх – кніжныя выставы на тэмы ваенных падзей у беларускай гісторыі.

Да дня абаронца Айчыны і да 100-годдзя Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь у Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы былі прымеркаваныя выставы літаратуры: «Уходят в армию мужчины, уже защитники страны», «Шануем абаронцаў Айчыны» і «Служыць Айчыне – вялікі

гонар». Па матэрыялах выстаў адбыліся ўрокі мужнасці. У Азярыцка-Слабадской сельскай бібліятэцы Смалявіцкага раёна была праведзена гадзіна патрыятызму «Ёсць такая прафесія – Радзіму абараняць». На мерапрыемства запрасілі выдатніка пагранічных войскаў, сяржанта ў запасе Лебедзева Уладзіслава Сяргеевіча, які служыў на памежнай заставе і мае ўзнагароды. Ён расказаў прысутным пра сваю службу. У канцы мерапрыемства дзеці задавалі шмат пытанняў аб тым, як жывуць і чым займаюцца памежнікі ў свой вольны час, як ахоўваецца наша мяжа.

Шырока ахоплена бібліятэчнымі мерапрыемствамі і такое знакавае свята, як Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Так, ў сакавіку ў сельскіх бібліятэках Бярэзінскага раёна масава прайшлі патрыятычныя акцыі «Мы – грамадзяне Беларусі», урок радзімазнаўства «Карані нашай дзяржаўнасці» і гістарычная вандроўка «Беларусь мая, родны край» у ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Т. Новік». Цікавыя кніжныя выставы да Дня Незалежнасці «Беларусь у маім сэрцы», «Зямля нам дадзеная лёсам» «Край пад небам буслінымˮ у Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы знаёмілі чытачоў з гістарычным мінулым нашай краіны, яе выдатнымі мясцінамі і знакамітымі беларусамі, адлюстроўвалі сучаснае сацыяльна-эканамічнае жыццё Беларусі. Адзін з раздзелаў быў прысвечаны малой Радзіме – Пухавіччыне. А на Чэрвеньшчыне Горкаўская сельская бібліятэка падрыхтавала літаратурна-музычную кампазіцыю «Мой лёс і песня – Беларусь».

## *Эстэтычнае выхаванне*

Бібліятэкі Мінскай вобласці здзяйсняюць эстэтычнае выхаванне сваіх карыстальнікаў, спрыяюць развіццю іх мастацкага густу, фарміруюць гарманічна развітую асобу праз далучэнне да скарбніц айчыннай і сусветнай культуры. Публічнымі бібліятэкамі Міншчыны распрацаваны і паспяхова рэалізуюцца арыгінальныя цікавыя праграмы

і праекты. Так, у аддзеле абслугоўвання і інфармацыі ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» працягвалася праца паводле праекта «Тэрыторыя творчасці», які дае магчымасць кожнаму, хто мае здольнасці, прадэманстраваць сваю творчасць праз арганізаваныя выставы. Працягваў сваю дзейнасць створаны ў рамках праекта творчы клуб для жанчын «Натхненне». Работы ўдзельніц гэтага клуба Людмілы Савінавай і Людмілы Клімовіч былі прызнаны пераможцамі на абласным конкурсе-фестывалі нацыянальных культур ветэранаў «Мой родны кут», які быў прысвечаны Году малой радзімы.

Чарговы сезон праекта пачаўся з выставы твораў мастачкі Наталлі Керус «На крыльях вдохновения»: карціны алеем, роспіс па льну, графіка, маляваныя дываны, макаткі – маляваныя дываны ў мініяцюры, кераміка.

ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» працягвала працу праекта «Отмечает автор юбилей», які распланаваны на 2016-2020 гг. Яго мэтай з'яўляецца далучэнне большай колькасці чытачоў да чытання літаратуры, стварэнне новых рэсурсаў і забеспячэнне роўнага доступу да іх, папулярызацыя фонду бібліятэкі. Праект вядзецца ў трох кірунках: аўтары беларускай літаратуры, аўтары рускай літаратуры і аўтары замежнай літаратуры. У яго рамках будзе створана электронная база дадзеных, якая будзе ўтрымліваць інфармацыю пра аўтара і яго творы. У рамках праекта быў праведзены творчы конкурс «Книга и чтение в моей жизни», у якім прынялі ўдзел 110 чалавек. Спаборнічалі ў наступных намінацыях: «Вокладка да любімай кнігі», «Кніга, ажыўшая на экране», «Кніга сваімі рукамі» і «Працяг кнігі». Работы прымаліся з 1 сакавіка па 25 мая 2018 года, па выніках конкурсу была арганізавана выстава. А 1 чэрвеня 2018 года, у Дзень абароны дзяцей, было арганізавана выніковае мерапрыемства, на якім усім удзельнікам уручылі дыпломы і сувеніры. Таксама ўдзельнікі пазмагаліся за прыз глядацкіх сімпатый. Галасаванне

праходзілі на працягу лета ў памяшканні бібліятэкі. У Дзень бібліятэк былі аб’яўлены пераможцы ва ўсіх намінацыях.

Зала мастацтваў ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча» сумесна з ДУА «Маладзечанскі раённы цэнтр рамёстваў» працуе над пректам «Майстры роднага краю», у рамках якога для кожнага жадаючага праводзяцца заняткі дэкаратыўна-прыкладнога мастацва. А з дапамогай пазнавальнай праграмы «На падмостках тэатра», якая прайшла ў зале мастацтваў цэнтральнай бібліятэкі, юным чытачам расказалі, што ёсць драматычны, лялечны і музычны тэатры, якія асаблівасці ў кожнага тэатра. Дзеці даведался, што ў іх родным горадзе ёсць Мінскі абласны драматычны тэатр і Мінскі абласны тэатр лялек «Батлейка». Супрацоўнікі пазнаёмілі прысутных з літаратурай па мастацтву.

Пры сельскай бібліятэцы-філіяле п. Чысць Маладзечанскага раёна працуе праект «Творчыя людзі пасёлка», у рамках якога праводзяцца сустрэчы чытачоў з творчымі людзьмі, арганізуюцца майстар-класы і выставы. Прайшлі наступныя мерапрыемствы: майстар-класы «Мастацтва дэкору» і «Саламяныя дзівосы», сустрэча з мастачкай А. Богдан «Святы і будні беларускага народа», выстава-экспазіцыя «Цветы в твоей жизни».

З мэтай папулярызацыі кнігі і чытання сярод насельніцтва мікрараёна Новая Зара на базе Мар’інагорскай гарадской бібліятэкі Пухавіцкага раёна праходзіла сацыяльна-культурная акцыя «Прыйшоў час чытаць». Творчы калектыў бібліятэкі арганізаваў для сваіх чытачоў шмат прыемных сюрпызаў. Наведвальнікаў парадавала выстава-адвайзер «Кніга ў трэндзе», якая запрашала чытачоў пазнаёміцца з моднымі навінкамі літаратуры. Літаратурна-біяграфічны часопіс «Слова – творчасць» суправаджаўся кніжным аглядам. На працягу года ў бібліятэцы дзейнічала выстава-панарама «Свет і цені літаратурных адкрыццяў», выстава-кіначытанне «2 К: Кніга + Кіно». У бібліятэцы прайшоў літаратурны вечар аб сямейных каштоўнасцях

«Я кахаю» па прозе П. Праскурына. На працягу года ў бібліятэцы ладзіліся выставы новых кніг: «Кнігаманія», «Кніжная вясна» і «10 кніг з летнім настроем».

Шмат мерапрыемстваў было прапанавана да юбілеяў як беларускіх, так і замежных пісьменнікаў. Сельскімі бібліятэкамі было цікава адзначана 200-годдзе з дня нараджэння Івана Сяргеевіча Тургенева. Данілавіцкая інтэграваная сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна правяла літаратурную гасцёўню «Волшебная красота и сила русского слова», удзельнікі абмеркавалі прачытаныя творы, падзяліліся сваімі ўражаннямі і адказалі на пытанні інтэлектуальнай віктарыны па раману «Отцы и дети». ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка» прапанавала юбілейную выставу «Великий мастер языка и слова». Урэцкая гарпасялковая бібліятэка-філіял №1 Любанскага раёна правяла літаратурнае даследаванне «Тургенев и Полина Виардо – союз духовности и любви». Гадзіна пісьменніка «Все мои мысли в России» прайшла ў Стараюрковіцкай сельскай бібліятэцы. Урок выдатнай асобы «Великий, могучий, свободный» быў праведзены ў Соснаўская сельскай бібліятэцы-філіяле №37. Забалацкая сельская бібліятэка прадставіла літаратурны партрэт «Золотой эталон русской литературы».

У бібліятэках Мінскай вобласці адбыліся разнастайныя мерапрыемствы да 80-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Высоцкага: літаратурны віраж «Носил он совесть близко к сердцу» (Негарэльская сельскай бібліятэка і Фаніпальская гарпасялковая бібліятэкі Дзяржынскага раёна); музычная гадзіна «Я только малость объясню в стихе…» (Баравікоўская інтэграваная і Энергетыкаўская сельская бібліятэкі Дзяржынскага раёна); вечар-партрэт «Он знал: до смерти петь ему» (Скірмантаўская сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна); літаратурная элегія «В.Высоцкий – поэт, певец, актёр» (Плешчаніцкая гарпасялковая бібліятэка Лагойскага раёна); літаратурна-музычная гадзіна «Носил он совесть близко

к сердцу» (Пухавіцкая сельская бібліятэка Пухавіцкага раёна).

У ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка» у рамках літаратурнага клуба «Гармонія» адбылася музычна-літаратурная кампазіцыя «Мне ёсць што праспяваць». Удзельнікі мерапрыемства чыталі вершы У. Высоцкага, глядзелі запісы выступленняў усенароднага любімага акцёра, спевака і паэта. Мерапрыемства суправаджала змястоўная слайд-прэзентацыя. Аўдыторыя дзялілася сваімі ўражаннямі і думкамі з нагоды ўбачанага і пачутага.

Пры правядзенні мерапрыемстваў эстэтычнага выхавання шырока выкарыстоўваюцца выяўленчыя матэрыялы, музыка і відэафільмы. Усё гэта садзейнічае развіццю мастацкага густу чытачоў.

Да 75-годдзя расійскай пісьменніцы Л. Уліцкай вясковыя бібліятэкары падрыхтавалі ў Багушэвіцкай сельскай бібліятэцы Бярэзінскага раёна інфарм-дайджэсты «Жаночы погляд
на сучаснасць».

Вішнеўская сельская бібліятэка Валожынскага раёна падрыхтавала прэзентацыю кнігі Уладзіміра Мулявіна «Сэрцам і думамі». Да 80-годдзя кампазітара Ігара Лучанка ў Багданаўскай сельскай бібліятэцы Валожынскага раёна праходзіла музычная хвіліна «Песні – яго лёс», падчас правядзення слухачы пазнаёміліся з біяграфіяй маэстра і з гісторыяй напісання многіх твораў. У Негарэльскай сельскай бібліятэцы Дзяржынскага раёна адбылося літаратурнае спатканне «Когда в мире есть Толстой».

ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» прапанавала чытачам выставу-партрэт «Майстра арыгінальнага сюжэта» да 125-годдзя з дня нараджэння А. Мрыя, кніжнае асарці «Кнігі-юбіляры 2018 года», выставу-партрэт «Маё пакаленне» да 105-годдзя з дня нараджэння Э. Агняцвет і выставу лепшых беларускіх выданняў «Кніга – пошук».

Да 100-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Салжаніцына ў Любанскім раёне адбыўся цыкл мерапрыемстваў: літаратурная вечарына «Талант яркі і самабытны» (Рэдкавіцкая сельская бібліятэка) і медыягадзіна «Жизнь и творчество А. Солженицина» (Сароцкая сельская бібліятэка). Цыкл выстаў: «Мудрость и сила таланта» (ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка»), «А. Солженицин: личность, творчество, время» (Сароцкая сельская бібліятэка), «Человек перед лицом истории» (Атраднаўская сельская бібліятэка), «Архіпелаг Гулаг» (Пластоцкая сельская бібліятэка) і «Жизнь и творчество А. Солженицина» (Рачэнская сельская бібліятэка).

«Спыняючы чароўнае імгненне» – пад такой назвай была аформлена выстава ў Уздзенскай раённай цэнтральнай бібліятэцы ім. П. Труса, на якой прадставілі мастацкія творы Віталія Герасікавіча Мкртчана. А 30 снежня жыхары Беларусі мелі магчымасць убачыць відэасюжэт з удзелам мастака, зняты тэлеканалам СТБ для праграмы «Цэнтральны рэгіён».

У ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя. І.Х. Каладзеева» больш за 25 гадоў дзейнічае аддзел галерэйна-выставачнай дзейнасці «З’ява». У 2018 годзе аддзелам арганізавана і праведзена 29 выставачных мерапрыемстваў.

У бібліятэцы склалася добрая традыцыя – падтрымліваць творчасць маладых і пачынаючых мастакоў Барысаўшчыны.

Яе пляцоўкі становяцца першым выставачным вопытам для многіх з іх. Так, з 21 снежня 2017 г. па 28 студзеня 2018 г. у цэнтральнай раённай бібліятэцы праходзіла выстава графікі «Шэпт душы» Ліліі Салха. У экспазіцыю ўвайшло больш за 30 работ (малюнак алоўкам) пачынаючай мастачкі.

Здзівілі і парадавалі землякоў маладыя мастакі студыі «ARTерия». З 1 па 25 лютага ў мастацкай галерэі «З'ява» Вольга Палякова, Вольга Панамарова, Алена Мягкова, Ірына Арцюх, Агата Проніна і Слава Новаслаўскі дэманстравалі

свой мастацкі праект. Наведвальнікі бібліятэкі ўбачылі больш за 60 работ – жывапіс, графіка, калаж, камп'ютарная графіка – мастакоў, чыя творчасць грунтуецца на прынцыпах рэалізму і эксперыменце з фактурамі і матэрыяламі. Выставачная галерэя прапануе таксама наведвальнікам бібліятэкі пазнаёміцца з выставай народнай творчасці «Тутэйшыя майстры», на якой прадстаўлены розныя віды дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: кераміка, вырабы з лямцу, воўны і тэкстылю, аўтарскія лялькі, упрыгожванні і вырабы з выкарыстаннем разнастайных матэрыялаў (як традыцыйных, так і сучасных), вырабы ў тэхніцы «скрапбукінг», «кардмэйкінг» і «папяровая лаза». А 3 мая ў галерэі «З’ява» адбылася выстава «Все грани вышивки», дзе былі паказаны больш за сто работ аматарскай студыі вышывання «Чароўны крыжык».

Амаль у кожнай бібліятэцы Мінскай вобласці працуюць клубы, накіраваныя на эстэтычнае выхаванне насельніцтва. Праводзяцца аматарскія пасяджэнні для розных узростаў і катэгорый карыстальнікаў. Запрашаюцца вядомыя дзеячы мастацтва, пісьменнікі, артысты і народныя майстры. Міжнароднаму дню паэзіі ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» прысвяціла літаратурную гасцёўню «Паэзіі акрыленая муза». На сустрэчу з чытачамі бібліятэкі былі запрошаны члены народнага літаратурна-мастацкага аб’яднання «Рунь». Прысутныя пазнаёміліся з творчасцю М. Шакун, Г. Марцінкевіч і В. Гіруць-Русакевіч, прагучала вершы ў выкананні аўтараў. На працягу Тыдня маці наведальнікаў бібліятэкі радавала выстава вышываных пано «На волне вдохновений» Фрэдзій Альховай – актыўнай чытачкі бібліятэкі. У Абчугскай сельскай бібліятэцы Крупскага раёна, у рамках клуба «Были-небылицы», адбылося свята «Заглянула зімушка ў акенца», на якім была прадстаўлена выстава вышыванак і дзіцячых цацак, вырабаў ў тэхніках «фларыстыка», «лямцаванне», «пляценне з гумак» аўтарства мясцовай жыхаркі. Быў праведзены майстар-клас

па стварэнні навагодніх кампазіцый і кірмаш навагодніх падарункаў.

Бібліятэкары Рудзенскай гарпасялковай бібліятэкі Пухавіцкага раёна сумесна з выканаўцамі раённага аўтарскага клуба «Наедине со всеми» арганізавалі фотавыставу паэта і фатографа Віктара Буселя. Пры ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка» працуе літаратурна-музычная гасцёўня «Гармонія». Для ўдзельнікаў клуба прайшлі наступныя мерапрыемствы: літаратурна-гульнёвая праграма «Когда любовь растопит мир земной», гісторыка-мастацкі вечар «Я всегда только и жил Русью» (да 170-годдзя з дня нараджэння В.Васняцова), літаратурна-музычны вечар «В мечтах, стихах – как наяву…» (да 95-годдзя з дня нараджэння Э.Асадава), мастацкая кампазіцыя «Природа глазами художников». Пры Старасвержанскай сельскай бібліятэцы Стаўбцоўскага раёна дзейнічаюць гурткі эстэтычнага кірунку – лялечны тэатр «Ялінка» (з 1986 г.) і фальклорнага кірунку – «Батлейка» (з 2002 г.), якія з’яўляюцца часткай творчага праекта «Тэлестудыя «МІКС-ТВ»«. «МІКС-ТВ» аб’ядноўвае дзяцей 1-5 класаў (22 удзельнікі) і ўсіх жадаючых, ад пачаткоўцаў да старэйшых вучняў (і нават дарослых) з рознымі схільнасцямі і пажаданнямі. Кожнаму дадзена магчымасць праявіць сябе ў якасці акцёра лялечнага гуртка «Ялінка» і «Батлейка», актыўна ўдзельнічаць у здымках відэаролікаў, прыняць удзел у конкурсах і фотаконкурсах. Прадукт праекта «МІКС-ТВ» уключае тэматычныя блокі: «МиКсИкИ-ТВ» (мультымедыйны тэатр для пачатковай школы); «Нескучные уроки» (майстар-класы і карысныя парады); «Живи ярко» (канцэрты, пазнавальныя відэаролікі аб мастацтве, прыродзе і падарожжах); «Навіны-МІКС» (аператыўная інфармацыя аб самых важных падзеях і справах); «Родны кут – выток натхнення і жыцця аснова» (легенды звязаныя з роднай мясцовасцю, фальклорная старонка, народныя святы, дзіцячыя народныя гульні); «Кнопочки-ТВ» (работа з кнігай,

мультымедыйны тэатр «Са старонак кніг – на сцэну і ў кіно», буктрэйлеры) і інш.

Адзін раз у два месяцы праходзілі пасяджэнні клуба кветкаводаў «Флора» Дзераўнянскай сельскай бібліятэкі Стаўбцоўскага раёна. Члены клуба сустракаюцца для таго, каб атрымаць цікавую інфармацыю аб вырошчванні хатніх і садовых кветак, пагутарыць, падзяліцца вопытам і проста правесці цікава час. У рамках клуба праводзіліся наступныя мерапрыемствы: гутарка аб карысці фруктовага чаю «Фруктовый чай без церемоний», музычная віктарына «Расцвела сирень-черёмуха в саду», завочная вандроўка па гаючых крыніцах «Чудесные места родного края».

### *Духоўна-маральнае выхаванне*

Духоўна-маральнае выхаванне асобы з'яўляецца важным напрамкам у дзейнасці бібліятэк Мінскай вобласці. Шматлікія праекты і праграмы, распрацаваныя бібліятэчнымі супрацоўнікамі, прызваны зацікавіць карыстальнікаў і прыцягнуць іх да актыўнага саўдзелу ў працэсе духоўнага ўдасканальвання і самаўдасканальвання чалавека.

ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» цесна супрацоўнічае з Беларускай праваслаўнай царквой па праграме «Супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквой», удзельнічаючы ў сумеснай рэалізацыі шырокага спектру мерапрыемстваў, а таксама ў вырашэнні задач духоўна-маральнага выхавання моладзі. Духоўна-асветніцкая праграма «Адрасавана душы» аддзела абслугоўвання і інфармацыі ДУК «Цэнтральная гарадскоя бібліятэка г. Жодзіна» накіравана на павышэнне маральна-духоўнага патэнцыялу гараджан праз вывучэнне, асэнсаванне праваслаўнай гісторыі і культуры роднага краю, адраджэнне традыцый хрысціянскага чытання, на распаўсюджванне хрысціянскай інфармацыі і арганізацыю асветніцкай працы, аказання дапамогі ў фарміраванні пазітыўнага стаўлення людзей да жыцця. Праграма

распрацавана сумесна з царквой св. Архангела Міхаіла, гарадскім метадычным аб'яднаннем праваслаўных педагогаў «Вытокі» і гарадскім метадычным аб'яднаннем педагогаў-арганізатараў пры цэнтры дзіцячай творчасці.

Супрацоўнікамі Ухвальскай сельскай бібліятэкі Крупскага раёна з 2015 па 2018 год актыўна вялася работа ў рамках праграмы «На шляху да духоўнасці», якая ўключала наступныя мерапрыемствы: гадзіны духоўнасці «Будуем храм у душы», «Святыні роднага краю», калядныя чытанні «Віфліемская зорка», конкурс дзіцячых малюнкаў на біблейскія сюжэты і творчую гадзіну стварэння калядных падарункаў для ўдзельнікаў гуртка «Умелыя рукі».

У рамках мэтавай праграмы «Духовность. Нравственность. Книга» ў бібліятэках Любанскага раёна прайшлі наступныя мерапрыемствы: гадзіна духоўнасці «Духовных книг божественная мудрость» (ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка»); гадзіна шчырай размовы «Живое слово мудрости духовной» (Асавецкая сельская бібліятэка); урок праваслаўя «По ступенькам вечности» (Кузьміцкая сельская бібліятэка); гадзіна праваслаўнай кнігі «Чытанне для душы» (Камунараўская сельская бібліятэка); выстава-парада «Духоўнае святло» (Сароцкая сельская бібліятэка); інфармацыйна-пазнавальная гадзіна «Галоўныя хрысціянскія святы» (Загальская сельская бібліятэка).

У 2018 г. на базе Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі Капыльскага раёна ў рамках праграмы «Будуем храм у душах» сумесна са Свята-Мікольскай царквой быў створаны клуб духоўна-маральнага выхавання «Чысты Свет». Клубам праведзены наступныя мерапрыемствы: экскурсія «Дарога да духоўнасці» ў храм Свяціцеля Мікалая Цудатворца; тыдзень праваслаўнай кнігі (з бібліятэчнага фонду і прыватных збораў вернікаў і айца Міхаіла); ранішнік «Пасхальный перезвон» на тэрыторыі храма з удзелам протаірэя Міхаіла Мардвінава і прыхаджан, старшыні Цімкавіцкага сельсавета, работнікаў СДК, вучняў мясцовай школы.

Многія бібліятэкі Мінскай вобласці таксама ажыццяўляюць праектную дзейнасць па духоўна-маральным выхаванні насельніцтва.

Бібліятэкары ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» распрацавалі ў 2018 годзе праект па папулярызацыі духоўнай і праваслаўнай літаратуры «Тэатр ценяў». Было арганізавана 23 прадстаўленні спектакляў «Христианские притчи»; «Уроки благочестия»; «Рождественские истории» для розных узроставых груп карыстальнікаў.

Супрацоўнікі ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» правялі на базе ДУА «Сярэдняя школа №2 г. Дзяржынска» пілотныя заняткі праекта «Основы православной культуры».

ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча» сумесна з Маладзечанскім благачыннем рэалізуюць праект «Кропелькі вечнасці». Праведзены цыкл кінасеансаў мастацкіх фільмаў духоўнай тэматыкі «У надзеі, веры і любові».

У рамках міні-праекта «Майстры роднага краю» бібліятэкары залы мастацтва ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча» і майстры ДУК «Маладзечанскі раённы цэнтр рамёстваў» правялі для чытачоў бібліятэкі майстар-клас па флорадызайну «Сустракаем Вялікдзень». Майстрыхі Кочуб Надзея і Петрусевіч Аляксандра навучалі ўдзельнікаў прыгожа і арыгінальна афармляць букеты з вербачкай, а бібліятэкары прапанавалі падборку кніг, у якіх можна знайсці, як цікава падрыхтавацца да свята.

ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка» ў рамках праекта «Весь год встречаем мы гостей» правяла сустрэчу «Искусство кисти» на базе дзіцячай бібліятэкі. На сустрэчу з чытачамі быў запрошаны настаяцель храма Свяціцеля Мікалая Цудатворца в.Магільна іерэй Аляксей Шышко. Святар расказаў прысутным пра гісторыю

развіцця іканапіснай справы, пра тэхналогіі пісання абразоў і матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца пры пісьме.

Духоўна-асветніцкія цэнтры існуюць пры наступных цэнтральных бібліятэках вобласці: ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева», ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна», ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі», ДУ «Мядзельская цэнтральнай раённая бібліятэка імя Максіма Танка», ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы», Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы і інш. Кожны месяц тут праводзяць сустрэчы са святарамі храмаў, кансультацыі для карыстальнікаў па пытаннях выбару літаратуры, аказваецца дапамога ў пошуку і падборы неабходнай інфармацыі. Праводзяцца дні памінання розных святых. Так, у дзень памяці святой блажэннай Валянціны Мінскай у духоўна-культурным цэнтры бібліятэкі г. Дзяржынска была арганізавана выстава літаратуры. Усе жадаючыя маглі пазнаёміцца з выданнямі аб жыцці і духоўным подзвігу беларускай святой. У рамках дзейнасці цэнтра «Існасць» ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы» адбыліся паломніцкія паездкі: «Праваслаўныя манастыры Беларусі» – у манастыр Ксеніі Пецярбургскай ў Баранi; «На святой Пачаеўскай зямлі» – ва Украіну; «Па шляхах прававаслаўнай Беларусі», цыкл – у храм Архангела Міхаіла в. Сынкавічы Зэльвенскага раёна, ва Успенскі мужчынскі манастыр у Жыровіцах, да крыніцы ў Сынкавічах і Жыровіцах, у Ляданскі Благавешчанскі мужчынскі манастыр, да магілы Валянціны Мінскай, да Вітаўскай крыніцы, у Свята-Елісавецінскі жаночы манастыр, на мужчынскае падвор’е манастыра.

Кожная бібліятэка Мінскай вобласці праводзіць тыдні праваслаўнай кнігі, у якіх абавязкова ўдзельнічаюць прадстаўнікі духавенства. ДУК «Барысаўская цэнтральная бібліятэка імя І. К. Каладзеева» правяла выязныя

мерапрыемствы на базах сельскіх бібліятэк Барысаўскага раёна. Быў прадстаўлены вусны часопіс «Священное, древнее, вечное», адбыліся агляды праваслаўнай літаратуры і гутаркі са святарамі. Чытачам прапанавалі сацыяльныя відэаролікі: «Поколение», «Твори добро», «Бирюзовое ожерелье».

Пры падтрымцы ДУК «Вілейская раённая бібліятэка імя Г. Новік» у Крывасельскай і Любанскай сельскіх бібліятэках прайшлі гадзіны праваслаўя «Біблейскія сюжэты ў літаратуры і мастацтве». У Людвіноўскай сельскай інтэграванай бібліятэцы адбылася літаратурна-музычная гасцёўня «И лик святой нам душу греет», да ўвагі чытачоў прапанавалі выставы праваслаўнай кнігі, падрыхтаваныя бібліятэкарамі.

Напярэдадні Дня праваслаўнай кнігі ў духоўна-культурным цэнтры ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» прайшла сустрэча моладзі са святаром Свята-Пакроўскай царквы г. Дзяржынска айцом Паўлам (Сенкевічам). Удзельнікамі мерапрыемства сталі вучні 10-га класа ДУА «Сярэдняя школа №2».

ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка» і ДУК «Крупская раённая бібліятэка імя Я. Купалы» прадставілі кніжныя і кніжна-ілюстрацыйныя выствы: «Шлях да духоўнасці», «Душу исцелит добро», «Медовый спас пришёл к нам в гости», «Дарога да духоўнасці». Адбыліся таксама наступныя мерапрыемствы: гадзіна дабрыні «Падзяка жыццё упрыгожвае» (Халопеніцкая гарпасялковая бібліятэка Крупскага раёна) інфармацыйна-краязнаўчая гадзіна да Дня памяці Пастэрнацкага Уладзіміра «Святы новапакутнік Беларускай праваслаўнай царквы» (Печанская сельская бібліятэка Капыльскага раёна).

Да Дня праваслаўнай кнігі ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча» падрыхтавала інфармацыю «Кніга ў гісторыі і культуры праваслаўнага славянства». На выставе «Кнігі веры і святла» былі прадстаўлены казанні і жыцці святых. На радыё

Маладзечна на працягу года вёўся цыкл перадач «Святыні храмаў Маладзечаншчыны», прысвечаны праваслаўным святым, часцінкі мошчаў якіх знаходзяцца ў маладзечанскіх храмах.

За справаздачны перыяд прагучала 11 радыёперадач: «Св. мученик Вонифатий», «Св. Апостол Андрей Первозванный», «Св. Фиодор Тирон», «Св. Лука Крымский», «Мария Египетская», «Александр Невский – благоверный князь», «Св. мученик Трифон», «Преп. Корнелий Крипецкий», «Житие муч. Христины Тирской», «Преп. Амфиохий Почаевский» і «Св. Феофан Затворник».

Літаратурная гульня «Адчыні сэрца для дабрыні» прайшла ў сельскай бібліятэцы Турэц-Баяры Маладзечанскага раёна. Падчас мерапрыемства школьнікі ўзгадвалі прымаўкі пра дабрыню, гулялі ў гульню «Казачны герой – добры і злы». А Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка прапанавала прэзентацыю «Вера. Знание. Книга».

Бібліятэкары ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» ў рамках акцыі «Услышь ребенка сердцем» наведалі нядзельную школу пры храме Пакрова Прасвятой Багародзіцы в. Чыжэвічы, дзе пазнаёмілі навучэнцаў з прэзентацыяй «Дзень праваслаўнай кнігі» і прапанавалі паўдзельнічаць
у займальнай алфавіт-гульні «Праваслаўны слоўнік». Да мерапрыемства была аформлена кніжна-ілюстрацыйная выстава «Традыцыі. Духоўнасць. Адраджэнне».

Напярэдадні Дня памяці прападобнай Еўфрасінні Полацкай, які адзначаецца 5 чэрвеня, у чытальнай зале ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» адбылося мерапрыемства «Сілай духоўнай узвысіла Полацк», якое суправаджалася мультымедыйнай прэзентацыяй. Дэманстраваўся відэафільм «Евфросиния Полоцкая», дзейнічала кніжная выстава «Апякунка і нябесная заступніца зямлі беларускай». Бібліятэкі Любанскага раёна правялі шэраг мерапрыемстваў: урок духоўнасці «Пад зоркай Еўфрасінні Полацкай» (Урэцкая гарпасялковая бібліятэка-

філіял №1); выстава-аповед «Спеў аб Еўфрасінні» (Камунараўская сельская бібліятэка); караван гісторый «Дачка князя Ізяслава» (Кузьміцкая сельская бібліятэка); выстава-знаёмства «Еўфрасіння Полацкая ў мастацкай літаратуры» (Атраднаўская сельская бібліятэка); урок выдатнай асобы «Нябесная апякунка Беларусі» (Обчынская сельская бібліятэка); выстава-аповед «Спеў аб Еўфрасінні» (Камунараўская сельская бібліятэка) і інш.

ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча» правяла літаратурнае лато «Святая Еўфрасіння – аветніца Беларусі», а ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка» ў рамках маладзёжнага клуба «Субяседнік» – пазнавальную гадзіну «Еўфрасіння – светач зямлі беларускай». Бібліятэкар расказала школьнікам пра жыццё Еўфрасінні Полацкай і яе духоўную спадчыну, пра тыя месцы і гарады Беларусі, дзе захоўваецца памяць пра яе. Да мерапрыемства была аформлена выстава аб жыцці Святой зямлі Беларускай.

Асобнае месца ў развіцці духоўна-выхаваўчага напрамка займаюць клубы, якія дзейнічаюць не толькі пры цэнтральных, але і гарпасялковых, і сельскіх бібліятэках.

Удзельнікі літаратурнага клуба «Выток», які існуе пры ДУ«Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», маюць добры кантакт з протаіерэем Свята-Мікалаеўскай царквы ў в. Станькава Аляксандрам Мікіцкім. ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» працягвае працу клуба «Восхождение», у рамках якога праводзіцца шмат мерапрыемстваў: тэатралізаваная забаўка «Масленіца – старажытнае славянскае свята», вечар-віншаванне творчых людзей «Пра Жодзіна з любоўю», гутарка з бацюшкам «У чым сэнс жыцця чалавека».

Разнастайныя мерапрыемствы адбыліся ў сельскіх бібліятэках Мядзельскага раёна. У рамках клуба «Надзея» (Занарацкая сельская бібліятэка) у цёплай атмасферы прайшлі пасядзелкі «Добрым людзям усе мы рады – будзем святкаваць Каляды», людзі паважанага ўзросту за святочным сталом

ўспаміналі абрады і традыцыі святкавання. У Баярскай сельскай бібліятэцы-доме вольнага часу паспяхова працуе клуб аматараў духоўнай песні «Святло душы». На мясцовых могілках сябры клуба праводзяць традыцыйны Дзень памяці продкаў «Запалім свечку на ўспамін» разам са святаром, а таксама заўсёды дапамагаюць у правядзенні святой Імшы за памерлых.

У клубе «Ноеў каўчэг» ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы» правялі наступныя мерапрыемствы: гадзіны абмеркавання «Каштоўнасці зямныя і нябесныя»; «Здароўе духоўнае і фізічнае»; урокі духоўнасці «Праваслаўная царква ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны; «Аб галоўнай Кнізе Жыцця»; літаратурна-мастацкую імпрэзу «Распісваючы храмы, або Неба, расквечанае жыццём» з удзелам жывапісца і скульптара Алега Пракарыны; майстар-клас па іканапісе «Адраджэнне святыні» ад выкладчыка Нясвіжскага дзяржаўнага каледжа імя Якуба Коласа, мастака Алега Пракарыны. 25 студзеня 2018 года, у дзень святой Таццяны, Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка прэзентавала ўдзельніцам клуба «Чысты чацвер» духоўна-асветніцкую праграму «Дакрананне да вечнасці», якую падрыхтаваў калектыў Светлаборскага сельскага дома культуры. Аўтар праграмы закранула ў сваім выступе самыя хвалюючыя пытанні для кожнага чалавека: навошта я нарадзіўся, для чаго жыву і для чаго прыйшоў у гэты свет? А ўдзельнікі клуба «Берагіня» Свіслацкай гарпасялковай бібліятэкі Пухавіцкага раёна падчас духоўнай вечарыны «Крещенские вечера» ўспаміналі традыцыі продкаў. Яны ў кожнай мясцовасці розныя, але духоўны сэнс адзіны для ўсіх. Зусім нядаўна пачаў працаваць клуб для дарослых «Свяча» ў Языльскай сельскай бібліятэцы Старадарожскага раёна. Ужо праведзены наступныя мерапрыемствы: гадзіна цікавых паведамленняў «Рождественские обычаи разных стран»; гадзіна праваслаўя «Покров Пресвятой Богородицы»; мультымедыйныя прэзентацыі «Православие – путь к сердцу»; «Чудотворные иконы»; «По святым местам»;

гадзіна духоўнасці «Узы православия»; гадзіна-дыялог «Прикосновение к вечности»; духоўная гасціная «Льются звуки жизни; счастья и добра» і інш.

### *Прававое выхаванне*

Бібліятэкі вобласці, выконваючы сёння функцыю інфармацыйна-прававых цэнтраў у сваёй мясцовасці, праводзяць значную работу, накіраваную на павышэнне ўзроўню прававой культуры насельніцтва: забяспечваюць доступ да прававой і сацыяльна значнай інфармацыі, распаўсюджваюць прававыя веды.

Барысаўскі раён з мэтай стварэння эфектыўнай сістэмы прававой асветы распрацаваў і паспяхова рэалізуе праект «Библиотека. Общество. Право», які садзейнічае павышэнню прававой культуры і юрыдычнай адукаванасці грамадзян.

У бібліятэках Вілейскага раёна прайшла асветніцкая акцыя «Детство: зона повышенного внимания». Акцыя накіравана на супрацьдзеянне жорсткаму абыходжанню з дзецьмі і гвалту ў сям'і. Чытачы азнаёміліся з буклетамі, інфармацыйнымі лістоўкамі па гэтай тэме і атрымалі кансультацыі.

Прафілактычная міжведамасная акцыя «Дружим с законом!» праводзіцца ў рамках комплекснага плана мерапрыемстваў па прафілактыцы безнагляднасці, правапарушэнняў непаўналетніх, абароне правоў і законных інтарэсаў непаўналетніх у Мінскай вобласці.У бібліятэках былі праведзены разнастайныя мерапрыемствы.

Гадзіна прававых ведаў «Твае правы, падлетак» прайшла ў Язненскай сельскай бібліятэкі Вілейскага раёна для вучняў 7-8 класаў. Яны азнаёміліся з палажэннямі асноўнага закону дзяржавы – Канстытуцыі і з Канвенцыяй аб правах дзіцяці. Пасля азнаямлення з дакументамі чытачы адказалі на шэраг пытанняў. Выкананне цэлага шэрагу

практычных заданняў дазволіла падлеткам досыць глыбока і сур’ёзна засвоіць тэкст дакументаў.

У Сейлавіцкай інтэграванай сельскай бібліятэцы Нясвіжскага раёна была праведзена гадзіна прававой адукацыі «Законы будем уважать, свои права мы будем знать».

На мерапрыемства былі запрошаны вучні 7-11 класаў НПК «Сейлавіцкі дзіцячы сад-сярэдняя школа». Вядучыя мерапрыемства разам з школьнікамі звярнуліся да Канстытуцыі РБ і Канвенцыі аб правах дзіцяці, дзе запісаны правы непаўналетніх. Вучні азнаёміліся з прававымі нормамі нашай дзяржавы, асаблівасцямі прававога рэгулявання сямейных, працоўных і грамадзянскіх адносін. Была праведзена сустрэча навучэнцаў з старшым лейтэнантам Нясвіжскага РАУС Валерыем Сяргеевічам Беланам, які на прыкладах з жыццёвых сітуацый расказаў школьнікам аб іх правах, абавязках і аб ступені віны і адказнасці падлеткаў за тыя ці іншыя правапарушэнні, а таксама пазнаёміў вучняў з асноўнымі дакументамі, на падставе якіх дзеці могуць быць прыцягнутымі да адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасці – Крымінальным кодэксам РБ, Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Конкурсная праграма «Закон и правопорядок» адбылася ў Навадворцаўскай сельскай бібліятэцы-філіяле №30 Слуцкага раёна. Дзве каманды вучняў 8-9 класаў «Фемида» і «Уголовный кодекс» заўзята спаборнічалі ў конкурсах «Размінка», «Ці ведаеце закон?», «Злачынства і пакаранне», «Ці заўсёды маюць рацыю старэйшыя?».

У рамках акцыі былі праведзены: турнір знаўцаў «Твае правы ад А да Я», сустрэча з загадчыцай Грычынскага ФАП Надзеяй Аляксандраўнай Грыкень «Дзяцінства ў зоне рызыкі», сустрэча са старшым інспектарам ДПС горада Мінска Мешычам Мікалаем Валер'евічам «Прававыя сітуацыі ў пытаннях і адказах» (Дзяржынскі раён); круглы стол «Адміністрацыйная і крымінальная адказнасць

непаўналетняга», гутарка-абмеркаванне «Закон у маім жыцці», гадзіна правазнаўства «Маю права на правы», інтэлектуальна-пазнавальная праграма «Сябруем з законам», квэст «Вучуся быць грамадзянінам» (Клецкі раён); актуальны дыялог «NO PROBLEM?! Молодежные проблемы в контексте современности», прававая інфармгадзіна «Законы ведаць неабходна» (Мінскі раён).

Ва ўсіх бібліятэках адбыліся мерапрыемствы, якія садзейнічалі павышэнню ўзроўню прававой культуры, фарміраванню пачуцця годнасці, самапавагі, грамадзянскай адказнасці, прафілактыцы безнагляднасці і злачынстваў сярод непаўналетніх.

17 траўня супрацоўнікі гарадской бібліятэкі №1 Барысаўскага раёна арганізавалі сустрэчу навучэнцаў УА «Барысаўскі дзяржаўны каледж» з участковым інспектарам ІСН Барысаўскага РУУС Дар'яй Карпека на тэму: «О ложной романтике и уголовном кодексе». Інспектар праінфармавала ўдзельнікаў мерапрыемства аб асноўных правапарушэннях, якія здзяйсняюць падлеткі, і абазначыла супрацьпраўныя дзеянні, за якія належыць крымінальная адказнасць.

Гадзіна праблемнай гутаркі для моладзі «Вуліца. Сям’я. Падлетак» – прайшла ў Энергетыкаўскай сельскай бібліятэцы Дзяржынскага раёна. Яе мэта – фарміраванне прававой свядомасці і прававой культуры моладзі, знаёмства з правамі і свабодамі грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Праграму гадзіны прававых ведаў «С детства знай свои права» для вучняў 7 класа ў Лясноўскай сельскай бібліятэцы Капыльскага раёна складалі раздзелы: «Канстытуцыя», «Правы і свабоды грамадзян», «Твой узрост – твае правы».

24 лістапада ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» сустракала навучэнцаў 6-х класаў сярэдняй школы № 5. Тэма сустрэчы – прафілактыка правапарушэнняў сярод непаўналетніх. Дзеці актыўна ўдзельнічалі ў гульні-дыялогу «Я сам несу ответственность за свои поступки»:

адказвалі на пытанні, разбіралі тыповыя сітуацыі, вызначалі віды адказнасці за розныя правапарушэнні. Школьнікі наведалі Публічны цэнтр прававой інфармацыі, пазнаёміліся з дзіцячым прававым сайтам, дзе можна знайсці адказы на любыя пытанні.

Прайшлі мерапрыемствы для розных катэгорый карыстальнікаў: прававое кола «Ведай свае правы», інфармацыйна-прававы трэнінг «З законам на Вы», віртуальнае падарожжа па старонках дзіцячага прававога сайта «Закон обо мне и мне о законе», інфармацыйна-прававы экскурс «Нет прав без обязанностей» (Слуцкі раён); дзень прававых ведаў «Канстытуцыя гарантуе», бібліяпрэзент «Знакомимся с основным законом государства», відэапрэзентацыя «Закон і я» (Смалявіцкі раён); інтэлектуальная гульня «Путешествие в страну прав и обязанностей», электронная прэзентацыя «Закон и я», ток-шоу «Разрешённое и запрещённое», дыскусія «Я – человек, потому что имею право», гістарычнае падарожжа «Права ребенка: от истоков к настоящему», дыскусійныя арэлі «Добро и зло: причины наших поступков» (Старадарожскі раён).

Асаблівая ўвагу бібліятэкі вобласці надавалі рабоце з непаўналетнімі на розных формах прафілактычнага ўліку. Прайшлі наступныя мерапрыемствы: агіт-марафон «Не зламай свой лёс!», акцыі «Чужое ўзяў – свой лёс зламаў», «З кім павядзешся – ад таго і набярэшся», «Бруд на языку – бруд у душы», «Дрэнныя кампаніі абыходзь стараной, каб не здарылася бяды ліхой» (Бярэзінскі раён); урок прававых ведаў «Чалавек. Грамадства. Закон», лекцыя «Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь», віктарына «Знатоки права», урок прававых ведаў «Абыякавасць – шлях да злачынства», віртуальная гадзіна «Дзіцячы прававы свет», інфармацыйная гадзіна «Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь», круглы стол «Подросток. Правонарушение. Ответственность» (Вілейскі раён); дыскусійнная гадзіна «У чым сэнс жыцця», прававы трэнінг «Якім быць і як жыць», гадзіна-дыялог «Мир

подростка: интересы, проблемы», дыспут «Здаровае пакаленне нашага часу» (Крупскі раён); гадзіна прававых ведаў «Аб правах і свабодах – цікава і проста», віктарына «Правы літаратурных герояў у казках», прававая гадзіна «Большие права маленьким детям», урок прававой адукаванасці «Твой компас у свеце права» (Мядзельскі раён).

У гонар святкавання Дня яднання народаў Расіі і Беларусі ў бібліятэках вобласці адбыліся цікавыя мерапрыемствы.

У гарадской бібліятэцы №2 Барысаўскага раёна прайшла акцыя «Мамина сказка – маміна казка», падчас якой юныя чытачы ўспомнілі рускія і беларускія прыказкі, адгадвалі загадкі і з задавальненнем паглядзелі лялечныя спектаклі «Сава і дзяцел» і «Крылатый, мохнатый, да масленый». Слайд-прэзентацыя расказала дзецям пра значэнне гэтага свята, пра падабенства народных культур і традыцый двух брацкіх народаў, пра шматвяковае братэрства.

У вобласці адбыліся таксама: знаёмства з альманахам «Созвучие. Беларусь – Москва», вусны часопіс «Дзве мовы – дзве сястры», віктарына «Две страны – одна судьба», вусны часопіс «Два языка стали близкими мне с детства», інфармацыйныя гадзіны «В единстве народов могущество державы», «Две сестры – Беларусь и Россия» (Барысаўскі раён); гадзіна паэзіі «Дружбой расцветает земля», гадзіна інфармацыі «Сяброўства краінамі», вусны часопіс «Дзве мовы сталі блізкімі мне змалку» (Вілейскі раён); віртуальная вандроўка ў гісторыю «Жыві і красуйся, мая Беларусь, у сястрынстве з Расіяй», літаратурная гадзіна «У нас адзіная планета – у нас адзіная сям'я» (Мінскі раён); эрудыт-азбука «Гэта ўсё мая Беларусь», інфармацыйныя гадзіны «Расія і Беларусь: агульная гісторыя, агульны лёс» (Стаўбцоўскі раён); вусны часопіс «Сугучча сэрцаў: Беларусь і Расія», інфарміна «День единения народов Беларуси и России» (Жодзіна).

Штогод бібліятэкі Міншчыны прымаюць удзел у святочных мерапрыемствах, прысвечаных Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

У спецыялізаванай гарадской бібліятэцы № 5 для інвалідаў па зроку Барысаўскага раёна прайшоў гістарычны экскурс «Васильковая страна – это Родина моя». Бібліятэкар Таццяна Лях расказала прысутным пра гераічную барацьбу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пра шлях нашай дзяржавы да незалежнасці. У праграме мерапрыемства былі песні ў выкананні групы «Добрыя Вячоркі», відэафільм пра сучасную Беларусь і тэматычная кніжная выстава «Горжусь тобою, Беларусь».

У Каладзішчанскай сельскай бібліятэцы № 1 Мінскага раёна адбылася інфармацыйная гадзіна «Дзень памяці. Дзень гонару. Дзень Незалежнасці». На мерапрыемстве бібліятэкары расказалі пра асноўныя этапы развіцця Рэспублікі Беларусь як незалежнай дзяржавы, пра святкаванне Дня Незалежнасці. Асаблівую цікавай для наведвальнікаў была выстава «Я – грамадзянін Беларусі».

У Гатаўскай сельскай бібліятэцы-клубе Мінскага раёна прайшла прэзентацыя «Незалежная Беларусь – твар эпохі» – станаўленне беларускай дзяржаўнасці, сучасны стан развіцця краіны і яе дасягненні ў сацыяльна-эканамічнай, навуковай і культурнай сферах.

Таксама ў бібліятэках прайшлі: агіт-акцыя «За гонар маем звацца беларусамі», фальклорнае падарожжа «Беларускі скарб», патрыятычна-выхаваўчая гульня «Беларусь у маім сэрцы», акцыя-віктарына «Ты – беларус і заставайся ім!», сустрэча-дыялог «Беларусь – Швецыя» (Бярэзінскі раён); літаратурны OPEN-AIR «Гісторыя і сучаснасць», гадзіна гісторыі «Я. Мой дом. Мая Беларусь» (Вілейскі раён); літаратурна-музычная кампазіцыя «Квітней, красуй, дарагая Беларусь!», патрыятычная гадзіна «Квітней, мая Беларусь», гадзіна паэзіі «Беларусь мая, ты стала зноў прыгожай і свабоднай» (Мінскі раён); музычная дарожка «У песнях

славім Беларусь», відэа-ўрок «День независимости РБ – как исторический факт» (г. Жодзіна).

Да дня Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь у Завішынскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна была праведзена інфарміна «Наш герб і наш сцяг – гэта сімвалы свабоды». У Кузьміцкай сельскай бібліятэцы Любанскага раёна для вучняў 5–7 класаў правялі экспрэс-падарожжа «Сімвалы свабоды», якое знаёміла дзяцей з гісторыяй узнікнення Дзяржаўнага беларускага герба і сцяга. Чыталі вершы беларускіх паэтаў, прысвечаныя гербу і сцягу.

У бібліятэцы ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» адбылася паэтычная замалёўка для юных чытачоў «Мой край завецца Беларусь». Падчас мерапрыемства прысутным расказалі пра значэнне асобных элементаў дзяржаўных сімвалаў нашай краіны. Дапоўніла інфармацыю кніжна-ілюстрацыйная выстава «Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь». «

У бібліятэках прайшлі: акцыя «Красный, зелёный, белый», пазнавальныя гадзіны «Наш герб и наш флаг – это символы свободы», «Белорусская символика», «Символы нашей гордости», «История страны, история символов» (Барысаўскі раён); інфармацыйная гадзіна «Дзяржаўныя сімвалы нашай краіны» (Вішнеўская сельская бібліятэка Валожынскага раёна); вусны часопіс «Ганарымся сімваламі Беларусі», урок-падарожжа «Беларусь – краіна маёй будучыні», гістарычная гадзіна «Наш герб і сцяг – сімвалы свабоды» (Дзяржынскі раён); інфарміна «Наш герб і наш сцяг – гэта сімвалы свабоды», гадзіна інфармацыі «Тры сімвалы роднай дзяржавы: герб, сцяг, гімн», інфарміна «Сімвалы нашай Радзімы» (Лагойскі раён); літаратурны дыялог «Беларусь мая сінявокая», гадзіна інфармацыі «Эмблема працы і стварэння», гульня-віктарына «Дзяржаўныя сімвалы Беларусі» (Любанскі раён); пазнавальныя і інфармацыйныя гадзіны «Три главных символа нашей страны», «Галоўныя сімвалы нашай дзяржавы», гадзіна карыснай інфармацыі

«В символах Беларуси история страны», гульня-конкурс «Ведаю і ганаруся» (Уздзенскі раён).

Гародзькаўская сельская бібліятэка Валожынскага раёна да Дня канстытуцыі правяла для моладзі і падлеткаў мерапрыемства «Я – человек, поэтому имею права». Бібліятэкар расказала пра галоўны дакумент дзяржавы – Канстытуцыю, на мерапрыемстве школьнікі даведаліся аб асноўных правах і абавязках грамадзяніна РБ.

У ЦПІ Плешчаніцкай гарпасялковай бібліятэкі Лагойскага раёна праводзілася інфарміна «Канстытуцыя – гарант свабоды чалавека і грамадзяніна».

У Гатаўскай сельскай бібліятэцы-клубе Мінскага раёна на інфармацыйнай гадзіне «Канстытуцыя – асноўны закон дзяржавы» падлеткі зрабілі невялікі экскурс у гісторыю станаўлення Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Затым хлопцы і дзяўчаты актыўна ўдзельнічалі ў дыялогу паводле атрыманай інфармацыі, абмяркоўвалі кнігі падрыхтаванай бібліятэкарам тэматычнай выставы, а таксама з цікавасцю рашалі крыжаванку па гэтай тэме.

У Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у бібліятэках былі праведзены наступныя мерапрыемствы: інфармацыйная гадзіна «По Конституции живёт моя страна», інтэлектуальна-прававая гульня «Закон и ты», прававая гадзіна «Закон, по которому мы живём», патрыятычная старонка «Мы – маленькие граждане Беларуси» (Барысаўскі раён); прававое дасье «Галоўны закон жыцця краіны», інфармацыйная гадзіна «Дзень Канстытуцыі» (Валожынскі раён); урок радзімазнаўства «Карані нашай дзяржаўнасці», гістарычная вандроўка «Беларусь мая, родны край», гутарка «Гонар народа – Канстытуцыя» (Вілейскі раён); дзень інфармацыі «Жыць па Канстытуцыі», інфарміна «Канстытуцыя – аснова прававой адукаванасці», інфармацыйная гадзіна «Чалавек. Дзяржава. Закон», гутарка «Мір нашых правоў і абавязкаў» (Лагойскі раён); інфармацыйныя гадзіны «Правы і абавязкі ў тваім жыцці», «Я – маю права і я – абавязаны», «Подростки и закон:

изучаем, знаем, соблюдаем» (Уздзенскі раён); зварот «Закон, по которому нам жить», пазнавальная віктарына «Путешествие в страну прав и обязанностей», прававы турнір «Основной закон нашей жизни» (г. Жодзіна).

У 2018 годзе ў Беларусі прайшлі выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў 28-га склікання.

Гутарка кандыдата ў дэпутаты ў Мінскі абласны Савет дэпутатаў Цітуленка Т.Ч. з моладдзю «Насустрач свайму будучаму» адбылася 21 студзеня ў ДУК «Вілейская цэнтральная бібліятэка ім. Г. Новік». Моладзь актыўна абмяркоўвала пытанні мясцовага кіравання і самакіравання. Да сустрэчы была падрыхтавана кніжна-ілюстацыйнай выстава «Наш выбар – наша пазіцыя», якая ўтрымлівала Выбарчы кодэкс РБ і каментарыі да асобных яго раздзелаў, інфармацыю аб выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў, інфармацыю аб кандыдатах у дэпутаты Мінскага абласнога Савета дэпутатаў

У ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка» на базе цэнтра прававой інфармацыі прайшоў адкрыты дыялог «Моладзь і выбары» з абмеркаваннем наступных пытанняў: наколькі актыўна сучасная моладзь ўдзельнічае ў палітычным жыцці краіны, выбарчых кампаніях; якую ролю ў палітычнай сацыялізацыі маладых людзей могуць адыграць грамадскія аб’яднанні і ўстановы адукацыі.

У ходзе перадвыбарнай кампаніі ў бібліятэках адбыўя шэраг мерапрыемстваў: выбарчы практыкум «Зрабіць выбар – твой доўг, тваё права», экспрэс-апытанне «Выбарчая культура моладзі», трыбуна меркаванняў «Ты – грамадзянін, а гэта значыць...», памятка ў дапамогу маладому выбаршчыку «Што ты ведаеш пра выбары?» (Барысаўскі раён); практыкум «Мы выбираем будущее» (Іжская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна); інфармацыйныя гадзіны «Выбары дастойных у інтарэсах народа», «Выбаршчык – твае правы і абавязкі», «Зрабіць выбар: твой абавязак і права» (Лагойскі раён); інфармацыйная гадзіна «Школа молодых избирателей», інфармацыйны куток «Голосую за свое

будущее: Выборы в местные Советы депутатов Республики Беларусь двадцать восьмого созыва в зеркале прессы», куток выбаршчыка «Твая будучыня – у тваіх руках», агляд перыёдыкі «Выбары па старонках газет», гадзіна прававой інфармацыі «Дзень маладога выбаршчыка», гутарка-наказ «Пажаданне маладым выбаршчыкам», інфармацыйная гутарка «Нашы кандыдаты ў дэпутаты», гутарка «Насустрач выбарам» (Мінскі раён); дні інфармацыі «Для вас, выбаршчыкі», «Выбары – важная палітычная падзея нашага жыцця», хвіліна прававой інфармацыі «Гэта трэба ведаць», інфармацыйны агляд «В местные Советы выберем достойных», сустрэча выбаршчыкаў з кандыдатам ў дэпутаты Пухавіцкага раённага Савета дэпутатаў Савасцюк Вольгай Уладзіміраўнай «Нам жить, нам выбирать!» (Пухавіцкі раён).

### *Экалагічная асвета*

Экалагічная асвета набывае першараднае значэнне для паспяховага развіцця сучаснага грамадства. Інфармацыйнае забеспячэнне гэтага важнага аспекта ў сацыяльным жыцці з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці бібліятэк Мінскай вобласці. Бібліятэкі знаходзяць і выкарыстоўваюць змястоўныя і цікавыя формы працы ў выхаванні экалагічнай свядомасці насельніцтва, прывіцці беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя.

У Барысаўскім раёне працаваў праект «Прикоснись к природе сердцем», мэта якога – фарміраванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту асноў экалагічнай культуры і адказнасці за захаванне жывой прыроды; павышэнне цікавасці да літаратуры экалагічнай тэматыкі.

Сістэмны і паслядоўны характар экалагічнай адукацыі і выхавання забяспечвае мэтавая праграма «Бібліятэка і экалогія» (2017-2019 гг., ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка»). Праграма ўзгоднена з інспекцыяй

прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Валожынскага райвыканкама.

Бібліятэкі Вілейскага раёна працуюць ў рамках праграмы «Захаваем наваколле разам» (2010–2019 гг.). У Мінскім раёне праца вядзецца ў рамках доўгатэрміновай рэгіянальнай мэтавай праграмы «Экалогія. Бібліятэка. Чалавек» (2017-2021 гг.).

Мядзельская раённая дзіцячая бібліятэка здзяйсняе мэтавую праграму «Наш экадом – Мядзельшчына» (2016–2020 гг.), якая дае магчымасць дзецям папоўніць свае веды пра шматграннасць жывой прыроды, яе жывёльны і раслінны свет. Праграма знаёміць з праблемамі урбанізацыі, паказвае шляхі выхаду з экалагічнага тупіка.

Сістэматычнасць працы ў экалагічным кірунку бібліятэк Старадарожскага раёна забяспечваюць мэтавыя праграмы «Жить в согласии с природой», «Открой для себя мир природы», «Мир вокруг нас». Вішнявецкая бібліятэка Стаўбцоўскага раёна працуе па мэтавай праграме экалагічнага выхавання насельніцтва «Прырода – наш дом».

У ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя. І.Х. Каладзеева» прайшоў экалагічны адукацыйны трэнінг «Экодружественность ближе, чем ты думаешь». Удзельнікаў мерапрыемства праінфармавалі аб экалагічных праблемах і безадходнай вытворчасці, правялі віктарыну, а затым прапанавалі прысутным адлюстраваць на паперы сваё бачанне вырашэння экалагічных праблем. У канцы трэнінгу быў прадэманстраваны тэматычны дакументальны фільм.

Гадзіна карысных парад «Экалогія ў нас дома», якая мела мэтай фарміраванне экалагічнай культуры і экалагічнай свядомасці ў людзей старэйшага ўзросту, адбылася ў Скірмантаўскай сельскай бібліятэцы Дзяржынскага раёна. Удзельнікі мерапрыемства даведаліся аб небяспечных прадметах, якія нельга лічыць карыснымі для нашага здароўя, і нават змаглі замацаваць веды, адказваючы на пытанні віктарыны.

Бараўская інтэграваная бібліятэка Дзяржынскага раёна запрасіла ўсіх жадаючых адправіцца ў віртуальнае падарожжа «Я весенний ручеёк, пробегу я сто дорог». Удзельнікі падарожжа даведаліся, што такое «блакітныя дарогі Зямлі», адкрылі для сябе таямніцы маленькіх ручайкоў, з якіх пачынаюцца вялікія рэкі. Кніжкі-чамучкі, прадстаўленыя на кніжнай выставе, дапамаглі дзецям знайсці адказы на пытанні: «Колькі вады на Зямлі?», «Чаму вада цэніцца даражэй за золата?», «Ці можна пражыць без вады?», «Як вада трапляе ў наш дом і чаму яе трэба берагчы?». Завяршылі мерапрыемства віртуальным відэападарожжам у музеі вады Масквы і С-Пецярбурга.

Супрацоўнікі залы літаратуры на замежных мовах ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча» правялі інфармацыйна-пазнавальную гадзіну аб ахове прыроды «Свет раслін: ахова экалогіі», у якой гаварылі пра флору і фаўну нашай планеты. Вучні паглядзелі пазнавальны фільм пра расліны, якія дораць нам радасць. Удзельнікі мерапрыемства абмяркоўвалі экалагічныя праблемы, чыталі вершы пра прыроду, удзельнічалі ў віктарыне. Пераможцам уручылі невялікія прызы.

У Мачулішчанскай пасялковай бібліятэцы Мінскага раёна прайшла экагадзіна «Падарожжа ў Энэргалэнд». У «падарожжы» дзеці даведаліся, што такое энергія і энэргазберажэнне, якія віды энергіі нам вядомы, для чаго неабходна энэргія, як беражліва расходваць энэргію і яшчэ шмат цікавага і займальнага. Дзеці актыўна разгадвалі электракрыжаванку, адказвалі на пытанні віктарыны і тэстаў.

Ва ўсіх бібліятэках вобласці прайшлі мерапрыемствы, якія садзейнічаюць папулярызацыі экалагічных ведаў сярод чытачоў. Найбольш карыснымі і запатрабаванымі карыстальнікамі былі: судова-экалагічная гульня «Прырода просіць паратунку», акцыя «Добрыя справы багушэвіцкага лесавічка» (Бярэзінскі раён); экалагічная гадзіна «Прырода Беларусі – невядомае, нечаканае, неверагоднае», забаўляльна-пазнавальная праграма «Экалагічнае асарці», літаратурны

куфэрак «Звяры, птушкі і букашкі на старонках дзіцячых кніг», блуканні ў бібліялабірынце «Прырода з характарам» (Вілейскі раён); віртуальны экаваяж «Запаведны напеў зямлі беларускай», гадзіна «Экалогія ў нас дома», эрудыцыён «Смецце – монстр цывілізацыі» (Дзяржынскі раён); экалагічная гульня «Прырода – наш бясцэнны дар», экалагічная вандроўка «Не шкодзь прыродзе, жыві з ёй у згодзе», экаасарці «Крылатые друзья» (Клецкі раён); экалагічныя чытанні «Сем старонак пра звяроў і птушак», лірычная кампазіцыя «Вальс кветак», экавіктарына «Цветами мир благоухает», урок экалагічных ведаў «Не шкодзь прыродзе – жыві з ёй у згодзе» (Любанскі раён); віртуальнае падарожжа «Запаведны напеў Белавежскай пушчы», квэст «Падарожжа ў казачны лес», круглы стол «Родная прырода – наша краса і гонар» (Маладзечанскі раён); экагадзіна «Чырвоная кніга Беларусі», інфармацыйная гадзіна «Не шкодзь прыродзе, жыві з ёй у згодзе», вандроўкі па родным краі «Блакітнае дзіва Беларусі», аукцыён ведаў «Увайдзі ў прыроду сябрам», экалагічная вандроўка «Красная книга – документ совести человека», экагадзіна «Зберагчы прыроду – захаваць Радзіму» (Мінскі раён); экалагічнае падарожжа «Таямніцы і загадкі прыроды», дзень экалагічных ведаў «Прыроду беражы, прыродай даражы», экалагічна–пазнавальная праграма «Планета цудаў» (Мядзельскі раён); віртуальная фотавыстава «Незвычайная экасістэма Беларусі», экалагічная мазаіка «Любите чудо из чудес: леса, озёра, синь небес», кніжная выстава-экспедыцыя «Жыхары блакітных прастораў», экалагічны рэпартаж «И звери и птицы на книжных страницах», экалагічны кнігамаршрут «Чудеса Белой Руси», экалагічная замалёўка «Сіні колер Зямлі», майстар-клас «В уходе за розой не бывает прозы» (Слуцкі раён); завочная экскурсія «В королевстве ледяной Антарктиды», пазнавальная гадзіна «Давайте, люди, к природе добрее будем», экалагічная гадзіна «Отходы – в доходы, или Что несет мусорный ветер?», конкурсная праграма «Чем деревья нам полезны?» (Чэрвеньскі раён).

12 красавіка ў рамках Міжнароднага дня птушак у дзіцячым аддзеле ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя. І. Х. Каладзеева» прайшла экалагічная слайд-гутарка з элементамі гульні «День птиц», падчас якой навучэнцы ДУА «Сярэдняя школа № 8 г. Барысава» даведаліся пра гісторыю свята. Затым вучні адказалі на пытанні экалагічнай віктарыны «Узнай пернатых» і пазнаёміліся з выставай кніг «Птицы города».

Супрацоўнікі ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» для вучняў 3-4 класаў СШ №2 правялі экалагічнае падарожжа «Птушка 2018 года – чорнагаловы шчыгол». Потым адбылася конкурсная праграма на лепшага знаўцу птушак. Хлопчыкі і дзяўчынкі ўдзельнічалі ў конкурсе прымавак, прыказак пра пярнатых.

У Шчэпіцкай сельскай бібліятэцы Клецкага раёна правялі майстар-клас па вырабу шпакоўняў «Вясна ідзе – вясне дарогу, шпакі ляцяць – ім новы дом».

У Акцябрскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна адбылося эколага-краязнаўчае падарожжа «Птушкі нашага краю, занесеныя ў Чырвоную кнігу». Бібліятэкар расказала дзецям, калі была заснавана Чырвоная кніга і якія звесткі яна ўтрымлівае, а таксама пра птушак, якія патрабуюць асаблівай увагі. Прысутныя даведаліся, як яны з’явіліся ў нас, хто іх ахоўвае і ад каго іх неабходна абараняць. У канцы мерапрыемства дзеці пазнаёміліся з выданнем «Чырвоная кніга Лагойшчыны», адказалі на пытанні віктарыны «Птушкі Беларусі».

У бібліятэках вобласці прайшлі: інтэлектуальна-пазнавальная гульня «Про птиц», пазнавальная гутарка «Певчие избранники», выстава работ удзельнікаў і прызёраў раённага конкурсу «Щегол – птица 2018 года» (Барысаўскі раён); слайд-агляд «Эти удивительные птицы» (Валожынскі раён); экалагічная гадзіна «Птушкі – нашы сябры» (Крупскі раён); выстава-віктарына «З птушынаю песняй неба жывое», віктарына «Будь другом природы, маленький человек» (Лагойскі раён); віктарынная карусель «Вестуны радасці

і вясны», пазнавальная гадзіна «Птушыныя гутаркі», інфармацыйная гадзіна «Птушкі побач з намі», пазнавальна-конкурсная праграма «Соседи по планете: птицы», пазнавальны ўрок «Птушкі нашага краю» (Любанскі раён); займальнае падарожжа «Птушкі Беларусі», экагульня «Мае пярнатыя сябры», экалагічнае вандраванне «Птушкі роднага краю» (Мінскі раён).

4 кастрычніка адзначаецца Міжнародны дзень абароны жывёл, а 30 лістапада – Дзень хатніх жывел. Мерапрыемствы гэтых дзён заклікаюць людзей звярнуць увагу на праблемы жывёльнага свету і абудзіць у кожным з нас спагадлівасць да братоў нашых меншых.

У ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Пранузы» прайшла экамазаіка «В мире животных». Бібліятэкар расказала дзецям аб неабходнасці беражлівых адносін да братоў нашых меншых і пра важнасць абароны навакольнага асяроддзя – месца пражывання жывёл. Навучэнцы 4 «А» класа ДУА «Сярэдняя школа №1 г. Нясвіжа» з вялікай цікавасцю прынялі ўдзел у конкурсах «Жывёлы – літаратурныя героі», «Народная мудрасць», «Прафесіяналы» і інш.

Бібліятэкары Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі правялі ўрок міласэрнасці і дабрыні «Меншыя, але з вялікім сэрцам», на якім паведамілі пра самыя кранальныя помнікі нашым братам.

У кастрычніку ў Алесінскай сельскай бібліятэцы Смалявіцкага раёна адбылася гутарка «Мы ў адказе за тых, каго прыручылі», прысвечаная Сусветнаму дню жывёл. На мерапрыемстве прысутнічалі вучні 2 класа Алесінскай САШ. Дзеці з задавальненнем апавядалі пра сваіх хатніх жывёлін. Бібліятэкар пазнаёміла сваю аўдыторыю з творам М.Твена «Рассказ собаки», чым выклікала моцныя эмоцыі ў прысутных. Усе разам абмеркавалі, як нельга абыходзіцца з жывёламі. У канцы сустрэчы дзецям былі прапанаваны кнігі пра жывёл.

У бібліятэках вобласці былі праведзяны: акцыя «Пакармі нічыйнага ката (сабаку)», урок дабрыні «Жывое любіць – добрым быць», калейдаскоп цікавай інфармацыі «Браты нашы меншыя» (Бярэзінскі раён); вандроўка «Жить теплей, когда с тобою рядом существо живое», віктарына «Знаўцы прыроды», ўрок дабрыні «Мир птиц и зверей ждёт поддержки от друзей» (Лагойскі раён); медыяпадарожжа «Памятники животным» (Нясвіжскі раён) кнігадэбют па кнізе Міколы Бусько «У бары жывуць сябры», літаратурная гадзіна «Мы ў адказе за тых, каго прыручылі», экалагічная гадзіна «Дзікія, хатнія – усе такія розныя» (Пухавіцкі раён); дзень экалагічнай кнігі «Па старонках Чырвонай кнігі Беларусі», дзень экалагічнай адукацыі «Экология и человек», экалагічныя марафоны «Вечная прыроды прыгажосць», гадзіна экалагічных ведаў «Пачатак усяму – зямля бацькоў», біяінфарміна «Будь лесу другом», інтэлектуальная гульня «Гэтыя забаўныя жывёлы», экалагічная вандроўка «Свет запаведнай прыроды» (Смалявіцкі раён); гадзіна зносін «Доброта спасет мир», інфарміна «Всемирный день домашних животных», урок дабрыні «Мы в ответе за тех, кого приручили», пазнавальная гадзіна разважання «За верность и преданность – памятники животным» (г. Жодзіна).

Да Сусветнага дня аховы навакольнага асяроддзя для маленькіх чытачоў у Сцешыцкай сельскай інтэграванай бібліятэцы Вілейскага раёна была праведзена экалагічная гадзіна «Прырода Беларусі – невядомае, нечаканае, невераГоднае» і забаўляльна-пазнавальная праграма для дзяцей малодшага школьнага ўзросту «Экалагічнае асарці».

Бібліятэкары Лагойскай дзіцячай бібліятэкі запрасілі школьнікаў здзейсніць літаратурнае падарожжа пад назвай «Запаведнікі Беларусі ад А да Я». Падчас падарожжа ўдзельнікі адкрылі для сябе непаўторны свет флоры і фаўны Беларусі.

У Крывіцкай пасялковай бібліятэцы Мядзельскага раёна адбылася экалагічная гульня-падарожжа «Няхай квітнее наша зямля». Мерапрыемства праводзілася з мэтай

пашырыць веды дзяцей аб прыродзе роднага краю, выхаваць беражлівыя адносіны да ўсяго жывога. Падчас падарожжа ўсе прысутныя ўдзельнічалі ў віктарыне «Цікава пра пярнатых», даведаліся пра расліны, птушак і звяроў, занесеных у Чырвоную Кнігу.

У бібліятэках былі паведзены: інфармацыйная гадзіна «Што мы ведаем пра сабак», літаратурная гадзіна «Люблю цябе і слухаю, прырода», тыдзень экалагічных ведаў «Сябруй з прыродай» (Лагойскі раён); экодайджест «Чудеса растительного царства», экалагічны дыліжанс «Чудеса растительного царства», конкурс «Грибные загадки» (Салігорскі раён); інфармацыйная гадзіна «Международный день охраны окружающей среды», відэаагляд электронных рэсурсаў бібліятэкі «Драгоценный дар природы» (г. Жодзіна).

Да Сусветнага дня Зямлі у ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя. І. Х. Каладзеева» для трэцякласнікаў ДУА «Сярэдняя школа №23 г. Барысава» прайшла экагадзіна «Вораг планеце – смецце». Бібліятэкар Алена Токарава расказала аб праблеме забруджвання і росце велізарных звалак на планеце. На яркіх слайдах прэзентацыі хлопцы ўбачылі, што наша планета ў небяспецы, і калі так будзе працягвацца, Зямля стане велізарнай кучай смецця. У ходзе мерапрыемства школьнікі вырашалі экалагічныя задачы, прымалі ўдзел у конкурсе «Рассортируй мусор по контейнерам», агучвалі па ролях казку «Путешествие к Лесовичку» і пазнаёміліся з новай кнігай Ірыны Токаравай «Умные контейнеры, или Тим против монстра Сорму».

У Тучанскай сельскай бібліятэцы Клецкага раёна прайшла экалагічная акцыя «Беражыце зямлю, беражыце». Падчас мерапрыемства ўдзельнікі даведаліся шмат цікавай інфармацыі пра любімыя расліны, пазнаёміліся з фондам прыродазнаўчай літаратуры, адказалі на пытанні займальнай віктарыны. А яшчэ ў гэты дзень бібліятэкар дарыла наведвальнікам сумныя і адзінокія кактусікі, якія, трапіўшы ў новы дом, адчуўшы клапатлівыя адносіны да сябе, будуць

радаваць гаспадароў і напамінаць аб тым, што патрэбна любіць і шанаваць усё жывое навокал.

Экалагічная экспедыцыя «Есть прекрасная планета под названием Земля» прайшла ў Сямкоўскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна. Спачатку ўдзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з літаратурай аб прыродзе, а потым адправіліся ў экспедыцыю па навакольных мясцінах: наведалі гняздо бусла, потым прайшлі ўздоўж ракі і завіталі ў лес, дзе назіралі за раслінамі, дрэвамі, насякомымі.

Супрацоўнікі бібліятэк вобласці правялі шмат мерапрыемстваў, сярод якіх: экалагічнае падарожжа «Хто жыве ў высокай траве?», пазнавальная гутарка–віктарына «Рознакаляровая зямля Беларусі» (Вілейскі раён); экалагічная гадзіна «Давайце берагчы Зямлю», дзень інфармацыі «Таямнічы свет прыроды», экалагічная гульня «Пра жыхароў нашых лясоў», вандроўка ў прыроду «На гэтай зямлі жыць мне і табе» (Лагойскі раён); урок-назіранне «У лёсе прыроды наш лёс», дзень экалагічнай інфармацыі «Святло роднай прыроды», экалагічны час «Гэта зямля твая і мая», віртуальнае падарожжа «Планета цудаў і загадак», экалагічнае лата «Калейдаскоп зямной прыгажосці», гульнёва-пазнавальная праграма «Путешествие капельки» (Любанскі раён).

Да Дня Чарнобыльскай трагедыі сумесна са Скірмантаўскім домам культуры у Скірмантаўскай сельскай бібліятэцы Дзяржынскага раёна была праведзена слайд-прэзентацыя «Палыновай зямлі дзівасіл». Удзельнікі мерапрыемства даведаліся аб Чарнобыльскай аварыі, пра мужнасць людзей, якія першымі прынялі ўдар аварыі на сябе, іх гатоўнасць да самаахвяравання, пра наступствы катастрофы для насельніцтва і навакольнага асяроддзя.

ДУК «Крупская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы» правяла вечар-рэквіем «Чернобыль: не гаснет памяти свеча», на які былі запрошаны вучні старэйшых класаў і ліквідатары і пацярпелыя ад наступстваў катастрофы, што жывуць у г.Крупкі. Са слязамі на вачах яны успаміналі жыццё

да трагедыі на сваёй малой радзіме,а таксама перасяленне і тое, як іх прынялі на Крупшчыне.

ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка» на базе Любанскага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя правяла літаратурную вечарыну «Чарнобыль – боль, які спальвае сэрца». Навучэнцы даведаліся аб тым, якім болем адгукнуліся ў душах беларускіх паэтаў радкі, прысвечаныя Чарнобыльскай трагедыі. Прысутныя чыталі вершы, прысвечаныя трагедыі, мужнасці і гатоўнасці да самаахвяравання людзей, якія першымі прынялі ўдар аварыі на сябе.

У красавіку ў сельскай бібліятэцы аг. Аляхновічы Маладзечанскага раёна для вучняў 7-9класаў правялі ўрок смутку «Калі б не тая ноч Чарнобыля». Быў паказаны відэаролік з кадрамі пакінутых вёсак у Гомельскай і Магілёўскай абласцях.

У Каладзішчанскай сельскай бібліятэцы № 1 Мінскага раёна для дзяцей і падлеткаў адбыўся круглы стол «Атамная трагедыя ХХ стагоддзя». Удзельнікам мерапрыемства расказалі пра маштаб трагедыі, яе наступствы і меры барацьбы
з радыяцыйным забруджваннем, пра захворванні, выкліканыя радыяцыяй. Удзельнікі прыйшлі да высновы, што ўсе мы павінны задумвацца, у якім далікатным свеце жывём, і што Зямля ў нас ва ўсіх адна і яе трэба берагчы, ахоўваць, каб не здарылася падобнай трагедыі.

Да Ддя Чарнобыльскай трагедыі ў бібліятэках прайшлі: літаратурны вечар «Чернобыль в нашей памяти», гадзіна памяці «Чернобыльские мотыльки» (Барысаўскі раён); вечарына «Імя той зоркі – палын» (Бярэзінскі раён); экалагічны дайджэст «След чёрного ветра», дзень памяці «Вечнае рэха Чарнобыля» (Валожынскі раён); агляд твораў літаратуры «Чорны круг Чарнобыля» (Вілейскі раён); урыўкі з кнігі «След Чорнага ветру. Вачыма дзяцей» (Дзяржынскі раён); інфармацыйная праграма «Урокі Чарнобыля: погляд праз гады» (Клецкі раён); круглы стол «Балючы ўспамін»,

гадзіна памяці «Чарнобыль – наш боль», літаратурная хвіліна «Чарнобыль у беларускай паэзіі», тэматычны вечар «Чарнобыльскае рэха», (Крупскі раён); гадзіна памяці «Трагедыя без тэрміну даўнасці», урок-роздум «Боль Чарнобыля», літаратурная гадзіна «Чарнобыль у памяці нашай», гадзіна памяці і смутку «Чарнобыль. Паміж былым і будучым» (Лагойскі раён); віртуальнае падарожжа «Чарнобыль баліць, папярэджвае», экалагічны дыялог «Колокола тревоги», экалагічны набат «Сівізна на скронях – Чарнобыль», гадзіна смутку «Зямля параненая Чарнобылем», час разважання «Чернобыль – жив и навсегда опасен», круглы стол «Чарнобыль у нашай памяці» (Любанскі раён); гадзіна смутку «Незатихающая боль», гадзіна-разважанне «Жыццё пасля Чарнобыля: погляд праз дзесяцігоддзі», інфармацыйная гадзіна «Пакуль Чарнобыль глядзіць у нашы душы», гадзіна смутку «Зона отчуждения» (Мінскі раён); літаратурна-пазнавальная гадзіна «Колокол Чернобыля звучит в наших сердцах», пазнавальна-інфармацыйная гадзіна «Чарнобыль у нашай памяці», ўрок-рэквіем «Пока Чернобыль глядит нам в души», літаратурная гадзіна «Чарнобыль у беларускай паэзіі» (Мядзельскі раён); інфарм-дасье «Тяжёлое небо» (Нясвіжскі раён); экочас «Я вновь иду чернобыльской дорогою…», гутарка-роздум «Уроки Чернобыля: взгляд через года», вечар-рэквіем «Уроки Чернобыля» (Салігорскі раён); літаратурная імпрэза «Уся Беларусь, як чарнобыльскі звон», віртуальная выстава-рэквіем «Рэха Чарнобыля», гадзіна роздуму «Цені Чарнобыля», відэяпанарама «Балючая памяць Беларусі», роздум «Чернобыль: трагедия, подвиг, предупреждение» (Слуцкі раён); вечар памяці «Зямля, зраненая Чарнобылем», гадзіна экалагічных ведаў «Балючая рана роднай зямлі», урок памяці «Чернобыль– наша боль», відэапрэзентацыя «Чорны боль», экагадзіна «Звон жалобны над родным краем» (Смалявіцкі раён).

Пры бібліятэках Мінскай вобласці працуюць аматарскія аб’яднанні, клубы: краязнаўча-экалагічны клуб

для падлеткаў «Беразавічок» (Багушэвіцкая сельская бібліятэка-клуб Бярэзінскага раёна); экалагічны клуб «Рамонак» (Валожынскі раён); літаратурна-экалагічны клуб «Фларыда», гурток «Лесавічок» (Клецкі раён); клубы аматараў прыроды «Крынічка», «Аука», «Расінка», «Лісцін», «Пчёлка» (Мінскі раён); клуб «Лесавічок», «Флора», клуб кветкаводаў-аматараў «Лотас» (Мядзельскі раён); экалагічнае аб’яднанне «Зялёная гасцёўня» (Ужанкоўская бібліятэка-клуб Нясвіжскага раёна); экалагічны клуб «Светлячок», клуб кветкаводаў «Флора» (Салігорскі раён); клубы «Вернісаж», «Мурашок», «Фларыяна», «Вясёлка», «Рамонак», «Кропелька» (Слуцкі раён); гурток экалагічнага выхавання «Пралеска» (Старадарожскі раён); клубы «Лесавічок», «Роднічок», «Бусляняткa» (Уздзенскі раён).

## *Здаровы лад жыцця*

Вось ужо 7 гадоў у духоўна-асветніцкім цэнтры ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева» рэалізуецца інфармацыйна-асветніцкі сацыякультурны праект «Выбери жизнь!», накіраваны супраць абортаў. Для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі г. Барысава працавала міжведамасная праграма «Сохрани себя для жизни». Асноўныя мэты і задачы праграмы – стварэнне аптымальных умоў для захавання і ўмацавання рэпрадуктыўнага здароўя, фарміраванне ў школьнікаў жыццёвых арыенціраў на аснове маральнасці, навыкаў здаровага ладу жыцця і асабістай адказнасці за ўласныя паводзіны.

У рамках праекта ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» «Усёй грамадой – супраць п’янства» да Дня аўтамабіліста на базе райаграсэрвіса і аўтабазы №22 праведзена агітакцыя «Цвярозыя кіламетры на вадзіцельскім спідометры», бенефіс кнігі А. Астапенкі «Між светам тым і гэтым».

Бібліятэкі Вілейскага раёна ўносяць свой уклад у вырашэнне праблемы выхавання здаровага пакалення, займаючыся мэтанакіраванай асветніцкай працай па інфармацыйнай падтрымцы здаровага ладу жыцця, рэалізоўваючы раённую бібліятэчную праграму «Здаровы лад жыцця – гэта норма».

Мерапрыемствы па фарміраванні здаровага ладу жыцця і непрыязнасці да шкодных звычак праводзіліся ў Крупскім раёне у рамках праекта «Да здароўя праз кнігу».

У 2018 годзе бібліятэкі сеткі публічных бібліятэк Лагойскага раёна пачалі працаваць паводле раённай мэтавай праграмы «Мы – за здаровую будучыню», якая разлічана на 3 гады (2018-2020гг.). Праграма прадугледжвае правядзенне комплексу мерапрыемстваў, якія актыўна прапагандуюць здаровы лад жыцця, служаць прафілактыцы шкодных звычак сярод насельніцтва, фарміраванню устойлівай цікавасці да здаровага ладу жыцця.

Публічныя бібліятэкі Любанскага раёна працавалі ў рамках комплекснай бібліятэчнай праграмы «З кнігай і здароўем па жыцці». ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча» падрыхтавала дыялог для моладзі «Разам за здаровую будучыню». ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» сваю працу па папулярызацыі здаровага ладу жыцця праводзіла праз рэалізацыю доўгатэрміновага праекта «Бібліятэка – тэрыторыя здароўя» (2016–2018гг). Вынікам гэтай дзейнасці стаў дыплом за 2-е месца ў намінацыі «Прапаганда здаровага ладу жыцця» абласнога конкурсу праектаў у сферы рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

У Салігорскім раёне працягвалася рэалізацыя асветніцкага праекта «Стиль жизни – здоровье», праводзілася своечасовае і даступнае інфармаванне карыстальнікаў па розных аспектах праблемы наркаманіі, алкагалізму, курэння, ВІЧ / СНІД.

У 2018 годзе бібліятэкі Слуцкага раёна працягвалі працу паводле інфармацыйна–асветніцкай праграмы

«За здаровы лад жыцця». Праграма складаецца з пяці падпраграм – «Інфарм-кур’ер», «Люстэрка», «Выратаванне», «Сямейны лабірынт», «Бібліятэрапія», якія ўключаюць комплекс мерапрыемстваў па фарміраванні здаровага ладу жыцця: маральнае выхаванне асобы, сацыяльная адаптацыя і рэабілітацыя моладзі і падлеткаў, прафілактыка шкодных звычак, стварэнне псіхалагічнага і духоўнага камфорту ў сям’і, пераадоленне крызісных сітуацый з дапамогай кнігі і чытання.

У справаздачным годзе ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» быў рэалізаваны маладзёжны культурна-адукацыйны праект «Здорово вместе» 2016 – 2018 гг. Праект ставіў мэтай папулярызацыю здаровага ладу жыцця сярод дзяцей і моладзі праз распаўсюджванне інфармацыі аб шкодных звычках, спорце, актыўным вобразе жыцця шляхам правядзеннея розных мерапрыемстваў.

2018 год быў насычаны мерапрыемствамі, якія **прапагандавалі здаровы лад жыцця** сярод насельніцтва і былі накіраваны на прафілактыку ўзнікнення розных захворванняў.

У гарадской бібліятэцы №2 Барысаўскага раёна адбылася акцыя «Я за здоровый образ жизни!». Увазе чытачоў была прапанавана тэматычная паліца. Кожны мог на ёй знайсці для сябе карысную інфармацыю аб правільным харчаванні і рэжыме дня, важнасці фізкультуры і асабістай гігіены.

У ліпені на базе ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» адбыўся семінар-практыкум «Прыгажосць і здароўе», дзе гасцямі мерапрыемства былі майстры прыгажосці (цырульнікі і касметолагі), якія падзяліліся з ўдзельнікамі сакрэтамі прыгажосці і здароўя.

У бібліятэцы-філіяле №1 Маладзечанскага раёна адбылася сустрэча за круглым сталом «Спорт і асоба». У наведвальнікаў бібліятэкі гасцямі былі галоўны трэнер «Маладзечанскай ДЮСШ прафсаюзаў «Маладосць» Кулак Аляксандр Антонавіч і сярэбраны і бронзавы прызёр

чэмпіяната свету 2017 года па гарадошнаму спорту Шаўроўская Аляксандра Валер'еўна. Аляксандр Антонавіч расказаў прысутным пра гісторыю развіцця гарадошнага спорту, пра тое, як развіваецца гэты від спорту сёння. Быў паказаны фільм аб правілах гульні. А Аляксандра Валер'еўна прадэманстравала свае прызы, заслужаныя на чэмпіянатах рознага ўзроўню.

У Салігорскай раённай дзіцячай бібліятэцы праведзены пазнавальны круіз «У дарогу збірайся, за здароўем адпраўляйся». Навучэнцы 1-х класаў ДУА «Сярэдняя школа №6 г. Салігорска» паўдзельнічалі ў конкурсах «Вочы – люстэрка душы», «Беражы сваё здароўе», гульнях «Гэта я, гэта я, гэта ўсе мае сябры», паслухалі казкі, вершы, прымаўкі і правілы пра здароўе, атрымалі карысныя веды і парады, як захаваць здароўе.

У ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса» для выхаванцаў санаторнай школы-інтэрната адбыўся Дзень здароўя «Не будь зависимым! Скажи – НЕТ!» з удзелам інструктара-валеолага Уздзенскай ЦРБ С.Л.Касабуцкай.

За круглым сталом літаратурнай гасцёўні ў гэты дзень ішла сур’ёзная размова на актуальную тэму. Пра тое, як пазбегнуць залежнасці ад шкодных звычак, як не быць абыякавым да праблем тых, хто побач і пра многае іншае расказвала васьмікласнікам медык Святлана Леанідаўна. Падлеткі ўважліва слухалі яе, глядзелі прапанаваны відэафільм, абмяркоўвалі яго, задавалі пытанні, разважалі.

У бібліятэках ладзіліся: электронная агіттрыбуна «Тэрыторыя незалежнасці», круглы стол «Здаровым быць здорава», семінар «Здаровае харчаванне – шлях да даўгалецця» (Бярэзінскі раён); фотавыстава «Найвялікшыя алімпійцы», гульнёва-спартыўная праграма «Вясёлы ўрок здароўя», Дзень здароўя «Скуку, простуду, безделье – меняем на бодрость, здоровье, веселье» (Валожынскі раён); гульня-экспедыцыя «В путь дорогу собирайся – за здоровьем отправляйся!», пазнавальная гутарка «Добро пожаловать в

страну Здоровячков!» (Дзяржынскі раён); бібліятэчныя парады «Слагаемые здоровья», бібліязаняткі «Безопасное лето», бібліягадзіна- засцярога «Экстренный вызов», літаратурны ўрок «Зима и безопасность», бібліятэчная гасціная «Под тёплым маминым крылом» (Капыльскі раён); конкурсная праграма «Дрэва здаровых звычак», прафілактычная гутарка «Беражы здароўе з маленства!» (Клецкі раён) гульнёвая праграма «Ёсць правілы на свеце, павінны іх ведаць усе дзеці», квэст «Падарожжа ў горадзе «Здароўе», квэст «Мы выбіраем жыццё» (Маладзечанскі раён); інфарм-рэвю «Бережливые хозяева Земли», арт-тэрапія «Чудесный лекарь наших душ», свята «Здаровае харчаванне – здаровае сэрца», гадзіна здароўя «Моладзь. Спорт. Здароўе», урок здароўя «Всем миром за здоровье» (Мінскі раён); вусны часопіс «Пять слагаемых здоровья» (Мядзельскі раён); круглы стол «Мой здоровый выбор», актуальная размова «Твоя жизнь – бесценный дар» (Салігорскі раён); інфармацыйны марафон «Героі спорту – гонар Радзімы», кірмаш карысных парад «Твае арыенціры – прыгажосць і здароўе», сустрэча з урачом-валеолагам «Асноўныя складальнікі здароўя» (Слуцкі раён); гутарка «Береги платье снову, а здоровье смолоду», гадзіна здароў'я «Я здоровье берегу, сам себе я помогу», актуальна-пазнавальная гульня «Начинай з зарядки день», гадзіна пытанняў і адказаў «О здоровье для здоровых», гадзіна здароўя «Здароваму – усё здорава» (Старадарожскі раён); урок-прафілактыка «Вітамінка – жыцця сцяжынка», абмен думкай «Модно и красиво не всегда здорово» (Стаўбцоўскі раён); сустрэча-дыялог «Пусть всегда будет завтра», урок здароўя «Добрые советы для вашего здоровья», экскурсія-гутарка «Сто советов на здоровье» (Уздзенскі раён); інфармацыйная гадзіна «Здаровае харчаванне: мода ці неабходнасць», гадзіна інфармацыі «Не атакуй врачей уныньем жалоб, твоё здоровье в собственных руках» (Чэрвеньскі раён); інфармацыйная гадзіна «А лучше не болеть!», актуальная размова «Здоровье без лекарств

и долголетие без болезней», прэзентацыя «Йога – наука, которая учит нас быть счастливыми и добрыми, учит меньше страдать!», відэавіктарына «Мы все недуги победим», віртуальнае падарожжа «Витамины на нашем столе», рэкамендацыі для жыцця «Лечить не только тело, но и душу», круглы стол «Будьте здоровы!», прэс-тайм «Спорт на все времена» (г. Жодзіна).

**Сусветнаму дню здароўя** была прысвечана бібліятэчная квілт-акцыя «Стыль жыцця – здароўе» ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік». Удзельнікі акцыі падзяліліся сваімі меркаваннямі аб сутнасці, важнасці і значэнні здаровага ладу жыцця, адказалі на шэраг пытанняў, акрэслілі кола найбольш актуальных тэм. Такім чынам і з'явіўся бібліятэчны квілт – інфармацыйны стэнд, складзены, нібыта са шматкоў, з асобных частак.

Свята «Пусть всегда будет завтра» адбылося ў Негарэльскай сельскай бібліятэцы Дзяржынскага раёна. Яно пачалося з агляду літаратуры па прафілактыцы здаровага ладу жыцця, затым фельчар расказала аб тым, як захаваць здароўе на доўгія гады. На свяце гучалі вясёлыя песні і вершы аб здароўі і добрым настроі. Госця свята, паэтка Рэгіна Рэўтовіч, падзялілася сваімі рэцэптамі здароўя і прачытала вершы, а Ніна Васільева выканала прыпеўкі ўласнага сачынення пра тое, як негарэльцы ўмацоўваюць здароўе.

У Забалацкай сельскай бібліятэцы Любанскага раёна для дарослых была праведзена адкрытая размова «100 советов на здоровье». Удзельнікі даведаліся аб тым, якія фактары ўплываюць на працягласць жыцця, атрымалі парады, як палепшыць памяць, як кантраляваць вагу цела і яшчэ шмат карыснага. У канцы мерапрыемства быў праведзены агляд літаратуры па здаровым ладзе жыцця.

У Замастоцкай сельскай бібліятэцы Мінскага раёна прайшоў вечар-сустрэча з майстрам спорту, чэмпіёнам свету па армрэслінгу Галавешкам Генадзем Васільевічам «Спорт – гэта жыццё і здароўе». Дзеці пазнаёміліся з трэнерам, паглядзелі спартыўную энцыклапедыю Беларусі, у якой ёсць

звесткі пра нашых спартсменаў, атрымалі рэкамендацыі, як зберагаць здароўе. Дзеці ўважліва слухалі госця і задавалі пытанні.

У бібліятэках вобласці былі праведзены: пазнавальная гадзіна «За компьютер не садись – а на улице резвись» (Баравікоўская інтэграваная сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна); агляд карысных парад «Да здароўя з кнігай» (ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка ім. Я.Купалы»); інфармацыйна-пазнавальная гадзіна «Дзіўны свет лекаў», інфарм-кур’ер «Падарожжа па краіне здароўя», гадзіна здароўя «Быть здоровым, умным, сильным», гутарка-парада «Здароўе пачынаецца з чысціні» (Лагойскі раён); гутарка «Ворагі твайго здароўя», гадзіна шчырай размовы «Жыццё, здароўе, поспех – твой выбар», піраміда ведаў «Жить – здоровьем дорожить», тэрыторыя клопату «Книга как лекарство» (Любанскі раён); спартыўнае свята «Путешествие в Спортград» (ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка»); інфармацыйная гадзіна «Чтобы не было беды» (Старлыгская сельская інтэграваная бібліятэка Мядзельскага раёна); бібліягадзіна «Жизнь, здоровье, успех – твой выбор», выстава-фотасушка «Хорошо здоровым быть!», інфармацыйны кактэйль «Як захаваць сваё здароўе» (Пухавіцкі раён); інфармацыйная гадзіна «Правильно питаться – здоровым остаться», гадзіна-паведамленне «Курить в XXI веке не модно» (Старадарожскі раён); пазнавальная гадзіна «У госці да вітамінаў», эстафета на свежым паветры «Лета 2018 – на карысць», слайд-лекцыя «Я выбіраю жыццё», адкрыты марафон «Чыстым жыць – здаровым быць» (Стаўбцоўскі раён); акцыя «Читайте и выздоравливайте», урок здароўя «Здоровый я – здоровая моя семья», дайджэст навінак перыёдыкі «Быть здоровым – это здорово», бібліятэчны квэст «Да! – здоровому образу жизни» (г. Жодзіна).

Тэма прапаганды здаровага ладу жыцця заўсёды актуальная ў рабоце бібліятэк, але асабліва прыкметна яна выступае напярэдадні маштабных мерапрыемстваў,

прысвечаных **Дню барацьбы з наркотыкамі** (1 сакавіка) і **Міжнароднаму дню барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам** (26 чэрвеня).

У Людвіноўскай сельскай інтэграванай бібліятэцы Вілейскага раёна прайшоў трэнінг для навучэнцаў 8-9 класаў «Прафілактыка наркаманіі», які абазначыў праблемы, звязаныя з наркаманіяй і папярэджаннем першага ўжывання наркотыкаў і іншых псіхаактыўных рэчываў. Мерапрыемства дазволіла даведацца аб узроўні інфармаванасці падлеткаў аб праблеме, фарміравала негатыўнае стаўленне да наркаманіі і вучыла сказаць «не» наркотыкам, абгрунтавала матывацыю да захавання здароўя. Трэнінг быў пабудаваны ў форме некалькіх гульняў, кожная з якіх заахвочвала падлеткаў да адкрытага выказвання сваіх пачуццяў і меркаванняў адносна тэмы.

Тыдзень прафілактыкі наркаманіі пад назвай «Мы – за здаровае будучае» быў арганізаваны бібліятэкарам Сямкоўскай сельскай бібліятэкі Лагойскага раёна, які вызначыў мэтай мерапрыемстваў прапаганду здаровага ладу жыцця, азнаямлення з наступствамі наркатычнай залежнасці, фарміраванне негатыўнага стаўлення да ўжывання наркатычных сродкаў і навучаў бяспечным паводзінам з асобамі, якія ўжываюць наркатычныя рэчывы і якія спрабуюць прыцягнуць да ўжывання іншых.

У Стараюрковіцкай сельскай бібліятэцы Любанскага раёна да Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам для вучняў старэйшых класаў праводзілася гадзіна здароўя «Сцеражыся белай хваробы», на якой выступала фельчар Акуліч В.В. Яна расказала, якую шкоду наносяць маладому арганізму наркотыкі, адказала на шматлікія пытанні. Інфармацыя была актуальнай і патрэбнай.

Лядненская сельская бібліятэка- філіял № 22 Слуцкага раёна запрасіла падлеткаў на прафілактычную гутарку «Наркаманія – хвароба маладых». На мерапрыемстве абмяркоўваліся наступныя пытанні: як дзейнічаюць

наркотыкі, хто і як зацягвае маладых людзей у наркатычны вір, як супрацьстаяць тым, хто прапаноўвае паспрабаваць псіхаактыўныя рэчывы, чаму падлеткі пачынаюць ужываць наркотыкі, ведаючы, чым гэта пагражае.

У справаздачным годзе ў бібліятэках вобласці па прафілактыцы наркаманіі праведзены: праблемная размова «Вверх по лестнице, ведущей вниз», слайд-размова «Наш выбор – мир без наркотиков!», сустрэча з інспектарам па справах непаўналетніх «Будущее без наркотиков, ролевая гульня «Суд над спайсом», гутарка з праглядам відэароліка «Наркомания – смертельная опасность» (Барысаўскі раён); акцыя «Кніга супраць наркотыкаў», літаратурная сімфаньета «Лёс пад кніжнай вокладкай» (Бярэзінскі раён); тэматычны вечар «Цана залежнасці – жыццё», інфармацыйная гадзіна «Вайна ў мірны час» (Валожынскі раён); антынаркатычная акцыя «Мы выбіраем жыццё!», жывая гутарка «Юнацтва без наркотыкаў і алкаголю», круглы стол «Жыццё без наркотыкаў» (Вілейскі раён); гутарка-папярэджанне «Нават не спрабуй», гадзіна разважання «Наркаманія: шлях у нікуды» (Лагойскі раён); інфармацыйная гадзіна «Наркотык – знак бяды», відэа-лікбез «Как действуют наркотики», шок-урок «SOS – наркомания» (Любанскі раён); інфармацыйная гадзіна «Имя беды – наркотик», відэалекторый «Сцеражыся СПАЙСа» (Маладзечанскі раён); прафілактычная гутарка «Жыццё – ТАК!, наркотыкі – НЕ!», круглы стол «Мы нарадзіліся для таго, каб жыць», круглы стол «Я выбіраю жыццё», акцыя «Мы за жыццё без наркотыкаў» (Мінскі раён); гутарка-папярэджанне «Выбери правильный путь», відэароздум «Возраст тревог и ошибок», гадзіна відэаразвагі «Наркаманія – спосаб самагубства», гадзіна неабходных ведаў «Стоп, спайс» (Пухавіцкі раён); гадзіна-напамін з электроннай прэзентацыяй «Остановись! Пока не поздно!» (Старадарожская раённая дзіцячая бібліятэка); гадзіна праблемнай інфармацыі «Пагаворым пра наркотыкі», хвілінка інфармацыі «Сцеражыся – СПАЙС!», прававы ўрок «Легкіх наркотыкаў не бывае» (Стаўбцоўскі раён); інфармацыйная

гадзіна «Доза маленькая – беда большая», гадзіна перасцярогі «Будучыня без наркотыкаў», праблемная размова «Наркотики: искушение любопытством?» (Уздзенскі раён); медыяпрэзентацыя «Лесвіца ў пекла», выстава кніг «Грамадства без наркотыкаў», гутарка «Пусть всегда будет ЗАВТРА!» (Чэрвеньскі раён).

Міжнародны **Дзень памяці людзей, якія памерлі ад СНІДу**, традыцыйна праводзіцца ў трэцюю нядзелю мая.

У гарадской бібліятэцы №1 Барысаўскага раёна прайшоў флэшмоб «Красная лента». Бібліятэкары, падлеткі і проста неабыякавыя людзі прычапілі да свайго адзення чырвоныя стужачкі, як сімвалізуюць барацьбу са СНІДам, з эпідэміяй, што ахапіла ўсю планету і закранула кожнага з нас. У ходзе флэш-мобу бібліятэкары раздавалі лістоўкі, якія змяшчаюць інфармацыю пра СНІД, і чырвоныя шматкі тканіны ў памяць пра мільёны людзей, якія пайшлі з жыцця, – ахвяраў СНІДу.

Відэалекцыя «Всем миром против страшного зла» прайшла ў Фаніпальская гарадской бібліятэцы Дзяржынскага раёна. Бібліятэкары ў сваёй прэзентацыі інфармавалі аб распаўсюджванні СНІДу, групах рызыкі, якія найбольш схільныя да заражэння ВІЧ-інфекцыяй, аб знакамітых людзях, што памерлі ад СНІДу, і мерах прафілактыкі гэтай навалы. На працягу дня праводзіліся гутаркі па выяўленні ўзроўню інфармаванасці па пытаннях ВІЧ-інфекцыі, выдаваліся памяткі і буклеты.

Гадзіна сумнай статыстыкі «Маю права ведаць» з дэманстрацыяй відэафільма «Чума XXI стагоддзя» адбылася ў Лагойскай дзіцячай бібліятэцы. Бібліятэкар расказвала прысутным пра гіпотэзу ўзнікнення ВІЧ- інфекцыі, пра ўзровень захворвання ў розных краінах, пра шляхі перадачы хваробы. Моладзі былі прапанаваны ролевыя гульні. Гульня «Прабач, а я не ведаў, што хворы» прадэманстравала хуткасць распаўсюджвання ВІЧ-інфекцыі, гульня «Што я ведаю пра хваробу?» дапамагла разабрацца ў разнастайных сітуацыях, звязаных з хваробай, а гульня «Лабірынт»

дапамагла прысутным уявіць пачуцці, якія адчувае хворы чалавек.

У Крывіцкай пасялковай бібліятэцы Мядзельскага раёна прайшоў вечар пытанняў і адказаў «СНІД – прагноз сумны». На ім прысутнічала медыцынская сястра, якая адказала на пытанні дзяцей, расказала пра гісторыю ўзнікнення праблемы ВІЧ/СНІД, якім шляхам перадаецца вірус, пра сацыяльна-псіхалагічныя і эканамічныя наступствы ВІЧ-інфекцыі.

У бібліятэках былі праведзены: акцыя «СПИД: без мифов и иллюзий», відэаэнцыклапедыя «SOS! Оставайся на линии жизни!», флэшмоб «Любовь и верность в семье – лучшая защита от СПИДа» (Барысаўскі раён); флэшмоб «СНІД: пад прыцэлам маладыя», арт-акцыя «Твар у твар са СНІДам», гутарка-прэзентацыя «СНІД: ніхто не вінаваты» (Бярэзінскі раён); гутарка «Не памірайце ад невуцтва», інфармацыйная гадзіна «СНІД: што с гэтым рабіць?» (Валожынскі раён); асветніцкія акцыі «СНІД – чатыры літары – мільён жыццяў», дыскусія «Набат XXI стагоддзя: СНІД, п'янства, паленне, наркаманія» (Вілейскі раён); дзень прафілактыкі «Пра гэта трэба ведаць», інфармацыйная акцыя «СНІД – кошт адной памылкі», гадзіна памяці «Яны хацелі жыць, але …» (Лагойскі раён); кансультацыя-трэнінг «Профилактика ВИЧ/СПИД», гадзіна праблемнай размовы «Запомні: гэта важна для жыцця», круглы стол «СНІД – жыццё без будучыні» (Любанскі раён); інфарм-дзень «Баяцца не трэба, трэба ведаць» (Маладзечанскі раён); прафілактычная гадзіна «Зловещая тень над миром», адкрыты мікрафон «Усё ў тваіх руках» (Мінскі раён); трэнінг «Здаровы лад жыцця і прафілактыка ВІЧ-інфекцыі сярод моладзі», відэаўрок «Чалавек, прадоўжы свой век» (Мядзельскі раён); лікбез «Знание против страха» (ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка ім. П.Пранузы»); флэшмоб «Пусть всегда будет ЗАВТРА!», валеалагічны лабірынт «Чароўны квадрат здароўя», відэалекторый «Здаровы лад жыцця: альтэрнатывы няма» (Пухавіцкі раён); экстраннае

паведамленне «За наркаманіяй – СНІД», мультымедыйная прэзентацыя «СНІД не перадаецца праз сяброўства» (Старадарожскі раён); круглы стол з удзелам спецыяліста цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, валеолага «Твая старонка ў кнізе жыцця», тэматычны вечар «А СПИД, ведь он не спит» (Стаўбцоўскі раён); гадзіна карысных парад «Время любить, время думать», тэматычная гутарка «Мои знания о ВИЧ/СПИД» (Уздзенскі раён); сустрэча «Знание против страха: СПИД», інфармацыйная гадзіна «Спыніць СНІД» (Чэрвеньскі раён).

На працягу года публічныя бібліятэкі Міншчыны вялі рэгулярную працу па **прафілактыцы алкагалізму** пасродкам розных мерапрыемстваў прафілактычнага і папераджальнага характару.

23 верасня з удзелам салдат 60-га асобнага палка сувязі ў агульнай зале ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя. І. Х. Каладзеева» адбылася слайд-гутарка «Алкоголизм и жизнь несовместимы». Бібліятэкар Ірына Мартынюк інфармавала вайскоўцаў аб шкодным уздзеянні алкаголю на фізічнае і псіхічнае здароўе чалавека, а таксама на міжасобавыя зносіны і стасункі ў сацыяльнай і эканамічнай сферах.

На гадзіну шчырай размовы «Джульета з півам, альбо Дзяўчына ў эпоху рызыкі» запрасілі дзяўчатак-падлеткаў у Баравікоўскую інтэграваную сельскую бібліятэку Дзяржынскага раёна. З цікавасцю яны слухалі фельчара Баравікоўскага ФАПа , якая была запрошана на сустрэчу, пра тое, як піва, з’яўляючыся алкагольным напоем, уздзейнічае на арганізм падлетка, асабліва дзяўчынк, і пра наступствы злоўжывання.

У Задор’еўскай сельскай бібліятэкі Лагойскага раёна адбыўся актуальны дыялог «Як разбурае чалавека алкаголь». Падчас сустрэчы гаворка ішла пра ўздзеянне піва на здароўе чалавека. У працэсе абмеркавання высветлілася, што многія прысутныя ўжываюць піва, не ведаючы, якую шкоду яны наносяць самі сабе, думаючы, што гэты напой толькі

здавальняе смагу. Наадварот, піва прыводзіць да абязводжвання арганізма, а той, хто пачынае сістэматычна ўжываць піва, набывае залежнасць ад яго.

ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка» арганізавала інфатэст «Алкаголь – пагроза здароўю». Карыстальнікі змаглі пазнаёміцца з тэматычнай літаратурай пра шкоду алкаголю, даведацца пра адрасы і нумары тэлефонаў для атрымання псіхалагічнай і медыцынскай дапамогі.

Таксама прайшлі: семінар «Алкоголизм и наркомания. Работаем с проблемой», прававы дыялог «Алкоголь: личность, здоровье, закон», гадзіна цвярозасці «Алкоголь – коварный враг» (Барысаўскі раён); сустрэча з медыкам «Уздзеянне алкаголю на арганізм» (Гародзькаўская сельская бібліятэка Валожынскага раёна); інфармацыйная праграма «Алкастоп», гульня «П’янства і курэнне – шлях да старэння» (Клецкі раён); круглы стол «З чаго пачынаецца п’янства» (Коласаўская сельская бібліятэка Крупскага раёна); інфармацыйная гадзіна «10 міфаў аб алкаголі», гутарка «Личность и алкоголь», гутарка «Алкоголь – зло», актуальны дыялог «Скажи алкоголизму – НЕТ!» (Мінскі раён); акцыя «Алкоголь и наркотики – это опасно. Не рискуй напрасно», гадзіна прафілактыкі «За трезвый образ жизни»; прафілактычная гадзіна «П'янства і алкагалізм», раённая акцыя «Дзень без спіртнога», лекцыя «Алкаголь – вораг здароўя» (Пухавіцкі раён); прафілактычная сустрэча «Правда о пиве: профилактика алкоголизма», сустрэча з медыцынскім работнікам «Алкоголизм: дурная привычка или болезнь» (Слуцкі раён); экран здароўя «Пить или не пить. Информация к размышлению», акцыя «Я выбираю здоровье», інфармацыйны інфатэст «Алкоголь – угроза здоровью» (г. Жодзіна).

Вялікае значэнне надаецца прафілактыцы тытунёвай залежнасці ў бібліятэках Мінскай вобласці.

31 мая ў гарадской бібліятэцы №2 Барысаўскага раёна прайшла акцыя «Я не курю! И это мне нравится!». Да ўвагі

ўдзельнікаў была прадстаўлена кніжная выстава-перасцярога з літаратурай пра згубны ўплыў курэння на здароўе. На працягу дня для карыстальнікаў бібліятэкі праводзіліся інфармацыйныя хвілінкі пра шкоду курэння. Маладыя людзі знаёміліся з лістоўкамі «Курение не стоит вашей жизни» і прымалі ўдзел у афармленні стэнда «Я не курю». Адказваючы на пытанне ў анкеце «Почему я не курю?», хлопцы, што вядуць здаровы лад жыцця, пісалі пра тое, што яны займаюцца спортам і што паліць не модна.

У аддзеле абслугоўвання і інфармацыі ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» прайшло мерапрыемства «Сигарета.net». Яго удзельнікамі сталі вучні ДУА «Сярэдняя школа №4 г. Дзяржынска», якія змаглі праверыць свае веды аб курэнні і наступствах гэтай шкоднай звычкі. Для інтэлектуальнай загрузкі моладзь выкарыстоўвала інфармацыйныя бібліябайты: гістарычную даведку аб распаўсюджванні тытуню, віктарыну аб яго шкодзе і інтэрактыўныя пазлы аб уздзеянні тытуню на арганізм чалавека, міні-трэнінг «Научись говорить «Нет!».

«Курэнне і здароўе» – так называўся Тыдзень прафілактыкі курэння, які прайшоў у Акцябрскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна. Яго праграма была разнастайнай. Тыдзень адкрыўся прэзентацыяй кніжнай выставы «Без нікаціну, як без негатыву». Для моладзі правялі інфармацыйную гадзіну «Бясшкоднага тытуню не бывае», віктарыну «Шкода курэння». Была арганізавана сустрэча з медыцынскім работнікам «Пераадолець сябе: з чаго пачаць?», дзе прысутныя атрымалі карысныя парады аб тым, як зрабіць першы крок да здаровага ладу жыцця. Завяршыўся Тыдзень гутаркай «Выбіраем будучыню без тытуню».

У бібліятэках вобласці прайшлі: слайд-гутарка «Курить в XXI веке не модно», інфармацыйна-прававы марафон «Курение – фактор риска» (Барысаўскі раён); віктарына «Цыгарэта – забойца», урок здароўя «Дым,

который убивает здоровье» (Бярэзінскі раён); інфармацыйная гадзіна «Падлетак! Свет цудоўны без цыгарэт», фотавыстава «Тытунёвая эра» (Валожынскі раён); урок-перасцярога «Кнут для сердца», трэнінг «Барацьба з курэннем» (Вілейскі раён); акцыя «Воздух без табачного дыма», прафілактычная гутарка «Пассивное курение» (Клецкі раён); акцыя «Абмяняй нікацінку на вітамінку», дыскусійныя арэлі «У палоне нікаціна», гадзіна здароўя «Жизнь без сигарет» (Любанскі раён); інтэрактыўная гутарка «Мы не курим и Вам не советуем!», калейдаскоп цікавых фактаў «Курэнне, якое забірае здароўе», сустрэча з загадчыцай аддзялення грамадскага здароўя Мінскага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Мітрайкінай Юліяй Васільеўнай «Курэнне і здароўе» (Мінскі раён); прэзентацыя «Падумай: табе гэта трэба?», круглы стол «Хто курыць тытунь, той сам сабе вораг», відэаролік «Цыгарэта – здароўю перешкода», трэнінг «Я ведаю, што магу сказать «не» (Мядзельскій раён); рэкламная акцыя «Дзень без тытуню», відэалекторый «Калі хочаш доўга жыць – цыгарэты кінь курыць» (Пухавіцкі раён); гадзіна здароўя «Тытунь – першае звяно ланцуга небяспечнасці», круглы стол «Хочаш жыць – кідай курыць» (Смалявіцкі раён); інфармацыйна-пазнавальная гадзіна «Если долго хочешь жить, сигареты брось курить» (Уздзенскі раён); інфармацыйная гадзіна «SOS – хутчэй кінь цыгарэту» (Чэрвеньскі раён).

### *Работа з сацыяльна неабароненымі катэгорыямі насельніцтва*

Бібліятэкі актыўна працуюць над пашырэннем сваіх сацыяльных функцый. Адным з напрамкаў гэтай дзейнасці з'яўляецца **работа з сацыяльна неабароненымі групамі насельніцтва**. Ва ўсіх бібліятэках вобласці праводзяцца дні міласэрнасці, арганізоўваюцца вечарыны, пасядзелкі, праходзяць урокі дабрыні і духоўнасці.

Работа з сацыяльна неабароненай катэгорыяй насельніцтва у ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» вядзецца ў межах праграмы «Міласэрнасць». Мэта праграмы – садзейнічанне адаптацыі чалавека з абмежаванымі магчымасцямі ў грамадстве, яго сацыякультурнай рэабілітацыі і самасцвярджэнню, творчаму развіццю асобы шляхам далучэння да кнігі і чытання. Праграма прадугледжвае комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на прыцягненне ўвагі грамадскасці да інвалідаў і сацыяльна неабароненых груп насельніцтва

Бібліятэкі здзяйсняюць наведванні і надомнае абслугоўванне старых людзей, хворых і інвалідаў, жыхароў аддаленых вёсак.

Праект «Бібліятэка без межаў» Вілейскай гарадской бібліятэкі-філіяла №1 і аддзялення дзённага знаходжання дзяцей-інвалідаў «Ластаўка» ДУ «Вілейскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва» накіраваны на работу з ветэранамі, людзьмі сталага ўзросту, чытачамі з абмежаванымі магчымасцямі. Праект «Дадзім надзею дзецям» аддзела па рабоце з дзецьмі ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка ім. Г. Новік», ДУА «Вілейская спецыялізаваная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы» і ДУ «Вілейскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва» накіраваны на арганізацыю вольнага часу дзяцей з абмежаваннымі магчымасцямі, выхаванцаў школы-інтэрната. 63 выхаванцы школы-інтэрната пастаянна наведваюць бібліятэку, на даму абслугоўваецца двое дзяцей-інвалідаў.

У рамках мэтавай праграмы бібліятэчнага абслугоўвання пажылых, састарэлых, адзінокіх людзей і інвалідаў «Вы не адны, пакуль мы з Вамі» Капыльскага раёна для асоб, якія не маюць магчымасці наведваць бібліятэку, арганізавана дастаўка кніг на дом. Працягвалася

супрацоўніцтва паміж Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкай імя А.Астрэйкі і Капыльскім тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, на базе якога працуюць аддзяленні дзённага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў. Вялася работа ў рамках праектаў «Кніжны свет» сумесна с інвалідамі цэнтра і «Старонкі жыцця» сумесна з ветэранамі ТЦСАН. Сустрэчы адбываліся 1 раз у месяц, згодна планаў работы.

У 2018 годзе працягвалася работа Плешчаніцкай ГБ Лагойскага раёна па мэтавай праграме «Бібліятэка – за міласэрнасць», мэта якой – аказанне падтрымкі і дапамогі сацыяльна неабароненым катэгорыям насельніцтва, бібліятэчнае абслугоўванне людзей з абмежаванымі магчымасцямі, далучэнне іх да кніг.

Бібліятэкі Любанскага раёна здзяйсняюць мэтавую сацыяльную праграму «Душу исцелит добро», сацыяльную праграму «Наполним милосердием сердца».

У бібліятэках Маладзечанскага раёна рэалізуецца праект па рабоце з пажылымі людзьмі «Серебряная нить»; у бібліятэцы сямейнага чытання «Верасок» сумесна з аддзяленнем дзённага знаходжання маладых інвалідаў ЦКРНіР – праект «Жыццё патрабуе міласэрнасці», прызначаны дапамагчы адаптацыі ў грамадстве людзям з абмежаванымі магчымасцямі.

Праект Салігорскага раёна «Согреть своей заботой» мае мэтай забеспячэнне адкрытага доступу да інфармацыі для людзей з абмежаваннямі ў жыццядзейнасці і сталага ўзросту праз інфармацыйна-бібліятэчнае абслугоўванне, спрыянне далучэнню гэтай катэгорыі грамадзян да актыўнага жыцця праз арганізацыю адпаведных іх запытам і магчымасцям мерапрыемстваў.

Бібліятэкі Слуцкага раёна ў 2018 годзе вялі змястоўную працу з пэўнымі групамі насельніцтва ў рамках сацыяльнай праграмы «Вера. Надзея. Любоў». Асноўныя адрасаты праграмы – гэта адзінокія, састарэлыя, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, пенсіянеры, мнагадзетныя сем'і;

інваліды рознага ўзросту. Мэта праграмы – стварэнне для іх безбар'ернага бібліятэчнага асяроддзя. Галоўныя задачы праграмы накіраваны на задавальненне індывідуальных інтарэсаў дадзенай катэгорыі карыстальнікаў, змястоўная арганізацыя вольнага часу, забеспячэнне магчымасці для самарэалізацыі і пошуку новай сацыяльнай ролі.

Праект «Мабільная бібліятэка» г. Жодзіна распрацаваны сумесна з тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва г. Жодзіна. Мэтай праекта – зрабіць бібліятэку бліжэй для сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва. Праект прадугледжвае абслугоўванне сумесна з сацыяльнымі работнікамі пенсіянераў, інвалідаў на даму.

1 кастрычніка, у **Дзень пажылых людзей**, у гарадской бібліятэцы №1 Барысаўскага раёна прайшла акцыя «От сердца к сердцу». У гэты дзень бібліятэкары традыцыйна адрасна наведваюць чытачоў-пенсіянераў. Кветкамі, кнігамі, прысмакамі і самымі добрымі словамі супрацоўнікі бібліятэкі віншавалі сваіх чытачоў, якія прайшлі вялікі жыццёвы шлях з бібліятэкай і кнігай.

Традыцыйна ў лістападзе ў **ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка»** прайшоў Тыдзень літаратурнага краязнаўства «Літаратура з правінцыяльнай прапіскай». У рамках тыдня бібліятэкары правялі акцыю гонару «Вядомы пісьменнік жыве сярод нас» па кнігах пісьменніка-земляка Рыгора Ігнаценкі, які ў сваіх апавяданнях апявае родную прыроду, яе прыгажосць і таямніцы. Літаратурна-краязнаўчы ўрок мужнасці «Дзяцінства, апаленая вайной» у рамках тыдня літаратурнага краязнаўства прайшоў па творчасці пісьменніка – земляка Яўгена Курто. Супрацоўнікі правялі літаратурны вернісаж гумару «І з перцам, і з сэрцам» пісьменніка-сатырыка Міхася Скрыпкі. Вандроўка для школьнікаў горада прайшла па раздзелах краязнаўчага кутка «Літаратурнае сузор'е Бярэзіншчыны», трыбуна гонару «Яго імя носіць вуліца горада», прысвечаная пісьменніку-зямляку Рыгору Нехаю. Школьнікі з задавальненнем удзельнічалі ў мерапрыемствах Тыдня.

Работнікі **Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі** цесна супрацоўнічалі з мясцовымі пісменнікамі, большасць з якіх, дарэчы, пішуць на беларускай мове. Да Года малой радзімы і Дня моладзі адбылася сустрэча-дыялог з самымі актыўнымі чытачамі бібліятэкі, аматарамі прыгожага пісьменства. Гасцямі сустрэчы сталі Якавец Ірына, якая выступіла з прэзентацыяй зборніка вершаў «Маналог душы» і Ярмалінская Кацярына, аўтар зборніка апавяданняў «Мелодыя вясны». Мясцовы празаік-фантаст і ганаровы чытач раённай бібліятэкі Алесь Бычкоўскі перадаў у фонд бібліятэкі некалькі экзэмпляраў сваёй новай кнігі «Дабрадзеі і гармідар квантавай літаратуры».

У **ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік»** паспяхова рэалізуецца праект па прапагандзе літаратурнай спадчыны паэтаў Вілейшчыны «Чытаем кнігі мясцовых аўтараў». З чарады падзей вылучылася

**прэзентацыя кнігі Барыса Манцэвіча «Скрыжалі майго маленства».**

Напрыканцы лістапада ў чытальнай зале раённай цэнтральнай бібліятэкі імя Ганны Новік адбылася **прэзентацыя кнігі Людмілы Пукела «Полотно жизни»**.

У **ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная сістэма»** працягваў рэалізавацца праект «На літаратурным небасхіле Дзяржыншчыны», які прадугледжваў знаёмства са спадчынай творцаў-землякоў, вядомых як у Беларусі так і за яе межамі. Працягваў сваю творчую дзейнасць літаратурны клуб «Выток».

Гадзіна паэзіі «На агеньчык да юбіляра» прайшла да 85-годдзя з дня нараджэння паэтэсы Жыбрык (Умецкай) Ніны Іосіфаўны ў **Негарэльскай сельскай бібліятэцы Дзяржынскага раёна.**

Да выхаду новага зборніка «Зноў с тобой я, месцейка святое» **Галавацкай сельскай бібліятэкай Клецкага раёна** быў падрыхтаваны і праведзены творчы вечар зямлячкі, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Таццяны Цвірка «Мілей за родныя мясціны нішто не можа ў свеце быць». Гучалі вершы паэткі, цудоўная музыка, выступленне аўтаркі, якая напрыканцы сустрэчы падаравала ўсім прысутным свае кнігі з аўтографам.

Урачыста і змястоўна адбылася літаратурна-краязнаўчая імпрэза **Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі Капыльскага раёна** «Славутыя і вядомыя людзі з нашага краю», якая была прымеркавана да 55-годдзя з дня нараджэння земляка Алеся Бельскага.

Году Малой радзімы была прысвечана прэзентацыя зборніка вершаў удзельніцы літаратурнага аб'яднання «Вясёлка» Любові Мотуз «Пусть осень жизни будет тёплой», якая прайшла ў **Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэцы імя А. Астрэйкі.**

У **Янушкавіцкай сельскай бібліятэцы Лагойсага раёна** адбылося «Літаратурнае падарожжа па Лагойшчыне». У мерапрыемстве прынялі ўдзел члены Мінскага абласнога

аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі В. Шырко, В. Тулінаў, Л. Багдановіч, А. Сакалова, Л. Шагойка, І. Фралова. Прысутныя ўспомнілі імёны знакамітых паэтаў Лагойшчыны, месцы, звязаныя з жыццём і творчасцю Янкі Купалы і Ядвігіна Ш. У выкананні аўтараў прагучалі вершы аб родным краі, прыгажосці беларускай прыроды, аб сустрэчах з цікавымі людзьмі.

Працягвала сваю дзейнасць літаратурнае аб'яднанне «Рунь» **Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.**

У рамках Года малой Радзімы ў **Любанскім раёне** прайшло шостае раённае свята паэзіі і песні «Я словам слаўлю родны край». У гэтым годзе мерапрыемства ладзілася ў **аг. Сосны-1 Любанскага раёна** і было прысвечана 85-годдзю з часу выхаду паэмы Я. Купалы «Над ракой Арэсай». На свяце прайшоў конкурс чытароў сярод дзяцей, таксама чыталі свае вершы самабытныя паэты нашага раёна. Упрыгожылі свята выступленне народных ансамбляў. Таксама ўсе з вялікай цікавасцю слухалі выступленне земляка, гісторыка, краязнаўцы А. І. Вялічкі, які вельмі пазнавальна паведаміў людзям аб гісторыі вёсак Камуна і Сосны, а таксама прачытаў вершы ўласнага складання, прысвечаныя сваёй малой Радзіме і паэту Я. Купалу.

**У ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка»** да юбілею пісьменнікаў-землякоў 195-годдзя П. Шпілеўскага і У. Сыракомлі, 80-годдзя Н. Маеўскай быў прысвечаны літаратурны вернісаж «Жывое слова нашых землякоў».

**Мачулішчанская пасялковая бібліятэка Мінскага раёна** запрасіла на творчую сустрэчу «Родная зямля дарue таленты» з цікавым чалавекам, дзіцячай пісьменніцай Ірынай Аляксандраўнай Карнаухавай. На сустрэчы пісьменніца прадставіла свае кнігі з вершамі і апавяданнямі «Паласатыя гісторыі», «Плямістыя гісторыі», «Аранжавыя гісторыі» і інш.

Падчас творчай сустрэчы з беларускай пісьменніцай Кацярынай Хадасевіч-Лісавой «Час чытаць на роднай мове»

ў **бібліятэцы ДУ «Мінскі РЦК»** прысутныя пазнаёміліся з цікавымі кнігамі, іх героямі, з неверагоднымі прыгодамі, якія адбываюцца ў кнігах. Прыйшла пісьменніца не адна, а ў суправаджэнні героя кнігі «Казкі сіняй падушкі» Пухліка, які жыве ў Сіняй падушцы і з дапамогай чароўнай палачкі ператварылася ў сапраўдную фею, якая жартавала, загадвала касмічныя загадкі, адгадвала імёны прысутных, начаравала ім прыемныя сны.

У 2018 годзе працягвалася акцыя «Маладзечаншчына літаратурная» **ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча»**, якая прайшла па маршрутах: Аляхновічы, Палачаны, Гранічы, Маркава, Лебедзева. Жыхары гэтых населенных пунктаў мелі магчымасць сустрэцца з пісьменнікамі-землякамі, сярод якіх Тамара Аўсяннікава, Лідзія Гардынец, Тамара Бярэзіна, Аляксандр Хазянін, Ала Клемянок, Аксана Ярашонак, Міхась Казлоўскі. Размова на творчых сустрэчах вялася пра тое, што блізка і дорага сэрцу кожнага беларуса – бацькоўскі кут, сцяжынкі дзяцінства, усё, што ўвасабляе ў сабе вялікае слова «Радзіма».

**У ДУК «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка ім. М. Танка»** адбылася прэзентацыя паэтычнага зборніка «Пегас на сотках» члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэата Рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты Купідон», мясцовага паэта Аляксандра Быкава.

Літаратурныя чытанні «Паэт у адпачынку не бывае» з нагоды 100-гадовага юбілею паэта-земляка П. К. Пранузы прайшлі ў **ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы».**

У фае **Мар’інагорскай гарадской бібліятэкі** на працягу года дзейнічаў літаратурны партал «Паэтычныя галасы роднага краю», на якім былі размешчаны вершы паэтаў-землякоў і літаратурная карта Пухавіччыны. Чытачы мелі магчымасць пазнаёміцца з творамі А. Бачылы, А. Лагвіновіч, А. Пісарыка і інш. У межах арт-праекта бібліятэкі «У кнігі будзе голас мой», падчас правядзення

літаратурна – паэтычнай мазаікі «Вернасць роднаму слову, вернасць роднай зямлі» ўдзельнікі мерапрыемства запісалі агучаныя творы пісьменнікаў-землякоў на электронны носьбіт. Лепшыя запісы будуць гучаць у буктрэлеры, прысвечаным «Году малой радзімы».

Да 105-годдзя з дня нараджэння беларускага пісьменніка, ураджэнца Салігорскага раёна **ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка»** абвясціла раённы конкурс «Шчодры талент зямлі Салігорскай». Вечар-партрэт «Сцежкі зведаныя і нязведаныя», прысвечаны А.М. Кулакоўскаму, прайшоў у рамках літаратурна-краязнаўчага аб'яднання «Вытокі». Арганізатары вечара пастараліся, каб госці мерапрыемства адчулі значнасць і актуальнасць творчай спадчыны пісьменніка. Яркім момантам стала інсцэніроўка па творах А. Кулакоўскага «Родныя шыроты» і «Расце мята пад акном».

**Пліская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна** правяла краязнаўчае падарожжа «Літаратурнымі сцяжынкамі роднага горада».

У **ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка»** працягваў дзейнасць клуб паэтаў «Арэскія вытокі».

Насычанай была сустрэча-прэзентацыя кнігі «Была нядзеля, і мы дудзелі» пісьменніка Віктара Вацлававіча Сабалеўскага, карэспандэнта раённай газеты «Чырвоная зорка», якая прайшла ў **ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса».** Аўтар кнігі расказаў пра натхненне, якое спрыяла напісанню новай кнігі, пачытаў урыўкі з твораў, пагутарыў з прысутнымі, падарыў бібліятэцы сваю кнігу з аўтографам.

Яшчэ адным з напрамкаў дзейнасці бібліятэк была арганізацыя і правядзенне мерапраемстваў, прысвечаных сучасным дзеячам беларускай літаратуры.

У 2018 годзе клуб творчых сустрэч **Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі** працягваў збіраць новых сяброў. Госцем клуба стала маладая паэтка і празаік Кася

Кавалёнак-Глухоўская, аўтар зборніка вершаў «Калі дрэвы растуць з галавы». Да Тыдня паэзіі была прымеркавана творчая сустрэча «У вершы можна свет змясціць» з маладымі паэткамі Дар'яй Міллер і Вольгай Бяловай. У чэрвені адбылася літаратурная сустрэча з маладой паэткай, пісьменніцай Нінай Лістотай (Шчэрбачэвіч), якая прэзентавала сваю новую кнігу «Каханне».

Да Сусветнага дня паэзіі сумесна з літаратурна-мастацкім аб'яднаннем «Рунь» у **ДУК «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка»** прайшла сустрэча-ўспамін «На крылах паэзіі» па творчасці былых удзельнікаў «Руні» – А. А. Гедройца, І. М. Асіпацкага, М. А. Палякова.

Шмат цёплых водгукаў мела сустрэча з вядомымі беларускімі аўтарамі – паэткай Інай Фраловай і празаікам Сяргеем Трахімёнкам у **Бібліятэцы сямейнага чытання Вілейскага раёна**.

Літаратурна-музычная імпрэза «Я да цябе прапісан, мой край…» з удзелам члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтам, празаікам, кампазітарам, вядучым рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзмітрыем Пятровічам і Васілём Найдзіным: празаікам, сатырыкам, гумарыстам, пры ўдзеле членаў літаратурнага аб'яднання «Голас» была **праведзена Клецкай цэнтральнай раённай бібліятэкай**.

Адно з паседжанняў літаратурнага аб'яднання «Рунь» **Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэкі** было прысвечана 85-гадоваму юбілею выдатнага педагога, журналіста, краязнаўца, В. А. Несцяровіча, які з'яўляецца актыўным членам літаратурнага аб'яднання.

Цікавая творчая сустрэча «Літаратура і сучаснасць» прайшла з маладым пісьменнікам Андрусём Горватам, аўтарам кнігі «Радзіва «Прудок» у **ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка».** Аўтар распавядаў аб сваім жыцці, пазнаёміў чытачоў з кнігай, гісторыяй яе напісання, адказваў на пытанні. Прысутныя на сустрэчы акунуліся ў атмасферу цёплага, нязмушанага дыялога,

адкрытай шчырасці, ветлівасці, узаемаразумення слухачоў і пісьменніка.

Сустрэча з таленавітым майстрам слова Анатолем Зэкавым прайшла ў **Пятрышкаўскай сельскай бібліятэцы Мінскага раёна.**

На творчую сустрэчу «Ни секунды тишины…» з «сонечным» паэтам Дзмітрыем Юртаевым запрасіла **Навасельская сельская бібліятэка Мінскага раёна.** Паэт валодае немаверным пачуццём гумару і сустрэча адпавядала сутнасці аднайменнай назвы кнігі. Творчая асоба пісьменніка Дзмітрыя Юртаева не пакінула раўнадушным ні аднаго ўдзельніка мерапрыемства. Яго вершы і дзеянні бударажылі нават самых спакойных хлопчыкаў і дзяўчынак. Усім хацелася прыняць удзел, а тым больш атрымаць прыз ад пісьменніка.

На творчую сустрэчу з беларускай пісьменніцай, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, членам Саюза пісьменнікаў Расіі, заслужанай журналісткай Беларускага саюза журналістаў Аленай Анатольеўнай Стэльмах «Кніга чараўніцтва» запрасіла **Ждановіцкая сельская бібліятэка Мінскага раёна.**

«А душа – нераскрытая кніга...» – пад такой назвай у **Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** адбылася творчая сустрэча з членамі Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў (МАПП) Тамарай Кавальчук, Алай Ярмак-Герасімавай і Мікалаем Герасімавым.

У **Смалявіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М. Багдановіча** ў рамках паэтычнай пятніцы адбылася сустрэча з пераможцай Міжнароднага конкурсу паэзіі «Славянскія традыцыі» ў намінацыі «Вершы пра каханне», членам журы розных прэстыжных літаратурных конкурсаў, паэткай Таццянай Шэінай.

У **Сінягоўскай сельскай бібліятэцы Старадарожскага раёна** ў рамках раённага агляду-конкурсу па прапагандзе творчасці пісьменнікаў-юбіляраў «Юбилей

писателя-праздник для читателя» адбыўся вечар – партрэт Алеся Усені «Хачу на сваю Планету».

У Міжнародны дзень паэзіі **ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса»** сумесна з раённым Домам культуры правялі юбілейную вечарыну «З родным словам у сэрцы» з нагоды дня нараджэння члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Т. Цехнебедзінай і прэзентацыі яе новай кніжкі для дзяцей «Соніны канікулы».

## Электронныя рэсурсы

У справаздачным годзе бібліятэкі вобласці працягвалі папаўняць свае бібліяграфічныя БД «Краязнаўства» электроннага каталога. На канец года агульная колькасць краязнаўчых запісаў складае: у **ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік»** – 4547**, ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» –** 22620**, сетка публічных бібліятэк Лагойскага раёна –** 8029, **ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка»** – 3798, **ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка» –** 4518, **ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка»** – 3919.

Працягваўся збор матэрыялаў для папаўнення мясцовых баз і банкаў дадзеных уласнай генерацыі: «Память Борисовшины», «Вяртанне да вытокаў», «Слово краеведа» **(ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева»),** «Жодиноведение» (**ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна»**), «Капыльшчына» **(ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі»),** «Пісьменнікі роднага краю», «Прыродныя рэсурсы Клецкага раёна», «Народныя традыцыі і абрады» **(ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка»),** «Памяць Мядзельшчыны», «М. Танк» (**ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка»**), «Памятнымі мясцінамі Салігоршчыны», «Солигорщина: вчера и сегодня» **(ДУК «Салігорская раённая цэнтральная**

**бібліятэка»),** «Случчына» **(ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка»),** «Памяць Старадарожчыны» **(ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка»),** «Майстры роднага краю» **(Старадарожская сельская бібліятэка Старадарожскага раёна).**

У **ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»** працягвалася работа над стварэннем электроннага рэсурса «Аграрны калейдаскоп: гісторыя развіцця сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Дзяржыншчыны».

У **ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна»** працягвалася работа па стварэнні электронных прзентацый з серыі «ЖЗЛ города Жодзіна»: «Жодзіна мастацкі», «Жодзіна спартыўны», «Знакамітасці ў гісторыі Жодзіна».

**У ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка»** распрацаваны макет поўнатэкставай БД «Краязнаўства» і праведзена работа па яе напаўненню бібліяграфічнымі і фактаграфічнымі матэрыяламі па ўсіх раздзелах краязнаўства, у т. л. «Максім Багдановіч ў Ракуцёўшчыне»,»Вязынка – калыска Купалы».

Бібліятэкарамі **Лучнікоўскай сельскай бібліятэкі-філіяла № 7 Слуцкага раёна** прадоўжана праца па папаўненні поўнатэкставых баз дадзеных «Лучнікоўскі летапіс» і «Случчанская хроніка».

**Дзіцячым аддзелам Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі** фарміруецца краязнаўчая поўнатэкставая база дадзеных «Горад дзевяці стагоддзяў», якая на канец справаздачнага года налічвае 2351 бібліяграфічнае апісанне кніг, артыкулаў са зборнікаў, перыёдыкі, нотных і выяўленчых выданняў, электронных дыскаў, матэрыялаў Інтэрнэту.

## Выдавецкая дзейнасць

Штогод кожная раённая бібліятэка вобласці выпускае «Каляндар знамянальных і памятных дат» і бібліяграфічны паказальнік «Што чытаць аб раёне» ці «Літаратура аб раёне».

У справаздачным годзе супрацоўнікі **ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева»** прынялі актыўны ўдзел у стварэнні краязнаўчых выданняў «Лошница» і «Забашавічы» з серыі «Малая родина: Борисовский район» выдавецтва «Четыре четверти».

**ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка»** здзейснены выданні краязнаўча-інфармацыйнага даведніка «Людзі – якія нас здзівілі: навукоўцы Бярэзінскага раёна» серыі «Славутыя людзі Бярэзіншчыны», краязнаўча-рэкламных даведнікаў «Вось дык вёска! Вось дык мы!», «Беразіно – горад жанчын» і зборнік публіцыстыкі народнага журналіста Н. Бурко «Гісторыі ў лёсах».

У ДУК «**Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Н. Новік»** паспяхова развіваецца выдавецкая дзейнасць ў рамках праекта «Чытаем кнігі мясцовых аўтараў». За 2018 год было выдадзена 4 кнігі (Гарчакова, А. «Несупынная плынь жыцця», Капцюг, Г. «На дарогах жыцця», Пукело, Л. «Полотно жизни» Лазовік, М. «Душа радкі дыктуе»).

**Дзяржынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай** падрыхтаваны і выдадзены тэматычны зборнік удзельнікаў літаратурнага клуба «Выток» «Малая радзіма — часцінка душы», а таксама зборнік вершаў удзельнікаў літаратурнага клуба «Выток» і літаратурнага аб’яднання «Нёманец», прысвечаных 80-годдзю з дня ўтварэння Мінскай вобласці «Міншчына – ты». Выдадзена інфармацыйна–бібліяграфічнае выданне «Праваслаўныя святыні Дзяржыншчыны» і аднайменны пуцевадзіцель; «Святы вёсак Дзяржыншчыны. 2017»; «Легенды і паданні Дзяржыншчыны»; камплект паштовак помнікаў матэрыяльнай і нематэрыяльнай культуры раёна «Любіць сваё». Распрацаваны і выдадзены шэраг

метадычных матэрыялаў і рэкамендацый, скіраваных на папулярызацыю творчасці пісьменнікаў-землякоў і вядомых асоб Дзяржыншчыны.

**ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна»** выдадзены інфармацыйны буклет «Іх імёны ў гісторыі БЕЛАЗа» да 70-годдзя ААТ «БЕЛАЗ».

У **ДУК «Крупская цэнтральная раённая бібліятэка ім. Я. Купалы»** выдадзены зборнік вершаў паэтаў-землякоў аб каханні «Нязгаснае святло кахання». Працягвалася праца па стварэнні буклетаў з серыі «Знакамітыя людзі Крупшчыны» і «Знакамітыя землякі-героі вайны».

**Аддзелам абслугоўвання і інфармацыі і аддзелам бібліятэчнага маркетынгу Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэкі** былі выдадзены: бібліяграфічны паказальнік «Лагойшчына: мінулае і сучаснае», у які ўключаны матэрыялы, надрукаваныя ў 2017 годзе, краязнаўчы каляндар «Лагойшчына – 2019». Вядомым землякам, ганаровым людям Лагойскага раёна, г. Лагойска, г. п. Плешчаніцы, прысвечаны буклеты «Ганаровыя грамадзяне Лагойскага раёна», «Ганаровыя грамадзяне г. Лагойска», «Ганаровыя грамадзяне г. п. Плешчаніцы», а таксама матэрыял пра С. Ф. Давідовіча «Люблю сваю Радзіму надзвычайна!...».

**Любанскай раённай цэнтральнай бібліятэкай** ажыццяўляўся выпуск выдавецкай прадукцыі ў рамках серыі «Любаншчына літаратурная».

**ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча»** падрыхтаваны і выдадзены краязнаўчы даведнік «Славутыя людзі Маладзечаншчыны», зборнік работ пераможцаў раённага літаратурна-мастацкага конкурса сярод вучняў Маладзечаншчыны «Пра цябе, мой родны край».

**ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка»** распрацавала буклет «Юбіляры Мядзельшчыны» на 2019 г.

**Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкай** быў выдадзены краязнаўчы нарыс «Чалавек, які апярэдзіў час: Якуб Наркевіч-Ёдка беларускі прыродазнавец, вынаходнік, медык, прафесар: да 170-годдзя з дня нараджэння».

**Смалявіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкай імя М. Багдановіча** былі выдадзены зборнікі з серыі «Літаратурная спадчына Смалявіччыны»: «Гармония» аматарскага аб'яднання «Самородок», гістарычная аповесць Тамары Несцяровіч «Марта и Миндовг».

**Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэкай** былі падрыхтаваны бібліяграфічныя паказальнікі: з серыі «Наши земляки» «Летапісец горада» (да 105-годдзя з дня нараджэння пісьменніка-земляка А. Кулакоўскага), з серыі «Предприятия Солигорска» Вып. 2. ОАО «Солигорская птицефабрика» і Вып. 3. «Соль земли белорусской – ОАО «Беларуськалий».

**Стаўбцоўскай цэнтральнай раённай бібліятэкай** ў рамках клуба «Краязнаўца» былі распрацаваны буклеты «Касцел Святога Казіміра ў Стоўбцах», «Царква ў вёсцы Мікалаеўшчына».

## Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей

### *Асноўныя паказчыкі дзіцячых бібліятэк*

У 2018 годзе бібліятэчным абслугоўваннем дзіцячага насельніцтва Мінскай вобласці займалася 21 дзіцячая бібліятэка.

Паслугамі публічных бібліятэк вобласці карысталіся 152,4 тыс. чытачоў-дзяцей (у 2017 годзе – 151,5 тыс.). Чытачамі **дзіцячых бібліятэк** з'яўляліся 46,3 тыс.чалавек (у 2017 годзе – 46,4 тыс.) Карыстальнікам было выдадзена 635,5 тыс.экз.дакументаў (у 2017 годзе – 726,5 тыс.).

Дзіцячы чытач складае 37,1 % ад агульнай колькасці карыстальнікаў(410,7 тыс.).

Колькасць карыстальнікаў дзіцячых бібліятэк, акрамя дзяцей да 15 гадоў, складаюць таксама бацькі, настаўнікі, вучні старэйшых класаў, студэнты.

З мэтай рэалізацыі дзяржаўнай бібліятэчнай палітыкі, накіраванай на захаванне і развіццё патэнцыялу сельскіх тэрыторый, у вобласці функцыянуюць 269 бібліятэк аграгарадкоў, якімі далучана да чытання 44,1 тыс. дзяцей і падлеткаў (у 2017 г. – 43,9; у 2016 г. – 43,1 тыс.).

Галоўны прыярытэт у дзейнасці дзіцячых бібліятэк Мінскай вобласці – далучэнне юных карыстальнікаў да бібліятэкі і чытання, таму асаблівая ўвага надавалася выкананню прагнозных паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2016-2020 гады, якая прадугледжвае штогадовы прырост колькасці наведванняў на 4%.

У 2018 годзе колькасць наведванняў у дзіцячых бібліятэках склала 402,5 тыс.наведванняў (у 2017 г. – 403,3 тыс.; 2016 г. – 356,5 тыс., 2015 г. – 425,5 тыс.).

Актыўнасць наведвання дзіцячых бібліятэк па вобласці склала 8,7 (у 2017 г. – 8,7), чытальнасць – 16,6 (у 2017г. – 21), абарачальнасць фонду - 1,8 (у 2017 г. – 2,2).

Для таго каб заставацца патрэбнымі і цікавымі для карыстальнікаў, дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны не сыняюцца ў асваенні новых, часам нязвыклых, але эфектыўных форм працы. Актыўна ўкараняюцца інтэрактыўныя формы, шырока выкарыстоўваюцца сучасныя тэхналогіі: віртуальныя падарожжы, відэаролікі, слайд-гутаркі, слайд-рэпартажы, кніжныя міні-тэатры, дні электроннай кнігі і інш. Пры правядзенні масавых мерапрыемстваў удала спалучаецца кніжны матэрыял, гульнёва-забаўляльныя элементы, мультымедыйныя прэзентацыі, кліпы і электронныя гульні, якія павышаюць якасны ўзровень бібліятэчных мерапрыемстваў.

Супрацоўнікі дзіцячых бібліятэк стараюцца стварыць камфортнае бібліятэчнае асяроддзе, якое адпавядала б разнастайным інтарэсам карыстальнікаў. Прастора бібліятэк будуецца ў адпаведнасці з узроставымі асаблівасцямі

чытачоў. У аздабленні інтэр’ера выяўляецца асабісты падыход кожнай бібліятэкі да арганізацыі бібліятэчнай прасторы для дзяцей. Аднак для выканання задач Дзяржаўнай праграмы неабходна паскорыць прырост наведванняў.

Бібліятэчны фонд дзіцячых бібліятэк вобласці налічвае 436,5 тыс. экз. дакументаў (у 2017 г. – 443,6 тыс.экз.; у 2016 г.– 453,1 тыс.экз.).

У сярэднім на адну бібліятэку прыходзіцца 20,7 тыс. экз. (у 2017 г. – 21,1 тыс.экз.; у 2016 г.– 21,6 тыс.экз.).

Доля выбыцця выданняў з агульнага фонду дзіцячых бібліятэк склала 29,1 тыс.экз. (у 2017 г. – 29,4 тыс.экз.; у 2016 г.– 28,8 тыс.экз.).

Новыя паступленні налічваюць 16 тыс. экз. (у 2017 г. – 17,4 тыс.экз.; у 2016 г. –17,3 тыс. экз.). З іх новых кніг –7,6 тыс.экз. (у 2017 г.было 7,1 тыс. экз.; у 2016 г. – 7 тыс.экз.). Лічба аб’ёму паступленняў новых кніг у дзіцячыя бібліятэкі раёнаў на працягу года вызначаецца неаднолькавасцю: ад 152 экз.дакументаў (Чэрвеньская ДБ), 185 экз.дакументаў (Клецкая ДБ), 463 экз.дакументаў (Крупская ДБ), 663 экз.дакуметаў (Уздзенская ДБ) да 853 экз. дакументаў (Салігорская ДБ), 803 экз.дакуметаў (Старадарожская ДБ)

Пры камплектаванні фондаў дзіцячых бібліятэк Міншчыны асаблівая ўвага надавалася набыццю літаратуры ў дапамогу навучальнаму працэсу, літаратуры па пазакласным чытанні, сацыяльна значнай літаратуры, твораў сучасных аўтараў і павышанага попыту. Але надзённым пытаннем застаецца папаўненне кніжных фондаў сучаснай галіновай і мастацкай літаратурай для дзяцей. Сродкі, якія выдзяляюцца на камплектаванне кніжнага фонду, нязначныя. Аб гэтым сведчыць абмежаваны спіс паступленняў новых кніг для дзяцей у сельскія філіялы.

Падпіска на перыядычныя выданні (часопісы) – 598 назваў (у 2017 г. – 658; у 2016 г. – 749; у 2015 г. – 916) спрыяе падтрымцы інфармацыйнага патэнцыялу і прыцягненню ў дзіцячыя бібліятэкі юных наведвальнікаў. Аднак нягледзячы на значэнне перыядычных выданняў

у інфармацыйным забеспячэнні чытача, з году ў год у бібліятэках Мінскай вобласці назіраецца тэндэнцыя да скарачэння колькасці назваў дзіцячых часопісаў і газет. Гэта звязана з пастаянным ростам коштаў на падпісныя выданні і зніжэннем узроўню фінансавання на падпіску. Сельскія бібліятэкі прапаноўваюць юным чытачам 5–8 назваў часопісаў. Нядрэнна камплектуюцца перыёдыкай Валожынская ДБ(55 назваў часопісаў), Старадарожская ДБ (52 назвы часопісаў), Стаўбцоўская ДБ (44 назвы часопісаў), Мядзельская ДБ (43 назвы часопісаў), Чэрвеньская ДБ (41 назва часопісаў).

З мэтай раскрыцця кніжных фондаў у дзіцячах бібліятэках сістэматычна афармляліся прагляды літаратуры, тэматычныя паліцы, кніжныя выставы. Выставы не толькі прыцягваюць увагу, але і актывізуюць пазнавальную дзейнасць чытачоў, заахвочваюць звяртацца да літаратурных першакрыніц. Фармат кніжных выстаў у дзіцячых бібліятэках вобласці вельмі разнастайны. Гэта і выстава-панарама, рэпартаж, інфармацыя, інсталяцыя, заклік, папярэджанне, віншаванне і інш.

Па-ранейшаму бібліятэкі вобласці надавалі значную ўвагу выкананню платных паслуг. Дадатковыя платныя бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі арыентаваны на задавальненне запытаў наведвальнікаў, на даступнасць і камфортнасць карыстання інфармацыйнымі рэсурсамі. Найбольш запатрабаванымі былі наступныя: ксеракапіраванне і сканіраванне дакументаў; выдача кніг з камерцыйнага фонду бібліятэкі; выдача аўдыёвізуальных матэрыялаў; раздрукоўка на прынтары; набор тэкста; пошук інфармацыі ў сетцы Інтэрнэт; выкананне даведак і тэматычных падборак; правядзенне масавых мерапрыемстваў паводле замовы навучальных устаноў, выступленні лялечных тэатраў і інш.

Працягваецца працэс камп’ютарызацыі дзіцячых бібліятэк, насычэненне іх электронным, аўдыёвізуальным абсталяваннем. У Мінскай вобласці камп’ютарызавана

21 дзіцячая бібліятэка. У дзіцячых бібліятэках налічваецца 39 камп’ютараў. Доступ у Інтэрнэт і электронную почту маюць 19 бібліятэк.

Развіццё камп'ютарных тэхналогій, якія бібліятэкары актыўна выкарыстоўваюць у сваёй працы, дало магчымасць дзіцячым бібліятэкам вобласці стаць больш канкурэнтаздольнымі на рынку інфармацыйна-адукацыйных паслуг, прыцягнула ў бібліятэкі новых карыстальнікаў.

Бібліятэкары імкнуцца навучыць дзяцей арыентавацца ў інфармацыйнай прасторы, наладзіць масты паміж кнігай, чытаннем і камп’ютарам. Інтэрнэт, электронная пошта палегчылі магчымасць прафесійных зносін, дазволяюць дзіцячым бібліятэкам абменьвацца інфармацыяй, быць актыўнымі ўдзельнікамі рэспубліканскага і сусветнга інфармацыйнага працэсу.

Найбольш эфектыўны спосаб агляду дзейнасці дзіцячых бібліятэк – іх рэкламаванне**.** Мэтай рэкламных кампаній з'яўляюцца прыцягненне ў бібліятэку новых карыстальнікаў, актывізацыя чытання і сістэматычнага наведвання бібліятэкі юнымі чытачамі.

Традыцыйнымі ў рэкламе дзіцячых бібліятэк застаюцца экскурсіі, дні адчыненых дзвярэй, прэзентацыі праектаў бібліятэк, рэкламныя акцыі, піяр-апытанні, флэшмобы і інш.

Дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны актыўна асвойваюць магчымасці сацыяльных сетак для рэкламы бібліятэчных мерапрыемстваў, папулярызацыі кнігі і чытання, прафесійных кантактаў. У гэтых мэтах ствараюцца сайты дзіцячых бібліятэк, асабістыя блогі, старонкі ў сацыяльных сетках «Фэйсбук», «УКантакце», «Аднакласнікі» і «Instagram», дзе адлюстроўваецца праца бібліятэк, аб дзейнасці дзіцячых бібліятэк ведаюць чытачы, бібліятэкі з бліжняга замежжа, адбываецца абмен вопытам. На сваіх афіцыйных сайтах бібліятэкі даюць спасылкі

на прадстаўніцтвы ў сацыяльных сетках, што значна палягчае карыстальнікам працэс іх выяўлення.

Трывалыя кантакты з мясцовымі сродкамі масавай інфармацыі дапамагаюць бібліятэкам знаёміць жыхароў з падзеямі бібліятэчнага жыцця раёна, з гісторыяй роднага краю.

Значна пашырыліся кантакты бібліятэк Міншчыны з установамі, якія займаюцца выхаваннем дзяцей: агульнаадукацыйнымі школамі, дзіцячымі садкамі, цэнтрамі карэкцыйнага развіцця і рэабілітацыі дзяцей, з аддзяленнямі дзіцячага сацыяльнага прытулку, інспекцыямі па справах непаўналетніх, ассацыяцыямі шматдзетных сямей, школамі мастацтваў, аддзеламі па рабоце з моладдзю, раённымі камітэтамі ГА «БРСМ», цэнтрамі творчасці дзяцей і моладзі, тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, раённымі арганізацыямі ветэранаў, інспекцыямі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, гісторыка-краязнаўчымі музеямі, летнімі аздараўленчымі лагерамі і іншымі. Наладжваюцца таксама партнёрскія сувязі з іншымі дзіцячымі бібліятэкамі, Саюзам пісьменнікаў Беларусі, Мінскай грамадскай арганізацыяй «Дети не для насилия», праваслаўнай царквой і інш.

Сацыяльная тэматыка сёння закранула многія напрамкі дзейнасці дзіцячых бібліятэк. Павялічылася яе роля ў інфармацыйнай рабоце, ствараюцца банкі дадзеных, дзе змешчана інфармацыя па праблемах дзяцінства, аб сацыяльна-псіхалагічных службах , дзе можна атрымаць інфармацыю па такіх пытаннх, як правы дзіцяці, дзеці-сіроты, прыёмная сям'я, цэнтры дзіцячай творчасці, навучальныя ўстановых, тэлефоны службаў даверу, выратавання, занятасці і іншыя.

Сучаснымі інфармацыйна-адукацыйнымі цэнтрамі з’яўляюцца дзіцячыя аддзелы Барысаўскай ЦРБ, Слуцкай РЦБ, Бярэзінская ДБ, Салігорская ДБ, Валожынская ДБ, Уздзенская ДБ, Пухавіцкая ДБ, бібліятэка сямейнага чытання «Верасок» Маладзечанскай ЦРБ, у якіх з мэтай

развіцця і ўдасканаленне інфармацыйна-адукацыйнай культуры, інтэлектуальнага росту і задавальнення пазнавальных запытаў дзяцей і падлеткаў працуюць інфармацыйна-адукацыйныя цэнтры. Магчымасці інфармацыйна-адукацыйных цэнтраў выкарыстоўваюцца пры правядзенні ўрокаў інфармацыйнай культуры. Наведвальнікі ІАЦ удзельнічаюць ў пазнавальных анлайн-гадзінах, медыяаглядах, медыяпрэзентацыях, анлайн-падарожжах, гадзінах анімацыі, турнірах знаўцаў камп'ютара, медыялекторыях і інш.

Працягваецца міжнароднае супрацоўніцтва. Дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ у год свайго 70-годдзя значна пашырыў супрацоўніцтва з Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкай імя А. П. Гайдара г. Масквы. Напярэдадні знамянальнай даты ў бібліятэцы былі арганізаваны Дні адчыненых дзвярэй, праходзілі экскурсіі па бібліятэцы, дзе былі падрыхтаваны экспазіцыі і выставачныя інсталяцыі: «Летопись славных событий», «Романтик тревожных лет», прысвечаныя А.П. Гайдару, «Книжная радуга», «Наши будни и праздники», «Путешествие в историю библиотеки», «Активные читатели», «Фотоэкскурсии по библиотечным мероприятиям разных лет». Праграма свята была вельмі насычанай. У інтэрактыўным дзіцячым цэнтры адукацыі і вольнага часу «Росток!» цэнтральнай бібліятэкі прайшла анлайн-гульня «Своя игра» (па творах А. П. Гайдара). Навучэнцы горада Барысава і Кліна (РФ) прынялі ўдзел у літаратурнай віктарыне. Адбыўся міжнародны круглы стол «Детская библиотека: вызовы времени и образы пространства», у якім прынялі ўдзел супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Мінскай абласной бібліятэкі ім. А. С. Пушкіна, сеткі дзіцячых бібліятэк г.Мінска, а таксама прадстаўнікі Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі. Адбылося скайп-уключэнне з ЦГДБ імя А.П. Гайдара» г.Масквы, прысутныя даведаліся аб рабоце бібліятэкі ў якасці культурна і метадычнага цэнтра маскоўскіх дзіцячых бібліятэк.

Адбыліся прамыя трансляцыі семінараў з метадычным аддзелам ЦГДБ ім. А.П. Гайдара г. Масквы «Литературная пятница в Гайдаровке», «Литературный кубик Рубика: разные грани подросткового чтения» і XXIV літаратурна-педагагічных чытаннях «Серьёзно о несерьёзном, или Образ мыши в фольклоре, литературе, философии и изобразительном искусстве»; сустрэчы са спецыялістамі ФГБУК «Российская государственная детская библиотека», у час якіх абмяркоўвалася праграма падтрымкі дзіцячага і юнацкага чытання.

Бібліятэкары прымалі ўдзел у міжнародным вебінары з ЦДБ імя А. П. Гайдара Клінскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы на тэму: «Жизнь и творчество Аркадия Гайдара», правялі анлайн-гульню «Чук и Гек» па творчасці А. П. Гайдара, уддзельнічалі ў міжнароднай дабрачыннай акцыі «Кораблик доброты» і ў акцыі па прыцягненні дзяцей дашкольнага ўзросту і іх бацькоў да чытання сучаснай дзіцячай літаратуры «Книжка на ладошке», абвешчанай муніцыпальнай бюджэтнай установай гарадской акругі Самары «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк».

Агульнарасійская акцыя «Гайдаровская френд-лента» ў «Фэйсбуку» прыцягнула ўсіх «гайдараўцаў» у групу «Гайдар XXI стагоддзя». Дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ таксама размясціў альбом сваіх спраў «Альбом Гайдаровского штаба».

На міжнароднай канферэнцыі «Современная библиотека для детей: опыт, традиции, инновации», якая праходзіла у цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэцы імя Н. Астроўскага г. Мінска, выступіла загадчыца дзіцячага аддзела Барысаўскай РЦБ з дакладам «Продвижение книги и чтения: новые возможности», а таксама загадчыца аддзела па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ выступіла з дакладам на тэму: «Библиотечные акции и проекты в поддержку детского чтения». Супрацоўнікі дзіцячага аддзела Слуцкай РЦБ падрыхтавалі выступленне па тэме: «Ай-стопер (eye-stopper) або Бібліятэка, якая спыняе погляд».

Бібліятэка сямейнага чытання «Верасок» Маладзечанскай ЦРБ праводзіла Дні Масквы пры падтрымцы пасольства Расіі ў Рэспубліцы Беларусь.

Уздзенская дзіцячая бібліятэка падтрымлівае сувязі з дзіцячай бібліятэкай МБУК «Шатурская міжпасялковая раённая бібліятэка» горада-пабраціма Шатура (Расія), а таксама прыняла ўдзел у IX Міжнароднай акцыі «Читаем детям о войне», ініцыяванай Самарскай абласной дзіцячай бібліятэкай і прысвечанай Дню Перамогі. У справаздачным годзе бібліятэку наведала шмат гасцей: дэлегацыі гарадоў-пабрацімаў з Расіі і Таджыкістана, удзельнікі выязнога пасяджэння Прэзідыума Савета Мінскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў і інш.

Тэлемост «Майстар роднага слова», прысвечаны Васілю Вітку, злучыў дзве бібліятэкі – Мінскую дзіцячую бібліятэку-філіял №6 імя Васіля Віткі і дзіцячы аддзел Слуцкай РЦБ. Падзяліцца вопытам сваёй працы з калегамі з раённых бібліятэк Брэсцкай вобласці супрацоўнікі дзіцячага аддзела Слуцкай РЦБ змаглі на скайп-канферэнцыі «Выкарыстанне інтэрактыўных форм у літаратурным развіцці дзяцей».

Змястоўная дзейнасць дзіцячых бібліятэк вобласці ажыццяўляецца праз уключэнне ў шматлікія дзяржаўныя, рэспубліканскія і абласныя праграмы: «Культура Беларусі» на 2016-2020 г.г., «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2016-2020 г.г., «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2016-2020 г.г., «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» на 2016-2020 г.г., «Энергазберажэнне» на 2016-2020 гг., «Аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва» на 2016–2020 гг., «Развіццё фізічнай культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь» на 2016-2020 г.г., «Пераадоленне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2011-2015 г.г. і на перыяд да 2020 года», «Міласэрнасць», «Памяць Міншчыны», «Дзеці. Сям’я. Кніга» і інш.

На падставе гэтых дакументаў распрацоўваліся рэгіянальныя праграмы і праекты, якія ахопліваюць шырокі спектр тэм і накіраваны на якаснае і аператыўнае задавальненне патрэб карыстальнікаў. Дзякуючы ім ствараецца уласны, арыгінальны вобраз дзіцячай ўстановы, з'яўляюцца новыя перспектывы развіцця. У дзіцячых бібліятэках рэалізуюцца такія праекты, як «Расцём разам з кнігай» і праграма «Клопат» па падтрымцы дзяцей з фізічнымі абмежаваннямі (Бярэзінская ДБ); «Любі свой край і услаўляй», «Дадзім надзею дзецям», «Цуды сваімі рукамі», «Бібліятэка для сям’і: выхавальнік на гадзіну» (аддзел па рабоце з дзецьмі Вілейскай РЦБ імя Г.Новік); «По малой Родине моей», «Оазис знаний», «Сказкотерапия как средство развития речи и творческих способностей у детей» (аддзел дзіцячага чытання Жодзінскай ЦГБ); «Дзеці.Сям’я. Бібліятэка», «Книга. Лето. Да здравствует библиотека!», «Зямля мая, святая і адзіная. Адраджэнне», «Через книгу к духовности» (Заслаўская ГДБ Мінскага раёна); «Будуем храм у душах», «Чытаем, вучымся, гуляем», «Разам з кнігай мы расцём» (Капыльская РДБ); «Растим читателя вместе», (Крупская ДБ); «Наш экадом – Мядзелшчына» (Мядзельская ДБ), «Да вытокаў сваіх вяртаемся», «Быць здаровым – гэта модна», «Кропелькі вечнасці», «Наша спадчына», «Далучыць да роднага слова», міні-праект «З кнігай да вытокаў духоўнасці» (бібліятэка сямейнага чытання «Верасок» Маладзечанскай ЦРБ), сацыяльны праект «Моё будущее» для дзяцей з сацыяльнага прытулку (Любанская РДБ); «Я расту разам з кнігай» (Пухавіцкая ДБ), «Библиокроха», «Зялёныя дні ў бібліятэцы» і праекты па папулярызацыі і прасоўванні чытання «ЗаЧтение» і «БиблиоЛеди» (аддзел па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ), краязнаўчы крэатыў-праект «Слуцк – валошка ў вянку Беларусі» (дзіцячы аддзел Слуцкай РЦБ), праграма па рабоце з сям’ёй і падтрымцы сямейнага чытання «Островок семейного чтения», гісторыка-краязнаўчы праект «Пазнаём Міншчыну разам», праекты па папулярызацыі творчасці беларускіх дзіцячых

пісьменнікаў «У пісьменніка – дзень нараджэння» і па арганізацыі чытання і вольнага часу дзяцей і падлеткаў у перыяд школьных канікул «Чатыры старонкі канікул» (Уздзенская ДБ), праграма па абслугоўванні дашкольнікаў «Чытаем кнігі – пазнаём свет» (Чэрвеньская ДБ), па рабоце з дзецьмі з абмежаванымі магчымасцямі «Мир равных возможностей», рэгіянальны мэтавы праект «Здоровый Я – здоровая страна!» (Салігорская ДБ); «Часопісны карагод» (Стаўбцоўская ДБ) і ншыя.

Кожная дзіцячая бібліятэка выпрацавала ўласную праграму арганізацыі абслугоўвання чытачоў з улікам спецыфікі рэгіёна і патрабаванняў канкрэтнага дзіцяці.

Па цікавых праектах працуе дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ ім. К.Х. Каладзеева: «Нам не жить друг без друга» – па прапагадзе беларускай літаратуры; «Читающие дети и подростки – читающая нация!» – па падтрымцы дзіцячага чытання, «Там, на неведомых дорожках…» – па прыцягненні да чытання дашкольнікаў і малодшых школьнікаў, «З думкаю пра Беларусь», па адраджэнні народнай культуры Беларусі. Праграма «К книге и чтению – через досуг и общение» складаецца з чатырох падпраграм: «Дзіця ў свеце правоў», для навучэнцаў 7–9 класаў; «Чалавек і прырода», для вучняў 5-6 класаў; «Будзь здаровым, моцным, адважным», для вучняў 6-7 класаў; «Асабістая бяспека», для вучняў 5–9 класаў.

Па мэтавых праграмах экалагічнай адукацыі і інфармацыі насельніцтва «Бібліятэка і экалогія», арганізацыі канікулярнага чытання і вольнага часу дзяцей і падлеткаў «Канікулы з карысцю», прапаганды і падтрымкі дзіцячага чытання для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту «Чытанне адкрывае свет» працуе Валожынская дзіцячая бібліятэка.

Дзяржынская ДБ працягвала рэалізацыю праекта па адраджэнні традыцый сямейнага чытання «Чароўны рукзачок», праграм маральна-духоўнага выхавання дзяцей «Сёння зярнятка, заўтра – раслінка», летняга чытання

«Бібліядворык: у летні дзень чытаць не лень», арганізацыі вольнага часу дзяцей і прыцягненне іх да кнігі і чытання «Радуга детства», па краязнаўству «Мая зямля, мае землякі» і праграмы міласэрнасці «Востраў надзеі». Пачалі рэалізацыю праекта «Книжки для подготовишки», мэта якога – прыцягненне дашкольнікаў і іх бацькоў да кніжнай культуры, да лепшых узораў айчыннай і замежнай літаратуры.

Старадарожская ДБ працягвала рэалізацыю праграм «Памяць Міншчыны», «Спадчына», «Родная мова», «Сэрцам кут замілаваны».

У Год малой радзімы ў Уздзенскай дзіцячай бібліятэцы быў распрацаваны праект «Ад зярнятка да каравая», накіраваны на фарміраванне ў дзяцей павагі да цяжкай працы хлебаробаў і пекараў, беражлівых адносін да хлеба, на паглыбленне ведаў пра хлеб і Радзіму. У намінацыі «Бібліятэка – героям жніва» раённая дзіцячая бібліятэка заняла першае месца.

Салігорская ДБ працавала паводле новага праекта «Книжное зёрнышко», мэтай якога з'яўляецца творчы падыход да развіцця дзіцяці, фарміраванне цікавасці да кнігі з дзяцінства.

Праца дзіцячых бібліятэк Мінскай вобласці па рэалізацыі праграмнай дзейнасці чарговы раз падкрэсліла важнасць адукацыйнай і асветніцкай працы бібліятэк.

Бібліятэкі Міншчыны значна актывізаваліся ў павышэнні сваёй ролі ў жыцці насельніцтва рэгіёна, пашырэнні функцый і дыяпазону бібліятэчных паслуг, распаўсюджванні чытання і кнігі сярод дзяцей і падлеткаў. Нездарма ў 2018 годзе Слуцк атрымаў ганаровы статус дружалюбнага да дзяцей горада. У гэтым заслуга і дзіцячага аддзела Слуцкай РЦБ, які з’яўляецца адкрытай пляцоўкай для ўсіх груп дзяцей, падлетаў і іх бацькоў.

Дзейснай формай прыцягнення чытачоў-дзяцей да рэалізацыі іх творчага патэнцыялу сталі аматарскія аб’яднанні, клубы і гурткі па розных захапленнях.

Пры дзіцячых бібліятэках вобласці дзейнічаюць 359 аматарскіх аб'яднанняў.

По цікавых праграмах працуюць клубы «Нить Ариадны», «Здоровяк», «Свирелька» і «Семейка» пры Капыльскай ДБ; «Падлетак» і «Казка», школа духоўнасці «Святло надзеі» пры Бярэзінскай ДБ; літаратурны клуб «Кругагляд» пры Валожынскай ДБ; школа «Зярняткі», студыя «Я чытаю! Я расту!» і клуб нясумных ідэй «Рабі, як Я» пры Дзяржынскай ДБ; гурток «Сонейка» пры дзіцячым аддзеле Вілейскай РЦБ; «Подросток», клубы выхадного дня «Смешарики» і «Игротека в библиотеке» пры аддзеле дзіцячага чытання Жодзінскай ЦГБ; «7 Я»; «У коле сяброў», «Казачная скарбонка» і эколага-краязнаўчы клуб «Крыніца» пры Заслаўскай ГДБ Мінскага раёна; літаратурна-пазнавальны клуб «Чабарок», «Правовой эрудит» і літаратурна-музычная гасцёўня «Натхненне» пры Клецкай ДБ; клуб для падлеткаў «Ровесник» і краязнаўчы клуб «Крынічка» пры Крупскай ДБ; «Чароўны куфэрак», «Вясёлая карусель» і «Мудрая сава» пры Пухавіцкай ДБ; дыскусійны клуб для падлеткаў «Пераломны ўзрост» пры Слуцкай ДБ; клуб выхаднога дня «Солнышко» пры Смалявіцкай ДБ; гурткі «Чамучка» і «Эрудыт», лялечны гурток «Пятрушка» пры Старадарожскай ДБ; клубы: дапытлівых «Чамучкі», экалагічны «Лесавічок», сямейнага адпачынку «Адпачываем усёй сям'ёй» і школа па далучэнні дашкольнікаў да чытання «Я не чытач – я толькі вучуся…» пры Узденскай ДБ; літаратурна-краязнаўчы клуб «Верасок», духоўна-маральнага выхавання «Вытокі» і экалагічны клуб «Чамучкі» пры Чэрвеньскай ДБ; школа экалагічнай культуры «Есть одна планета – сад…», экалагічны клуб «Лесовичок», клуб «Девичьи секреты», школа «Подросток: тревоги и надежды» і лялечны тэатр «Забава» пры Салігорскай ДБ; студыя прыгажосці «Гармонія» пры Стаўбцоўскай Д Б. У клубах выкарыстоўваюцца сучасныя формы работы з дзіцячым чытачом.

Нязменным поспехам у дашкольнікаў і малодшых школьнікаў Барысаўшчыны карысталіся пастаноўкі лямцавага тэатра «Вандроўны чамаданчык».

Юныя артысты лялечнага гуртка «Пятрушка» пры Бярэзінскай ДБ з вялікім задавальненнем наведваюць рэпетыцыі і пераўвасабляюцца ў сваіх любімых лялечных герояў.

Сістэматычнай і мэтанакіраванай дзейнасці Мядзельскай ДБ спрыяла работа аматарскага аб'яднання па выхаванні інфармацыйнай культуры «Сябры кнігі» і лялечнага гуртка «Лукоморье».

У рамках сямейнага клуба «Згода» раённай бібліятэкі працягвала працаваць студыя літаратурнага развіцця «Путешествие со сказкой» і дыскусійны клуб для падлеткаў «Дыялог» аддзела па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ. А дзейнасць клуба «Непаседы» на працягу года была накіравана на далучэнне дзяцей малодшага школьнага ўзросту да актыўнага чытання і развіцця творчых здольнасцей, арганізацыю займальнага працэсу пазнання і пашырэнне кругагляду юных чытачоў.

Наведвальнікі клуба «Праабражэнне» дзіцячага аддзела Слуцкай РЦБ працягвалі ўдзельнічаць у духоўна-краязнаўчым экскурсе «Па святых мясцінах Случчыны». У дзіцячым аддзеле з'явіўся тэатр «Забава», які стаў сапраўдным падарункам для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў.

Працягвалі працаваць літаратурнае аб'яднанне юных паэтаў «Першацвет» і экалагічны клуб для дзяцей малодшага ўзросту «Буслік» пры Старадарожскай ДБ.

Паспяхова працуе музей лялек у Салігорскай ДБ.

Неад'емнай часткай дзейнасці дзіцячых бібліятэк стала арганізацыя і правядзенне рознапланавых акцый. У практыку работы бібліятэк трывала увайшлі такія бібліятэчныя акцыі, як «Фото с Карлсоном», «Библиотека под зонтиком», «Найди друга», «Пункт обмена бонстиков», «Читаем детям о войне», «У Новы год з новай кнігай», «Любіце кнігу круглы год»,

«Падзяліся кнігай з сябрам», «Праз праваслаўную кнігу – да духоўнага адраджэння», «Плануйце лета, чытайце вось гэта!», «Размаўляй са мной па-беларуску», «Ёлка жаданняў», «Першыя чытачы студзеня», «Букет для мамы», «З кніжных старонак – на экран», «Сонечная сустрэча з кнігай», «Ноч ў бібліятэцы», «Приведи друга в библиотеку», «Творческая лаборатория на аллее фонарей», «Читающий десант в городском парке» і іншыя.

Дзіцячыя бібліятэкі пастаянна ўдзельнічаюць у рэспубліканскіх, абласных і раённых акцыях.

Дзіцячы аддзел Слуцкай РЦБ прыняў удзел у рэспубліканскай акцыі «Культурны маршрут «Мая Беларусь: сучасныя пісьменнікі – дзецям». На жадаючых прыняць удзел у літаратурным марафоне былі заведзены спецыяльна пафарбаваныя фармуляры з эмблемай акцыі, куды запісваліся выдадзеныя кнігі. Свае водгукі пра твор, які найбольш запомніўся, спадабаўся, заставіў задумацца ці суперажываць, дзеці змяшчалі на спецыяльным чаце «Чат на плоце». Такім чынам, ішла пастаянная папулярызацыя лепшых кніг на беларускай мове сярод юных наведвальнікаў бібліятэкі. Лепшыя работы юных мастакоў былі надрукаваны на старонках часопіса «Вясёлка». Былі створаны буктрэйлеры па творах В.Быкава, А.Бадака, Р.Баравіковай і іншых аўтараў.

Акцыя дапамагла супрацоўнікам аддзела падняць работу па папулярызацыі беларускай мовы і літаратуры на якасна новы ўзровень.

Салігорская дзіцячая бібліятэка ў рамках гэтай акцыі правяла творчую сустрэчу «Добрыя кнігі – сябры назаўжды» з беларускім пісьменнікам Анатолем Зэкавым, а таксама сустрэчы з дзіцячай пісьменніцай Ірынай Токаравай пад назвай «Укожнай кнізе жыве чараўніцтва» і «Праз кнігу ў свет прыгажосці» з дзіцячым пісьменнікам Міхаілам Пазняковым.

Уздзенская ДБ прыняла ўдзел у рэспубліканскіх акцыях «Нашы дзеці», «Лето с хорошей книгой», у акцыі Белаграпрамбанка па фінансавай адукаванасці «Твае Першыя

фінансы», у прафілактычнай міжведамаснай акцыі «Дружим с законом», у прафілактычнай акцыі «Безопасные каникулы».

У практыцы работы дзіцячых бібліятэк Міншчыны прыжылася такая форма далучэння юных чытачоў да чытання, як вулічная рэклама (выязныя пляцоўкі і арганізацыя дзіцячага чытання «пад адкрытым небам»): «С книжкой на скамейке», «Читающая скамейка», «Читай-дворик», «Книжка вышла погулять», «Литературный променад», «Книга на свежем воздухе», «Читающий бульвар», «Книжная аллея», «Литературная беседка в парке», «Читальный зал под открытым небом». Ствараюцца бібліятэчныя агітпункты ў скверы, у грамадскім транспарце, каля будынкаў бібліятэк арганізоўваюцца інфармацыйныя і гульнёвыя пляцоўкі, фотазоны.

Застаецца нязменнай традыцыя праводзіць у час веснавых канікул школьнікаў Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі**.** З цікавай насычанай праграмай пад назвай «Кніга – мой спадарожнік, мой сябар!» прайшоў Тыдзень кнігі у Бярэзінскай ДБ, «Кніг чароўныя старонкі» ў аддзеле па рабоце з дзецьмі Вілейскай РЦБ імя Г.Новік, «Очень любят праздник книжки и девчонки и мальчишки» ў Валожынскай ДБ, «Книги читаем – мир открываем» у Мядзельскай ДБ, «Давайте читать, чтоб творить и мечтать!» у аддзеле па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ імя П.Пранузы, «Як гэта выдатна – чытаць!» у Пухавіцкай ДБ, «С книгой вокруг света» ў Старадарожскай ДБ, «Чытаем кнігі – пазнаём свет» у Чэрвеньскай ДБ, «Ах, кто придумал книги эти…» у Салігорскай ДБ, «Не прожить на белом свете без любимых книжек детям» у бібліятэцы сямейнага чытання «Верасок» Маладзечанскай ЦРБ.

Цэлы тыдзень юных наведвальнікаў дзіцячых бібліятэк чакалі вясёлыя прыгоды, сустрэчы з казачнымі героямі і, вядома ж, падарункі. Шмат цікавых мерапрыемстваў прапаноўвалася юным карыстальнікам бібліятэк у гэтыя дні: святы і ранішнікі, прысвечаныя кнізе, конкурсы чытальнікаў вершаў, сустрэчы з пісьменнікамі, літаратурныя вечарыны,

гульнёвыя праграмы, эрудыт-конкурсы, фальклорныя гульні, гадзіны новай кнігі, інфармацыйныя кактэйлі, літаратурны ералаш і інш.

У вобласці наладжана сістэма фестываляў, аглядаў, конкурсаў, накіраваных на выяўленне і развіццё юных талентаў, выдаюцца зборнікі літаратурных работ школьнікаў.

Творча працуюць таленавітымі дзецьмі бібліятэкі Мінскага, Слуцкага, Бярэзінскага, Мядзельскага, Маладзечанскага, Узденскага, Нясвіжскага, Салігорскага, Вілейскага, Пухавіцкага раёнаў.

У бібліятэцы сямейнага чытання «Верасок» Маладзечанскай ЦРБ адбыўся раённы злёт юных талентаў «Пра цябе, мой родны край», прысвечаны Году малой радзімы.

Супрацоўнікі Бярэзінскай дзіцячай бібліятэкі да Году малой радзімы арганізавалі выставу малюнкаў юнай мастачкі Насці Філончык «Якім я бачу свой горад». На працягу года дзейнічалі фотавыставы «Зімовы настрой, «Мелодыя вясны», «Вось яно якое – лета», «Восеньскія эцюды», выставы дзіцячых малюнкаў «Матулька любая мая» і інш. Мядзелская ДБ прэзентавала выдадзены зборнік вершаў і апавяданняў «Юныя таленты Мядзельшчыны», аўтарамі якіх з’яўляюцца вучні гімназіі-інтэрната.

У рамках 3-га фестывалю паэзіі імя Паўлюка Пранузы ў аддзеле па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ адбыўся конкурс юных чытальнікаў «Чытаем Паўлюка Пранузу». Тут прайшоў таксама першы конкурс юных чытачак «БиблиоЛеди – 2018».

Раённы этап рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка» адбыўся ў дзіцячым аддзеле Слуцкай РЦБ, які быў прымеркаваны да Года малой радзімы. Ён прайшоў пад дэвізам «Чытаем шмат, чытаем разам, ствараем сябе і краіну!». Самыя таленавітыя дзеці з розных школ горада і раёна спаборнічалі ў чытанні вершаў пра Беларусь, пра радзіму, пра прыгажосць беларускай прыроды. Літаратурна-музычная кампазіцыя «Хай дабрынёй

напоўніцца душа!» Палазнік Ульяны кранула сэрцы ўсіх юных случчан і гасцей бібліятэкі. Дзяўчынка ад нараджэння не бачыць, але гэта не замінае ёй быць яркай, таленавітай, захопленай. Яна натхнёна прачытала вершы беларускіх і рускіх паэтаў пра Радзіму, пра любімы горад, пра маму, пра дабро, пра веру.

У Салігорскай дзіцячай бібліятэцы адбылося падвядзенне вынікаў літаратурнага конкурсу «У кожнага свой горад на зямлі», прысвечанага 60-гадоваму юбілею г.Салігорска.

У бібліятэках вобласці склалася цэласная сістэма выхаваўчай работы з дзецьмі ў летні час. Зрабіць адпачынак больш актыўным, карысным дапамагалі летнія праграмы чытання «Летняя фишка – читай с друзьями книжки» (Плешчаніцкая ДБ Лагойскага раёна), «Летом с книгой я дружу» (Мядзельская ДБ), «На кніжнай палянцы нашага лета» (Пухавіцкая ДБ), «Лета кліча, дзеці, вас да чытання кніг у нас» (аддзел па рабоце з дзецьмі Вілейскай РЦБ імя Г.Новік), «Бібліядворык: у летні дзень чытаць не лень» (аддзел абслугоўвання дзіцячага чытача Дзяржынскай РЦБ), «У книжек нет каникул» (аддзел па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ імя П.Пранузы), «Востраў Чыталія на планеце Лета» (Заслаўская ГДБ Мінскага раёна), «Сонца на кніжнай старонцы» (бібліятэка сямейнага чытання «Верасок Маладзечанскай ЦРБ імя М.Багдановіча), «Ключ от лета» (Смалявіцкая ДБ**),** «Летом некогда скучать, книги будем мы читать» (Старадарожская ДБ**),** «Пачытай са мною, Лета!» (Уздзенская ДБ), «Дзень добры, лета!» (Стаўбцоўская ДБ), «Большая перемена» (Крупская ДБ).

Для юных случчан была арганізавана літаратурна-гульнёвая праграма «Лета з добрай кнігай». Дзеці прынялі ўдзел у літаратурным марафоне «Кніжная эстафета сонечнага лета», у шматлікіх літаратурных гульнях, відэа-падарожжах, віктарынах, якія спалучалі карысную інфармацыю з гульнёвымі формамі. Дзіцячы аддзел Слуцкай РЦБ правёў VI фестываль-біенале летняга дзіцячага чытання «Кніжны

востраў у акіяне лета», вынікі былі падведзены напярэдадні Дня бібліятэк.

Усе праграмы летніх чытанняў накіраваны на падтрымку фарміравання чытацкай культуры дзяцей і падлеткаў, стымуляванне дзіцячага чытання.

У час летніх канікул праводзілася шмат масавых мерапрыемстваў для наведвальнікаў бібліятэкі і для дзяцей з летніх аздараўляючых пляцовак. Гэта былі літаратурныя гульні, віктарыны, літаратурныя гадзіны, гадзіны цікавых паведамленняў, урокі бяспекі, урокі дабрыні, відэакруізы, літаратурныя падарожжы, конкурсы на лепшых знаўцаў казак, агляды літаратуры і інш.

Дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны надаюць вялікую ўвагу разнастайным масавым формам мерапрыемстваў, якія дазваляюць змястоўна арганізаваць вольны час дзяцей, спрыяюць фарміраванню культуры зносін. Гэта і прэзентацыі лепшых дзіцячых кніг, і вечары-сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, літаратурныя вечары, конкурсы і фестывалі беларускай кнігі, паэтычныя рынгі, бюро літаратурных навінак, літаратурныя дыліжансы, дасье, дні новай кнігі, дні літаратурных гульняў, дні кніг-імяніннікаў, кніжнае дэфіле, літаратурныя салоны, паэтычныя арэлі, дні здароўя і экалогіі, урокі дабрыні, гадзіны грамадзянскасці, дні сям’і, гадзіны памяці і інш. У бібліятэках вобласці штогадовымі сталі такія мерапрыемствы, як «Прысвячэнне ў чытачы», «Развітанне з букваром», «Свята азбукі», «Дзень ведаў».

Дзейнасць бібліятэк па арганізацыі масавых мерапрыемстваў з кожным годам узбагачаецца інавацыйнымі формамі, набывае новыя рысы.

Пры правядзенні масавых мерапрыемстваў ужываліся інавацыйныя формы работы: бібліятэчны флэшмоб, лібмоб, квэсты, сіцікэшынг, бібліягід, літаратурны чамаданчык, інфармтуры, бібліяноч, бібліяпрыступкі, біблія-аўтобусы, дэгустацыя літаратурных навінак, літаратурнае караокэ, спрынт-конкурсы, шок-урокі, кардмейкінг на траве, воркшоп, фотакросінг, бібліяфэст, лэпбук, дыскусійныя арэлі, адкрыты

мікрафон. Арганізоўваюцца віртуальныя паходы, гульнёвыя зоны «Јоу-парк», развіваецца буккросінг, ствараюцца буктрэйлеры.

Нясвіжская ДБ арганізавала незвычайны смайл-квэст «Свидание с книгой вслепую» для цікаўных і кемлівых. Удзельнікі павінны былі адгадаць зашыфраваныя кнігі (аўтар і назва) і знайсці кожную ў фондзе бібліятэкі. А ў кнігах – падказкі, што складалі назву кнігі, якую неабходна было ўзяць, прачытаць і пакінуць водгук аб ёй.

Ужо другі год Дзяржынская дзіцячая бібліятэка праводзіць кніжны фрымаркет. Акрамя абмену кнігамі, тут было шмат забаў для дзяцей і дарослых. Працавала творчая лабараторыя «Детские руки творят чудеса». Самым маленькім прыйшлася даспадобы гульня-забава «Шчаслівы выпадак»: дзеці выцягвалі з ларца цукеркі і атрымлівалі нечаканыя падарункі. З вялікім імпэтам і задавальненнем дзеці «стваралі дзівосы» фарбамі на вялізным малюнку-расфарбоўцы.

Супрацоўнікі аддзела дзіцячага чытання Жодзінскай ЦБ у сваёй працы творча падыходзяць да правядзення мерапрыемстваў для падрастаючага пакалення. Выкарыстоўваюць такія формы работы, як бібляпазлы, паэтычны серпанцін, кніжныя жмуркі, гульнёвы лабірынт, інтэлект-батл, турнір знаўцаў, інфарм-тайм, аквагрым, крэатыў-лабараторыя, літаратурны каламбур і іншыя.

Дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны, не спыняючыся на дасягнутым, укараняючы іннавацыі ў практыку дзейнасці, імкнуцца больш поўна раскрываць свой творчы патэнцыял, каб чытанне заставалася адной з важнейшых сфер выхавання духоўнасці у дзяцей.

## Камплектаванне і арганізацыя адзінага фонду

На 01.01.2019 г. фонд публічных бібліятэк Мінскай вобласці складаюць 6 105 678 экз. дакументаў. За мінулы год, у параўнанні з 2017 г., ён паменшыўся на 180 775 экз.

У 2018 г. значная ўвага надавалася выкананню даручэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па накіраванні на камплектаванне фондаў бібліятэк не менш 12% грашовых сродкаў ад сумы бюджэтнага фінансавання на ўтрыманне гэтых устаноў.

Так, з бюджэту вобласці на камплектаванне бібліятэчных фондаў і набыццё правоў доступу да электронных інфармацыйных рэсурсаў выкарыстана 1,6 млн. рублеў, што складае 13,1 % ад бягучага фінансавання бібліятэк. Пры гэтым (у сярэднім па вобласці) 64,9 % ад сукупнага аб'ёму фінансавання было накіравана на аплату падпіскі на перыядычныя выданні. Толькі ў сетцы публічных бібліятэк Барысаўскага, Любанскага, Мінскага Пухавіцкага, Салігорскага, Уздзенскага раёнаў і г. Жодзіна выкарыстаныя на падпіску грашовыя сродкі склалі меней 60 %. У той жа час у некаторых сетках публічных бібліятэк аплата падпіскі перавышае 83 % ад агульнага памеру фінансавання. Рэпертуар перыядычных выданняў, якія атрымліваюць бібліятэкі вобласці, складае ў сярэднім 113 назваў часопісаў і 27 назваў газет.

З мясцовага бюджэту на набыццё кніг і другіх дакументаў (за выключэннем перыёдыкі) было выкарыстана 533,9 тыс. рублей. Сеткі публічных бібліятэк г. Жодзіна, Пухавіцкага, Мінскага і Барысаўскага раёнаў атрымалі на набыццё кніг і іншых дакументаў ад 61,6 % да 40,7 % ад агульнага аб'ёму бюджэтнага фінансавання, накіраванага на камплектаванне бібліятэчных фондаў. Сеткам публічных бібліятэк Салігорскага, Уздзенскага, Любанскага, Клецкага, Чэрвеньскага, Бярэзінскага, Маладзечанскага і Слуцкага раёнаў было выдзелена ад 39,7 % да 31,8 %; публічныя бібліятэкі Валожынскага, Дзяржынскага, Нясвіжскага,

Мядзельскага, Капыльскага, Старадарожскага, Крупскага, Вілейскага, Стаўбцоўскага, і Смалявіцкага раёнаў асвоілі ад 29,4 % да 14,5%. Толькі ў сетцы публічных бібліятэк Лагойскага раёна на набыццё кніг за кошт мясцовага бюджэту было выдзелена 6,4 % ад агульнага фінансавання, накіраванага на папаўненне фонду. За кошт мясцовага бюджэту было набыта 66 454 экз. дакументаў, у тым ліку 13 351 экз. сацыяльна значных выданняў.

Штогод бібліятэкі вобласці выкарыстоўваюць розныя крыніцы камплектавання. Так, дзякуючы падарункам чытачоў і розных арганізацый фонды бібліятэк папоўніліся на 21 825 экз. кніг на агульную суму 81,4 тыс. рублёў. За кошт рэспубліканскага бюджэту фонды бібліятэк папоўніліся на 3 315 экз. дакументаў на суму звыш 64,0 тыс. рублёў.

У выніку за 2018 г. праз розныя крыніцы камплектавання ў фонды публічных бібліятэк вобласці паступіла 239,3 экз. дакументаў. Большасць новых паступленняў застаецца ў цэнтральных бібліятэках.

Ва ўсіх сістэмах публічных бібліятэк вобласці ў сярэднім адзін сельскі філіял (без уліку бібліятэк аграгарадкоў) атрымліваў каля 109 экз. кніг. У той жа час адзін сельскі філіял сеткі публічных бібліятэк Нясвіжскага і Лагойскага раёнаў у сярэднім атрымаў 46 і 35 экз. кніг. Рэпертуар перыядычных выданняў па вобласці ў сярэднім складае 13 назваў часопісаў і 6 назваў газет.

Па-ранейшаму значная ўвага надавалася камплектаванню бібліятэк аграгарадкоў. У сярэднім адна бібліятэка аграгарадка атрымала каля 160 экз. кніг, 17 назваў часопісаў і 8 назваў газет.

Неабходнай умовай для якаснага напаўнення бібліятэчных фондаў з'яўляецца своечасовае выяўленне і выключэнне дакументаў састарэлага зместу, зношаных і дублетных. За 2018 г. з фонду публічных бібліятэк вобласці выключана 420,1 тыс. экз. дакументаў, у тым ліку кніг – 234,4 тыс. экз., перыядычных выданняў – 184,3 тыс. экз., іншых дакументаў – 1,4 тыс. экз. Дакументы выключаліся

па наступных прычынах: зношаныя – 45,9 %, састарэлага зместу – 4,6 % , дублетныя, страчаныя і іншыя прычыны – 5,6 %, па прычыне заканчэння тэрміну захоўвання – 43,9%.

## Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне

Даведачна-бібліяграфічная праца ахоплівае шматпланавыя працэсы і аперацыі з вялікімі масівамі інфармацыі: выяўленне і групоўку дакументаў розных галін ведаў, якасны адбор дакументаў, задавальненне складаных або нявызначаных чытацкіх запытаў, складанне бібліяграфічных дапаможнікаў, кансультаванне і інфармацыйнае навучанне чытачоў. Кожны з гэтых відаў працы накіраваны на выкананне адной з галоўных функцый бібліятэкі – інфармацыйнай.

Бібліятэкі Мінскай вобласці ажыццяўляюць даведачна-бібліяграфічнае, інфармацыйнае, кансультацыйнае абслугоўванне карыстальнікаў на аснове традыцыйных і сучасных інфармацыйных тэхналогій.

На працягу 2018 года працягвалася праца па выкананні **бібліяграфічных даведак**. Так, у бібліятэках Барысаўскага раёна ў 2018 годзе па запытах чытачоў было выканана 4369 бібліяграфічных даведак (у 2017 годзе – 2826). Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка вяла ўлік толькі складаных даведак, для якіх быў неабходны прагляд многіх крыніц. За 2018 год выканана 101 даведка (у 2017 годзе – 80). За справаздачны перыяд Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка выканала 926 бібліятэчна-бібліяграфічных даведак, што на 20 даведак менш у параўнанні з мінулым годам. Па запытах чытачоў у 2018 годзе бібліятэкамі г.Жодзіна была выканана 1521 бібліяграфічная даведка (у 2017 годзе – 1631). Бібліятэкі Дзяржынскага раёна выканалі 1513 даведак (у 2017 годзе – 1827).

Прычыну змяншэння запытаў можна патлумачыць павелічэннем колькасці уласных камп’ютараў з доступам у

Інтэрнэт у насельніцтва. Асноўнай катэгорыяй карыстальнікаў, якая звяртаецца па даведкі, з'яўляюцца навучэнцы школы, студэнты. Для іх падбіраецца матэрыял па інфарматыцы, гісторыі, тэхналогіі, літаратуразнаўству, геаграфіі і інш.

На працягу года ў бібліятэках праводзілася **ўдасканальванне сістэмы каталогаў і картатэк**: папаўненне і рэдагаванне, сістэматычны роспіс газетных і часопісных артыкулаў і г.д. Бібліятэкі вобласці дапоўнілі СКА новымі тэматычнымі рубрыкамі: «2018 – Год малой радзімы», «80-годдзе Мінскай вобласці», «Да 100-годдзя ўтварэння БССР».

На сённяшні дзень ва ўсіх раёнах Мінскай вобласці працуюць публічныя цэнтры прававой інфармацыі (ПЦПІ), якія ўяўляюць сабой пункты свабоднага доступу грамадзян да афіцыйна-прававой інфармацыі.

Усе раённыя бібліятэкі прадастаўляюць карыстальнікам доступ да прававой БД «Эталон», якая з’яўляецца дзяржаўным інфармацыйна-прававым рэсурсам Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь і дазваляе атрымаць хуткі доступ да эталоннай прававой інфармацыі ад першакрыніцы, а таксама да іншай найбольш запатрабаванай і карыснай інфармацыі: навінаў заканадаўства, даведнікаў, слоўнікаў юрыдычных тэрмінаў і азначэнняў і інш.

На 01.01.2019 у Мінскай вобласці дзейнічаюць 96 публічных цэнтраў прававой інфармацыі (ПЦПІ), у тым ліку на базе абласной бібліятэкі – 1, раённых і гарадскіх бібліятэк – 32, гарпасялковых і сельскіх бібліятэк – 63.

Агульны фонд ПЦПІ складае 47 200 экз. За перыяд 2018 года ў цэнтры ПЦПІ звярнуліся 5 700 карыстальнікаў, колькасць наведванняў склала 16 400, па іх запытах выдадзена каля 12 400 даведак. Колькасць зваротаў да БД «Эталон» складае 4 470.

Бібліятэкі Міншчыны паспяхова працуюць у сферы **бібліяграфічнага інфармавання**. У бібліятэках

Дзяржынскага раёна індывідуальную інфармацыю атрымалі 40 абанентаў, якія былі праінфармаваны аб 998 выданнях рознай тэматыкі: «Працоўнае заканадаўства», «Народная культура Беларусі», «Сацыяльныя аспекты рыначнай эканомікі», «Своечасовы і якасны разгляд просьбаў і запытаў грамадзян», «Музеі. Музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь» і інш. Групавую інфармацыю атрымлівалі 35 абанентаў. Усяго за год ім рэкамендавана 616 выданняў па тэмах: «Экалогія Беларусі: праблемы і перспектывы», «Цэны і цэнаўтварэнне», «Выхаваўчая сістэма сучаснай школы», «Развіццё сельскай гаспадаркі на сучасным этапе», «Дзейнасць сельскіх Саветаў на сучасным этапе», «Сучасная сістэма дашкольнага выхавання» і інш. У бібліятэках Клецкага раёна групавую інфармацыю атрымалі 54 калектывы, якія былі праінфармаваны па 58 тэмах. Калектыўную інфармацыю атрымліваюць жывёлагадоўчыя комплексы, малочна-таварныя фермы, рамонтныя майстэрні, праўленні СВК, сельскія Саветы, ФАПы, школы і іншыя. Індывідуальную інфармацыю па розных пытаннях прафесійнай дзейнасці атрымліваюць 76 абанентаў, якія інфармуюцца па 76 тэмах. Сельскія філіялы інфармуюць спецыялістаў сельскай гаспадаркі, фермераў, прадпрымальнікаў, інвалідаў, пенсіянераў, майстроў народных рамёстваў і іншых. Індывідуальнае інфармаванне бібліятэк Мінскага раёна было накіравана на задавальненне запатрабаванняў спецыялістаў сельскай гаспадаркі, настаўнікаў, работнікаў медыцыны, культуры і інш. Усяго на індывідуальнае інфармаванне бібліятэкамі было ўзята 54 абаненты па тэмах: «Рэлігія. Вераванні. Багаслоўе», «Изготовление сувениров из бумажной лозы», «Экалагічнае выхаванне», «Папулярызацыя беларускай літаратуры», «Эстэтычнае выхаванне»,»Народныя традыцыі ў сучасным поглядзе», «Гісторыя сусветнай культуры», «Логіка. Этыка. Сацыяльная філасофія», «Цікавыя звесткі з гісторыі». Групавую інфармацыю атрымалі калектывы прадпрыемстваў, арганізацыі аховы здароўя, школы і дзіцячыя сады,

культурныя ўстановы. 47 абанентаў узята на групавое інфармаванне па тэмах: «Дашкольнае інфармаванне», «Папулярызацыя новай сацыяльна значнай літаратуры сярод настаўнікаў», «Гігіена дзяўчынак», «Нетрадыцыйныя метады здароў'я», «Новае ў сельскай гаспадарцы». У цэнтральнай бібліятэцы Уздзенскага раёна на індывідуальным інфармаванні знаходзіліся 3 абаненты па тэмах: «Навінкі беларускага друку», «Кіраванне ў сферы культуры», «Работа з моладдзю», «Мастацтвазнаўства», «Новая мастацкая літаратура» і інш. Абанентамі індывідуальнага інфармавання з'яўляюцца кіруючыя работнікі і спецыялісты ў галіне культуры. На індывідуальным інфармаванні ў сельскіх бібліятэках знаходзіліся 22 абаненты па 25 тэмах: «Работа мясцовых органаў улады», «Навінкі літаратуры», «Жывёлагадоўля», «Рукадзелле», «Рыбалоўства», «Народная медыцына», «Дамаводства» і інш. Абанентамі індывідуальнага інфармавання ў бібліятэках раёна з'яўляюцца ў асноўным кіраўнікі і спецыялісты розных галін ведаў, а таксама аматары. Групавое інфармаванне ў цэнтральнай бібліятэцы Уздзенскага раёна ажыццяўлялася па 15 тэмах праз складанне штоквартальных спісаў для 5 абанентаў: ДУА «Уздзенскі дзіцячы сад № 3», ДУА «Уздзенскі цэнтр дашкольнага развіцця дзіцяці «Вясёлка», ДУА «Уздзенская раённая гімназія», ДУА «Уздзенская СШ № 2 імя К. Крапівы», ДУА «Уздзенская дзіцячая школа мастацтваў».

**Прапаганда ББВ (бібліяграфічныя ўрокі, дні бібліяграфіі, бібліяграфічныя агляды)** таксама добра арганізавана бібліятэкамі вобласці. На працягу года праводзілася навучанне чытачоў асновам інфармацыйна-бібліяграфічнай культуры ў бібліятэках Слуцкага раёна: вучняў – адпаведна плана бібліятэчных заняткаў «Асновы інфармацыйнай культуры на 2017-2018 навучальны год», дарослых – шляхам бібліяграфічных кансультацый. Усяго бібліятэкамі раёна было праведзена 159 бібліятэчных заняткаў і 43 дні бібліяграфіі: «У лабірынце кніжных цудаў»,

«Весь мир от А до Я откроет книжная страна», «Словари как связь слов с жизнью», «Юнга в море информации: библиокруиз», «Книжку быстро я найду»,»Каталог – Ваш компас в книжном мире», «Бібліяграфічны лабірынт», «Энцыклапедыі – ключ да ведаў», «Слова и словарики», «Наш помощник каталог – много тайн раскрыть помог», «От глиняной таблички до компьютерной странички», «О словарях разнообразных, одиноковых и разных», «Слоўнікі ўсе важныя, слоўнікі ўсе патрэбныя», «Упорядоченное множество… Каталоги и картотеки», «Бібліятэчны каталог як інфармацыйна-пошукавая сістэма», «Как не заблудиться в книжном мире», «Энцыклапедычны вулей», «Бібліятэчныя каталогі і карыстанне імі» і інш. У 2018 годзе было праведзена 69 бібліяграфічных урокаў бібліятэкамі Валожынскага раёна. Найбольш распаўсюджанымі былі бібліятэчна-бібліяграфічныя ўрокі-прэзентацыі «Знаёмства з бібліятэкай», якія праводзіліся для наведвальнікаў тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, для навучэнцаў сельскагаспадарчага ліцэя, для ўдзельніц жаночага клуба «Ледзі». Бібліятэкамі Дзяржынскага раёна за 2018 год праведзена 157 урокаў па асновах інфармацыйнай культуры. Праведзена 19 бібліяграфічных аглядаў: «Навінкі беларускага друку», «Беларускія часопісы – дзецям», «Кнігі-юбіляры 2018»;»ТОП-10 книг на тему: Как встречали Новый год литературные герои», «Міншчына – сэрца нашай велічнай Радзімы», «Наш боль, наша памяць – Хатынь». У справаздачным годзе бібліятэкамі Клецкага раёна было праведзена 56 дзён бібліяграфіі: «Свята беларускага пісьменства» «Беларускаму слову жыць», «Край в потоке информации», «Увесь свет у адным месцы», «Кнігі і іх стваральнікі», «Искусство быть читателем», «Пусть книги друзьями заходят в ваш дом», «Свет праваслаўнай кнігі», «Тысячи мудрых страниц», «Бібліяграфічны калейдаскоп», «В мир знаний через библиотеку», «Знаёмства з бібліятэкай»,

«Газеты і часопісы  для разумовага развіцця», «Таинственная паутина: ресурсы Интернет».

Бібліятэкі на працягу года вялі прапаганду бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў сярод навучэнцаў школ. Праведзена 20 аглядаў бібліяграфічных дапаможнікаў. Распаўсюджванню бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў і выхаванню культуры чытання ў бібліятэках Крупскага раёна спрыялі: дзень бібліяграфіі «Падарожжа ў краіну бібліяграфіі»; гадзіны ББВ: «Компас у кніжнае мора», «Даведачнае бюро бібліятэкі», «Як карыстацца ДБА»;  індывідуальныя і групавыя  гутаркі па ДБА. Усяго бібліятэкамі Лагойскага раёна было праведзена 104 бібліяграфічныя агляды па наступных тэмах: «Правдивые книги войны», «Новинки из книжной корзинки», «Мінская вобласць у кніжным фармаце», «Па дарогах Афганскай вайны, «Свет захапленняў», «Хутка экзамены», «Старонкі горычы», «Цудоўныя старонкі прыроды», «Жаночая гісторыя Беларусі», «Святыя мясціны Беларусі», «Кніга чакае чытача», «Сустрэча з гісторыяй», «Летапіс мужнасці» і інш. Бібліятэкамі Мінскага раёна было праведзена 56 бібліятэчна-бібліяграфічных урокаў, 80 экскурсій: Дзень адчыненых дзвярэй «Свята кніжнага дома», «Бібліятэка сустракае сяброў», «Учреждения культуры в сфере внебюджетной деятельности», «Книжкин дом»; экскурсія «Лес – наш сябра», «Прыступка ведаў», «Рады мы всегда гостям, приглашаем в гости к нам!», «У госці да Скарыны», «Журнальный коктейль», «Библиотека, книжка, я – вместе верные друзья», «Бібліятэка – дом кніг», «Скарбніца мудрасці»  і інш.У мэтах прапаганды бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў бібліятэкамі Стаўбцоўскага раёна праводзіліся індывідуальныя кансультацыі ў каталогаў і картатэк: «Вашы дарадчыкі – даведнікі і слоўнікі», «Будуем будучае разам», « Знакомьтесь – это библиотека», «Все профессии важны, все профессии нужны», «Книги, которые помогут всем», «Ключ к фонду библиотеки: каталоги и картотеки», «Твае першыя энцыклапедыі», «Гісторыя кнігі».

Трэба адзначыць і працу бібліятэк у падрыхтоўцы **бібліяграфічных выданняў**. Салігорская цэнтральная бібліятэка падрыхтавала бібліяграфічныя газеты: «Минской области – 80», «Летапісец горада», «Край мой – гонар мой», «Хатынь: символ вечной памяти и скорби». Бібліятэкамі Любанскага раёна падрыхтавана наступная бібліяграфічная і інфармацыйная прадукцыя: рэкамендацыйныя спісы, спісы-агляды «Пра маці з любоўю і пяшчотай», «Святкуе кніга юбілей», «Юбилейный калейдоскоп-2018», «Аматарам беларускай мастацкай літаратуры, «Маладая літаратура Беларусі; лістоўкі-рэкламкі серыі «Увага! Цікавая кніга!», лістоўкі-закладкі «Беларускія аўтары, якіх чытаюць сёння», шэраг закладак серыі «Вам, кветкаводы», закладкі-рэцэпты серыі «Смачна есці!», інфарм-закладкі «Маладосць» — гэта…», «Наша «Роднае слова» да юбілеяў часопісаў і інш. Выдаваўся штоквартальны спіс «Любаншчына на старонках рэспубліканскага друку». У 2018 годзе цэнтральнай бібліятэкай Слуцкага раёна былі выдадзены рэкамендацыйныя спісы літаратуры: «Выборы в местные Советы депутатов Республики Беларусь двадцать восьмого созыва», кніжная закладка «Навстречу выборам». Бібліятэкамі Дзяржынскага раёна распрацавана і надрукавана 11 інфармацыйных буклетаў: дата-буклет «1 МАЯ: история, традиции, современность», буклет-презентация «Библиотекарь — профессия будущего», буклет-мотиватор «Как быть счастливым», буклет-рецепт «Рецепты долгой жизни» і інш. Жодзінскай цэнтральнай бібліятэкай падрыхтаваны інфармацыйны буклет: «Ты одна такая – любимая, родная» да Дня матулі. Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэкай кожны месяц да адзінага дня інфармавання насельніцтва складаліся рэкамендацыйныя спісы літаратуры і спісы заканадаўчых актаў, якія рэгламентуюць тую ці іншаю дзейнасць. За 2018 год было складзена 12 бібліяграфічных спісаў па тэмах, якія планаваліся Мінскім абласным выканаўчым камітэтам. Старадарожская цэнтральная бібліятэка адзін раз у паўгоддзе

складае «Спіс перыядычных выданняў, атрымліваемых бібліятэкай у … годзе», штоквартальна рыхтуе «Спісы літаратуры, якая паступіла ў камерцыйны фонд Старадарожскай цэнтральнай бібліятэкі ў …». Уздзенская цэнтральная бібліятэка у 2018 годзе выдала рэкамендацыйныя спісы «Здоровье — дар бесценный», «Свет незгасальны: літаратура рэлігійнай тэматыкі. 2018». У рамках рэспубліканскай міжведамаснай праграмы «Забота» выдадзены рэкамендацыйны бібліяграфічны спіс літаратуры па арганізацыі вольнага часу дзяцей і падлеткаў «Лепшыя канікулы!». Бібліяграфічнай службай цэнтральнай біліятэкі Бярэзінскага раёна падрыхтаваны інфармацыйна-бібліяграфічныя спісы для педагогаў па экалагічным выхаванні «Любіць радзіму – значыць ахоўваць прыроду», для моладзі – па прававых пытаннях «Маю права ведаць». Значнае месца ў распаўсюджванні інфармацыі аб новай літаратуры займае паказальнік «Бюлетэнь новых паступленняў», які выдаецца бібліятэкамі Мінскай вобласці штоквартальна.

Бібліятэкі працуюць над папаўненнем створанай **БД «Аналітыка».** Да прыкладу, БД «Аналітыка» Барысаўскай цэнтральнай бібліятэкі змяшчае 340861 бібліяграфічны запіс, папоўнілася на 9552 запісы ў параўнанні з 2017 годам. БД Вілейскай цэнтральнай бібліятэкі ўключае 6035 бібліяграфічных запісаў, што на 372 запісы больш, чым у мінулым годзе. База дадзеных «Артыкулы» цэнтральнай бібліятэкі Слуцкага раёна папоўнілася 5842 запісамі і на 01.01.2019 года склала 41399 запісаў. Аналітыка Жодзінскай цэнтральнай бібліятэкі папоўнілася на 1970 пазіцый і зараз мае ў БД 54838 бібліяграфічных запісаў. БД «Аналітыка» Валожынскай цэнтральнай бібліятэкі змяшчае 7395 бібліяграфічных запісаў, папоўнілася на 515 запісаў. На 01.01.2019 г. у БД «Артыкулы» Лагойскай цэнтральнай бібліятэкі – 10606 запісаў (уведзена 632 запісы).

Паспяхова працягваецца праца бібліятэк вобласці ў кансорцыуме "LibКард". За 2018 г. супрацоўнікі Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна распісалі 1613 артыкулаў, супрацоўнікі Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х.Каладзеева –1172 артыкулы.

Падводзячы вынікі, можна зрабіць выснову, што ў бібліятэках Мінскай вобласці бібліяграфічнае абслугоўванне як кірунак дзейнасці захоўвае сваё значэнне. Сучасная сістэма даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання – гэта арганічнае спалучэнне аўтаматызаванага і традыцыйнага бібліяграфічнага пошуку. Пры гэтым электронныя рэсурсы не выцясняюць, а дапаўняюць традыцыйныя формы інфармацыйна-бібліяграфічнага абслугоўвання дзякуючы магчымасцям новых тэхналогій і Інтэрнэт.

## Метадычная дзейнасць

Дзейнасць аддзелаў бібліятэчнага маркетынгу цэнтральных бібліятэк вобласці ў 2018 годзе была накіравана на вывучэнне, распрацоўкуі падтрымку сучасных перадавых напрамкаў у рабоце; павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў; умацаванне сувязей з грамадскасцю; стварэнне пазітыўнага іміджу бібліятэк.

У мінулым годзе бібліятэкі Мінскай вобласці актыўна працавалі над стварэннем і рэалізацыяй праграм вядучых напрамкаў дзейнасці: «Ступені майстэрства» (Любанскі раён); «Ступені майстэрства» (Маладзечанскі раён); «Библиолестница» (Мінскі раён).

На працягу года публічнымі бібліятэкамі Мінскай вобласці вялася работа па стварэнні і рэалізацыі наступных праектаў: міжнародныя праекты «Псковщина – Борисовщина: грани сотрудничества», «Библиотека без границ: интеграция в мировое библиотечное пространство» (Барысаўскі раён); праект павышэння кваліфікацыі «Мастерство – путь к успеху» (Смалявіцкі раён); «Специалист» (цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна).

Узровень прафесійнай падрыхтоўкі работнікаў вызначае якасць і эффектыўнасць дзейнасці бібліятэк. Сістэматычна праводзяцца семінары, практыкумы, нарады, круглыя сталы, дні метадычнай дапамогі і інш. Так, у 2018 годзе былі праведзены семінары: «Информация – библиотекарь – читатель» (Барысаўскі раён); «Бібліятэчны прагрэс
у садружнасці ЦБС» (Бярэзінскі раён); «Дзённік работы: правілы афармлення» (Валожынскі раён); «Бібліятэкар + Чытач: сакрэт эфектыўных узаемаадносін» (Дзяржынскі раён); «Захоўваючы традыцыі, шукаць новае: дзень абмену вопытам» (Капыльскі раён); «Твая бібліятэка – твой стыль: фарміраванне пазітыўнага іміджу бібліятэкі як творчы працэс» (Клецкі раён); «Папулярызацыя чытання ў бібліятэках: дыяпазон ідэй, канцэпцый, практыкі» (Лагойскі раён); «Культурна-асветніцкая дзейнасць: ідэі, практыкі, праекты» (Маладзечанскі раён); «Падвядзенне вынікаў і перспектывы развіцця бібліятэк раёна ў сучасны час» (Мінскі раён); «Роля і месца бібліятэкі ў сучаснай інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы» (Мядзельскі раён); «Сельская бібліятэка – цэнтр адраджэння і развіцця культурнай спадчыны» (Нясвіжскі раён); «Інавацыі ў рабоце бібліятэк» (Пухавіцкі раён); «Состояние и перспективы развития библиотек Солигорского района на 2019 год» (Салігорскі раён); «Майстар-клас як метад перадачы прафесійнага майстэрства» (Стаўбцоўскі раён); «Сучасныя аспекты інфармацыйна-бібліяграфічнай работы сельскай бібліятэкі» (Уздзенскі раён).

Адбыліся круглыя сталы: «Подросток и библиотека: профилактика безнадзорности и правонарушений» (Барысаўскі раён); «Сельскія бібліятэкі: новыя магчымасці, новая якасць абслугоўвання» (Бярэзінскі раён); «Сацыякультурная дзейнасць Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Пранузы» (Капыльскі, Нясвіжскі раёны); «Сучасная бібліятэка – сучаснаму карыстальніку» (Клецкі раён); «Библиотека – открытый мир идей» (Крупскі

раён); «План – аснова дзейнасці бібліятэкі. Планаванне на 2019 год» (Любанскі раён); «Азы прафесіі» (Мінскі раён).

Наладжваліся практыкумы: «Библиотечная выставка: какой ей быть» (Барысаўскі раён); «Стварэнне мультымедыйнай прэзентацыі» (Валожынскі раён); «Прыцягнуць! Здзівіць! Утрымаць! Новая роля бібліятэкі ва ўмовах скарачаемай кніжнай прасторы» (Вілейскі раён); «Медыякультура спецыяліста» (Дзяржынскі раён); «Бібліятэчная дакументацыя, аналіз асноўных дакументаў уліку і справаздачнасці, інструкцый і палажэнняў, рэгламентуючых дзейнасць бібліятэкі» (Клецкі раён); «Буктрэйлер – лепшая рэклама кнігі» (Крупскі раён); «Майстэрства прываблiваць: бібліятэчныя акцыі і інавацыі» (Любанскі раён); «Учёт, отчётность, план деятельности библиотеки» (Мінскі раён); «Бібліятэчна-бібліяграфічная і навукова-інфармацыйная дзейнасць бібліятэк» (Стаўбцоўскі раён); «Организация библиотечного пространства» (цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна).

Сярод іншых форм павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў – кансультацыі і метадычныя парады, школы метадыста і школы дырэктара, метадычныя саветы, канферэнцыі і інш.

Павышэнню прафесійнага майстэрства маладых супрацоўнікаў і супрацоўнікаў без спецыяльнай адукацыі спрыяюць разнастайныя па тэматыцы заняткі, практыкумы, пасяджэнні ў «Школе пачынаючага бібліятэкара», «Школе маладога бібліятэкара», «Школе камп’ютарных ведаў», «Школе маладога спецыяліста», «Альтэрнатыўнай школе бібліятэкара», на «Факультэце бібліятэчных ведаў». Так, у 2018 годзе былі разгледжаны наступныя пытанні: «Бібліятэка і СМІ: радыё, перыядычныя выданні, сайты» (Валожынскі раён); «Бібліятэчная азбука» (Дзяржынскі раён); «Сістэматычнае вывучэнне кніжнага фонду – важнейшая ўмова актывізацыі яго выкарыстання» (Клецкі раён); «Афармленне дакументаў» (Мядзельскі раён); «Праектна-праграмная дзейнасць бібліятэк» (Слуцкі раён);

«Справаздачнасць і планаванне ў сельскай бібліятэцы» (Смалявіцкі раён).

З мэтай вывучэння інфармацыйных запатрабаванняў карыстальнікаў і ўдасканальвання іх абслугоўвання ў бібліятэках вобласці на працягу справаздачнага года праводзіліся сацыялагічныя і маркетынгавыя даследаванні, анкетаванні і апытанні: «Бібліятэка. Погляд моладзі» (Валожынскі раён); бліц-апытанне «Круг чтения библиотекаря» (Крупскі раён); «Ваш досуг» (Мядзельскі раён); «Сельская библиотека – жителям села»(Салігорскі раён); «Якой бы вы хацелі бачыць бібліятэку для свайго дзіцяці?» (Смалявіцкі раён); «Изучение потребностей молодёжи на библиотечные услуги» (цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна).

Пазітыўны ўплыў на стан бібліятэчнай справы ў раёне аказвае выдавецкая дзейнасць. У дапамогу бібліятэкарам складаюцца метадычныя рэкамендацыі, парады і дапаможнікі, сцэнарыі да юбілеяў пісьменнікаў, рэкамендацыйныя спісы літаратуры і г.д. Так, у 2018 годзе былі выдадзены: інфармацыйны зборнік «Бібліятэчны калейдаскоп» (Валожынскі раён); да 85-годдзя з дня нараджэння Ніны Жыбрык «Сцяжынка да жывой вады» (Дзяржынскі раён); буклет да 210-годдзя з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцынкевіча «Дудар беларускі» (Крупскі раён); да 210-годдзя з дня нараджэння В. Дуніна-Марцінкевіча «Я выхаванец Бабруйскага павета…» (Лагойскі раён); да 80-годдзя з дня нараджэння Н. Маеўскай «Светам правіць любоў» (Любанскі раён); да 105-годдзя з дня нараджэння С. Грахоўскага «Кругі беларускай казкі» (Маладзечанскі раён); метадычныя парады «Библиотечные акции как средство продвижения книги и чтения» (Смалявіцкі раён); да 135-годдзя з дня нараджэння Я. Маўра «Капітан на караблі дзіцячай літаратуры» (Старадарожскі раён); да 125-годдзя М. Гарэцкага «І застаўся ты ў нашых душах» (цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна).

Станоўчую ролю ў стымуляванні работы бібліятэк адыгрывае штогодні рэспубліканскі конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры». Прызёрамі XXVI конкурсу сталі: у намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем» – Баярская сельская бібліятэка-дом вольнага часу ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка ім. М. Танка» (трэцяя прэмія); у намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы» – сельская бібліятэка-клуб № 17 в. Вязынка ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка ім. М. Багдановіча» (трэцяя прэмія), заахвочвальная прэмія – Дорская сельская бібліятэка ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка».

Публічныя бібліятэкі Мінскай вобласці актыўна прымалі ўдзел у IV Рэспубліканскім конкурсе «Библиотека – центр духовно-нравственного просвещения и воспитания»: гран-пры – ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева»; намінацыя «духоўна-маральнае выхаванне дзяцей і моладзі» – ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» (трэцяе месца); намінацыя «гісторыя праваслаў’я роднага краю» – ДУ «Дзяржынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (другое месца).

Публічныя бібліятэкі Мінскай вобласці таксама актыўна прымалі ўдзелу рэспубліканскім конкурсе «Лучший публичный центр правовой информации». Намінацыя «Лепшы ПЦПІ на базе цэнтральнай раённай (гарадской) бібліятэкі» – ДУК «Салігорская цэнтральная раённая бібліятэка» (другое месца), ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева» (трэцяе месца); намінацыя «Лепшы ПЦПІ на базе сельскай бібліятэкі» – Лучнікоўская сельская бібліятэка-філіял № 7 ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» (першае месца).

У 2018 годзе былі арганізаваны і праведзены наступныя раённыя конкурсы: конкурс дзіцячай мастацкай творчасці «Все профессии важны, все профессии нужны» (Барысаўскі раён); «Бібліятэка года» (Валожынскі раён); «Бібліятэка для пакалення NEXT» (Вілейскі раён); конкурс

творчых работ «Люблю цябе, зямля бацькоў святая» (Любанскі раён); конкурс на лепшую рэкамендацыю «Книга, которая оставила след в моей душе» (Мядзельскі раён); «Твои таланты, библиотекарь!» (Нясвіжскі раён).

2018 год быў аб’яўлены ў Рэспубліцы Беларусь Годам малой радзімы, таму прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці бібліятэкі абралі інфармацыйна-асветніцкія, культурна-адукацыйныя праграмы, праекты і мерапрыемствы, якія садзейнічаюць адраджэнню нацыянальнай культурна-гістарычнай спадчыны.

**Бібліятэкі Міншчыны ў 2018 годзе: агляд дзейнасці**

**Складальнікі:** Бараxоўская М.В
Вярхоўская К.Д.
Гіль В.М.
Крахмалюк К.І.
Лазарава І.П.
Мельнічак А.А.
Рудзянок І.С.
Філіпчык А.К.

Падпісана да друку: 02.07.2019 г.

Тыраж 3 экз. Заказ № 6

220005 г. Мінск, вул. Гікалы, 4
ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна»